Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Звязда

Год выданьня—XIV
№ 272 (3870)
СУБОТА, 22 лістапада 1930 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем чацьвяргоў

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Москва, Б-ко ВСНХ СССР

За разгорнутае наступленьне па ўсім фронце

Пралетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам сваёй бальшавіцкай партыі, упэўнена ідзе па шляху будаўніцтва сацыялізму. Кожны год прыносіць з сабой пралетарскай дзяржаве ўсё новыя і новыя посьпехі, пакідаючы далёка ззаду пераможаныя труднасьці росту.

Скончаны другі год пяцігодкі ўвойдзе ў гісторыю рэвалюцыйнага змаганьня, як год буйнейшых перамог, дасягнутых на аснове ленінскай лініі партыі, непрымірымага змаганьня з правым і «левым» апартунізмам, рашучага наступленьня на капіталістычныя элементы гораду і вёскі, на аснове невычарпальнай актыўнасьці рабочых мас, якія паказалі яркія прыклады камуністычных мэтадаў працы.

Вялізарнейшыя гаспадарчыя дасягненьні другога году пяцігодкі відаць хаця-б з таго, што па Саюзе прадукцыя усёй планаванай прамысловасьці ўзрасла на 25 проц., а цяжкай—на 40 проц. Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць дасягнулі велізарнай сумы—3 мільярды рублёў, павялічыўшыся за адзін год на 89 проц. Агульная засеўная плошча ўзрасла на 7,4 млн. га, прычым у асноўных збожжавых раёнах лік калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак перавысіў 40 проц. агульнага ліку гаспадарак. Гэтымі раёнамі засеяна 2/3 усяго яравога засеўнага кліну. Фактам вялікага гаспадарча-палітычнага значэньня зьяўляецца ліквідацыя ў Саюзе беспрацоўя.

Па БССР у мінулым годзе агульная прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці павялічылася на 67,5 проц. і дала рост параўнальна з 1927-28 годам на 150 проц., у той час, як пяцігадовым плянам рост за два гады быў запраектаваны на 87 проц. Капітальнае будаўніцтва рэспубліканскай прамысловасьці выканана за мінулы год у размеры 44 млн. руб., замест 38,4 млн. руб., вызначаных пяцігадовым плянам. Колькасьць рабочых у адной толькі рэспубліканскай прамысловасьці ўзрасла больш чым на 14.000 чалавек. Плошча сацыялістычнага сэктару вёскі павялічылася з 3,5 проц. да 18 проц. Гэтыя велізарныя посьпехі нашай рэспублікі зьяўляюцца лепшым доказам правільнасьці ленінскай нацпалітыкі і тэй брацкай дапамогі, якую нашай краіне аказвае Савецкі Саюз.

Баланс другога году пяцігодкі зьяўляецца лепшым довадам правільнасьці генэральнай лініі партыі, лепшым адказам апартуністычным элементам усіх адценьняў. Толькі палітычныя сьляпцы, толькі людзі, якія адарваліся ад мас, згубілі веру ў творчыя здольнасьці рабочае клясы могуць зараз ня бачыць усіх вялікіх дасягненьняў партыі і пралетарыяту, ня бачаць тых вялі... эканамічных і сацыяльных з..., якія гавораць аб тым, што мы ўсту..лі ў пэрыяд сацыялізму.

Посьпехі другога году, дасягнутыя партыяй і рабочай клясай, дазваляюць намеціць яшчэ больш высокія тэмпы разьвіцьця для трэцяга рашаючага году пяцігодкі, для ператварэньня у жыцьцё пастановы XVI партзьезду аб разгорнутым сацыялістычным наступленьні па ўсім фронце.

Кантрольныя лічбы разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год, якія сёньня публікуюцца, зьяўляюцца папярэдняй праграмай змаганьня за максымальны размах нашага разьвіцьця, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Вось асноўныя плянавыя меркаваньні.

Агульная прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці (без пасаб'ядканьня) у цэнах 1926-27 году ўзрастае да 581,9 млн. руб., або на 104 проц. параўнальна з вынікамі, якія чакаюцца ў 1930 годзе. Рост сярэдня-гадавой колькасьці рабочых рэспубліканскай прамысловасьці (без пасаб'ядканьня) прыняты ў 63,6 тыс. чал. ці на 57,8 проц. Капітальнае будаўніцтва па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці вызначана арыентовачна ў суме 109,5 млн. руб. (у цэнах 1930 г.) супроць капітальных укладаньняў у 33,9 млн. руб. у 1929-30 г. Рост прадукцыйнасьці працы запраектаваны на 30,4 проц. Зьніжэньне сабекошту—10 проц. пры абавязковай умове паляпшэньня якасьці прадукцыі. Рост сярэднягадовай зарплаты па прамысловасьці ў грашовым звароце прыняты ў 5,2 проц.

Пастаўлена задача да 1-га студзеня 1932 году ахапіць калектывізацыяй 45 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Агульная засеўная плошча, паводле пляну, вызначана ў 4.083 тыс. га, у тым ліку пад тэхнічнымі культурамі—283.000 га. Ураджайнасьць збожжавых культур павінна павялічыцца ў саўгасах на 12 проц., у калгасах — на 10 проц. і ў індывідуальных гаспадарках—на 8 проц. Кантрольныя лічбы прадугледжваюць павялічэньне стада да вясны 1931 году, параўнальна з 1930 г.: буйной рагатай жывёлы на 26,6 проц., сьвіней—на 50 проц. Агульны кошт мерапрыемстваў па сельскай гаспадарцы прыняты ў суме 238,8 мільёнаў рублёў.

Такавы асноўныя паказальнікі разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР у 1931 годзе. Яны з усёй відавочнасьцю падцьвярджаюць, што рост народнае гаспадаркі, акрэсьлены пяцігодкай, будзе ня толькі поўнасьцю ажыцьцёўлены, але па шмат якіх галінах будзе перавыкананы. Яны нашчэнт разьбіваюць усе «тэорыі» і гістэрычныя крыкі права-«левацкага» блёку аб нерэальнасьці ўзятых партыяй тэмпаў, аб надмерных заданьнях і г. д.

Зразумела, было-б няправільным сьцьвярджаць, што намечаны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі ў 1931 годзе ня будзе зьвязаны з радам труднасьцяй росту. Бясспрэчна, што плянавыя заданьні напружаныя. Зусім ясна, што ажыцьцяўленьне іх магчыма толькі пры поўным намаганьні сіл і энэргіі ўсёй партыі, усяе рабочае клясы, толькі пры ўмове далейшага росту актыўнасьці і творчай ініцыятывы працоўных мас, пры нясупыннай барацьбе за далейшае разгортваньне бальшавіцкіх тэмпаў. АСАБЛІВЫХ НАМАГАНЬНЯЎ ПАТРАБУЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ, ПА ЯКІХ МЫ МАЕМ НЕДАВЫКАНАНЬНЕ Ў 1930 ГОДЗЕ.

Але гэтыя труднасьці не паменшаць цьвёрдай волі пралетарыяту будаваць, пад кіраўніцтвам партыі, сацыялізм, наадварот, яны ўзмоцняць яго рашучасьць у барацьбе за кожны процант выкананьня пляну.

Бязьлітасна зьмятаючы са свайго шляху ўсе перашкоды, даючы руйнуючы адпор усім праяўленьням апартунізму, разьбіваючы спробы шкоднікаў і інтэрвэнтаў сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, мы няўхільна будзем ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі на індустрыялізацыю краіны, на ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

План вялікіх работ трэцяга году будзе поўнасьцю рэалізаваны.

Пяцігодка будзе выканана за чатыры гады!

Прамфінплян асобнага кварталу—аснова

баявых тэмпаў рашаючага году пяцігодкі

Грунтам для пасьпяховага выкананьня адказьнейшых плянаў 1931 году зьяўляецца поўнае выкананьне плянаў асобнага кварталу кастрычнік-сьнежань. Ад разьвіцьця і дасягненьня патрэбных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва ў гэтым квартале залежыць пераход і ажыцьцяўленьне высокіх, напружаных, але поўнасьцю магчымых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва рашаючага году пяцігодкі—1931 г.

Аднак, папярэднія вынікі выкананьня пляну асобнага кварталу за кастрычнік сьведчаць аб нездавальняючым становішчы на адказнейшым вучастку народнае гаспадаркі БССР—у прамысловасьці. Пераважная большасьць прадпрыемстваў рэспубліканскай прамысловасьці БССР ня выканала кастрычніцкага пляну. Асабліва нездавальняючае становішча ў запалкавай, лесапільнай, фанэрнай, фасфарытнай, мэталяапрацоўчай прамысловасьці, якія найбольш ганебна адстаюць у выкананьні прамфінпляну. Такое становішча зьяўляецца абсалютна недапушчальным, ганебным для прадпрыемстваў, якія адстаюць, цягнуцца ў хвасьце, тым больш, што плян зьяўляецца цалкам магчымым для выкананьня і перавыкананьня. Аб гэтым сьведчыць тое, што ёсьць прадпрыемствы, якія поўнасьцю выконваюць свой плян.

Як сьведчаць факты, асноўнай прычынай невыкананьня прамфінпляну за кастрычнік месяц зьяўляецца тое, што гаспадарчыя, прафсаюзныя і партыйныя органы на прадпрыемствах слаба мабілізавалі ўвагу рабочых мас на выкананьне пляну асобнага кварталу, не замацавалі посьпехаў у сацыялістычным спаборніцтве і давядзеньні яго да вышэйшых форм, дасягнутых у верасьні месяцы ў сувязі з адозвай ЦК УсеКП(б).

Разам з тым з боку гаспадарчых органаў не заўсёды праяўлена патрэбная энэргічная барацьба з арганізацыйна-тэхнічнымі непаладкамі, якія маюць месца на прадпрыемствах.

Неабходна зараз-жа, ня трацячы часу, узяцца па-бальшавіцку, з усёй упартасьцю і энэргіяй за ліквідацыю прарываў, за выкананьне поўнасьцю пляну ўдарнага кварталу.

Гаспадарчыя, прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў павінны безадкладна прыняць рашучыя захады да мабілізацыі мас на справу ліквідацыі прарываў і поўнае выкананьне прамфінпляну шляхам усё большага разгортваньня вышэйшых форм спаборніцтва. Неабходна з боку аб'яднаньняў узмацніць жывое кіраўніцтва прадпрыемствамі, трэба павесьці рашучую барацьбу за зьнішчэньне арганізацыйна-тэхнічных непаладак, супроць упалу тэхнічнага нагляду, тэхнічнага кіраўніцтва на паасобных прадпрыемствах.

Неабходна, каб партыйныя арганізацыі, гарадзкія і раённыя камітэты КП(б)Б, кантрольныя камісіі, выезныя брыгады ВСНГ і прафсаюзаў безадкладна арганізавалі праверку мерапрыемстваў па выкананьні прамфінпляну і дапамаглі адстаючым прадпрыемствам, мабілізаваўшы на гэту справу ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі, усёй рабочай масы.

З усёй рашучасьцю трэба асудзіць кампанейскі падыход да ажыцьцяўленьня адозвы ЦК УсеКП(б) ад 3-IX г. г., што мела месца на паасобных прадпрыемствах. Адозва ЦК УсеКП(б) зьяўляецца важнейшым партыйным дакументам, які дае ня толькі мэтады працы парт., праф. і гаспадарчых арганізацый для ліквідацыі прарываў мінулага году, але разам з тым, дае мэтады працы па выкананьні прамфінпляну бягучага кварталу і пляну наступнага году.

Рэарганізацыя кіраўніцтва прамысловасьцю, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, укараненьне новых мэтадаў сапраўднае камуністычнае працы, давядзеньне пляну да цэху, брыгады, варштату, распрацоўка сустрэчнага прамфінпляну — асабліва падкрэсьліваюць значэньне цэху, як аднэй з важнейшых частак сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю. Таму павінна быць зьвернута вялікая ўвага на ўзмацненьне гаспадарчага, партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва ў цэху. Роля начальніка цэху, майстра, цэхавай партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі пры новых умовах цэхавай працы значна ўзрастае, гэта патрэбна своечасова ўявіць.

Нарэшце, трэба адзначыць, што праца па забесьпячэньні, плянаваньне сыр'я і матар'ялу ў радзе выпадкаў пастаўлена нездавальняюча. Аб гэтым сьведчаць перабоі ў забесьпячэньні сыр'ём абутковай прамысловасьці, мэталёвай, часткова шкляной і інш. Гэтыя хібы павінны быць рашуча выпраўлены. З боку транспарту, некаторых транспартных арганізацый таксама выяўляюцца прарывы, якія зьяўляюцца абсалютна недапушчальнымі ў абслугоўваньні выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу.

Важнейшы плян — плян асобнага кварталу, грунт выкананьня пляну рашаючага трэцяга году пяцігодкі — павінен быць цалкам выкананы.

Мабілізуючы ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі, усёй рабочай масы, павышаючы тэмпы сацыялістычнага спаборніцтва, узначальваючы ўсё ўзрастаючы энтузіязм рабочых, мы адолеем дабіцца пералому і поўнага выкананьня прамфінпляну, пераможам на гэтым адказьнейшым вучастку клясавай барацьбы.

У. СТРАКОЎСКІ.

Неадкладна падаць ацэпленыя вагоны пад бульбу

Злачынна-нядбайныя адносіны чыгункі да адгрузкі пагражаюць псаваньнем тысяч тон бульбы

Ня гледзячы на ўсе запэўненьні ўпаўнаважанага НКШЗ т. ЛЕДНІКА ў тым, што ня будзе перабояў у адносінах своечасовай падачы вагонаў пад бульбу, з месц паступаюць скаргі на нядбайныя, злачынныя адносіны чыгункі да падачы вагонаў.

Чыгуначная адміністрацыя зусім ня лічыцца з тым, што маразы пагражаюць псаваньнем бульбы, што патрэбна хуткая бесьперабойная падача вагонаў, каб захаваць тысячы тон каштоўнай гароднiны.

Са СТАРОБІНА тэлеграфуюць, што чыгунка не дае цяплушак.

З РАСОН пішуць, што адгрузка затрымліваецца з-за недахвату вагонаў. У сувязі з несвоечасовай падачай вагонаў адгрузка спазьняецца на 12-15 гадзін.

У БОРКАВІЧАХ з заказаных 19 вагонаў ня дана ні аднаго. Прыходзіцца заружаць пакгаузы. Так-ж малюнак і ў РАСНАХ.

З МСЬЦІСЛАЎЛЯ тэлеграфуюць, што станцыя Ходасы не падае вагонаў.

Зрываюць адгрузку станцыі ПЦІЧ, ДУБРОЎНА, КОПЫСЬ і г. д.

З Барэзінскага раёну скардзяцца, што параходства адмаўляе ў дачы баржаў.

З ШУМІЛІНА паведамляюць, што, ня гледзячы на своечасовыя заяўкі, станцыя вагонаў не дала.

НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА ДАПУСЬЦІЦЬ ДАЛЕЙШАГА ІГНАРАВАНЬНЯ ЧЫГУНКАЙ ВАЖНЕЙШАГА БАЯВОГА ЗАДАНЬНЯ!

Чыгуначныя бюракраты, якія зрываюць адгрузку бульбы пралетарскім цэнтрам, якія сваімі злачыннымі адносінамі да пагрузкі ставяць пад пагрозу тысячы тон бульбы, павінны быць сурова пакараны.

Патрэбна тэрміновая ўмяшальнасьць судова - сьледчых органаў.

83,5 проц. пляну

За 20 лістапада адгружана 7.671 тона бульбы. З пачатку кампаніі адгружана 151.068 тон, што складае 83,5 проц. пляну адгрузкі.

На 20 лістапада Ленінграду адгружана 89,9 проц., ЛВО—91,7, Севзапсаюзу—77,7, Маскве—86,7 проц., Данбасу—71,9 проц. і Паўночнаму Каўказу—28,1 проц. заданьня.

Задача ўсіх арганізацый — намагчы ўсе сілы, каб поўнасьцю выканаць плян адгрузкі.

***

Учора ўсім начальнікам раёнаў чыгункі накіравана тэлеграма наступнага зьместу:

— З наступленьнем марозаў падача паражняку пад пагрузку бульбы злачынна пагоршылася. Зварачаем вашу ўвагу на неабходнасьць своечасовай і поўнай падачы паражняку і цяплушак.

Паводле пастановы ўрадавай камісіі БССР, несвоечасовая падача паражняку будзе разглядацца, як злачынства. Вынесена пастанова аб аддачы пад суд з узяцьцем пад варту тых начальнікаў, якія ня прынялі належных мер да своечасовай падачы паражняку.

Упаўнаважаны НКЗШ ЛЕДНІК.

Адгрузка гароднiны ідзе нездавальняюча

20 і 21 лістапада адбыліся пасяджэньні дзяржаўнай чацьвёркі, на якіх былі заслуханы даклады аб ходзе загатовак і адгрузкі бульбы і гароднiны.

Чацьвёрка адзначыла недапушчальна слабую адгрузку і загатоўку гароднiны. Побач з узмацненьнем адгрузак бульбы, для хутчэйшага і поўнага выкананьня пляну, чацьвёрка прапанавала раёнам зьвярнуць асаблівую ўвагу на фарсаваньне адгрузкі гароднiны.

На пасяджэньні высьветлілася, што садсаюз да сёнешняга дня не адгрузіў ні аднаго вагона гароднiны ў Маскву.

З прычыны перагляду плянаў, цэнтрам скасавана адгрузка бульбы з Беларусі ў Данбас. Чацьвёрка пастанавіла спыніць адгрузку бульбы ў Данбас з тым, каб адгружаныя вагоны былі пераадрасаваны на Ленінград і Маскву.

Раёны, якія выканалі нарады на адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам, не павінны спыняць загатовак, у асноўным, загатоўленую бульбу трэба накіроўваць на бровары і на забесьпячэньне гарадоў БССР.

Асаблівая ўвага зьвернута чацьвёркай на прыняцьце мер па захаваньні бульбы ад марозаў.

Упаўнаважанаму НКЗШ т. Ледніку прапанавана прыняць спэцыяльныя меры для ліквідацыі перабояў у падачы вагонаў пад пагрузку.

Крывавыя пагромы у Зах. Беларусі

Начныя налёты паліцыі на вёскі

ШАЛЁНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ПІЛСУДЧЫНЫ ДА НАПАДУ НА СССР

ГОРАДНЯ, 18 лістапада. Буржуазія, памешчыкі і ўся фашысцкія акупанты ў жаху галосяць аб падпалах дзяржаўных складаў, абшарніцкіх маёнткаў, забойствах паліцэйскіх, нулцоў і буржуяў, аб тэроры нібы з боку беларускіх працоўных мас. Яны з пенай клясавай ненавісьці накідваюцца на масавыя рабоча - сялянскія арганізацыі, разграмляюць і руйнуюць іх і АСАБЛІВА ЖОРСТКА РАСПРАЎЛЯЮЦЦА З КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫЯЙ, як правадыром у надыходзячай пралетарскай рэвалюцыі. Для гэтага пускаюцца ў ход усе сродкі, каб сфабрыкаваць вестні аб выкрыцьці «складаў зброі» і г. д.

Выступленьні рабочых і працоўных сялян супроць буржуазіі, памешчыкаў і фашысцкай акупацыі, за абарону СССР, усе фашысцкія газэты стараюцца ўсімі мэтадамі і мерамі зпляваць у вачох працоўных мас, яшчэ ня ўцягнутых у актыўную рэвалюцыйную барацьбу.

Фашысцкая прэса патрабуе ад фашысцкага дзяржаўнага апарату «стакоўча і рашуча рэагаваць на такога роду выступленьні», лічачы, што адносна карных экспэдыцый на Зах. Беларусі ўжо існуе зусім выразны і дакладны загад ураду.

Жудасны тэрор шалее па вёсках і мястэчках Горадзенскай акругі. Напрыклад, сяляне БЕРАСТАВІЦКАГА РАЁНУ вельмі дорага плацяць за тое, што яны актыўна не дапушчаюць да ліцытацыі апошняй каровы і апошняй падушкі беднага селяніна. Яшчэ ніхто з сялян не забыў, як фашысцкая паліцыя пабіла жанчын з ВЁСКІ ДУБЛЯНЫ за тое, што яны не дапусьцілі сэквэстратараў. Паліцыя выкарыстала момант, калі мужчыны выйшлі з вёскі і паехалі ў поле працаваць, напала зноў на вёску з цэлым атрадам і, б'ючы іх, грабіла працоўнае сялянства. Так выглядае «міласьцівае» панаваньне фашысцкай дыктатуры на Зах. Беларусі. За рэвалюцыйныя выступленьні гэтымі днямі паліцыя цэлымі бандамі разам з жандарамі і шпікамі дэфэнзывы, якія сабраны з розных мястэчак і вёсак у паасобныя атрады, робіць усё больш частыя напады на сонную вёску ноччу, выцягвае з хаты селяніна, і б'е яго сьмертным боем.

Па ўсіх дарогах і іх перакрыжаваньнях пастаўлены паліцэйскія пасты, якія затрымліваюць, робяць вобыскі ў праяжджаючых і праходзячых сялян, а таксама і арыштоўваюць. Уся акруга падзелена на пункты наблюдзэньня. На кожныя 2 кілёмэтры пастаўлены разьведачныя маякі ці пункты для наблюдзэньня ў 20 мэтр. вышыні. Гэтыя пункты абслугоўваюцца ў большасьці сваёй салдатамі. У поўных месцах па шасэйных дарогах спыняюцца аўтобусы, робяцца вобыскі і арышты «падазроных асоб».

Усе гэтыя мерапрыемствы жорсткага тэрору фашысцкіх акупантаў над рабочымі і сялянамі Зах. Беларусі маюць на мэце ЗАДУШЫЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ, які ўсё больш узмацняецца і пашыраецца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пад яе лёзунгамі: «НІ КАПЕЙКІ ПАДАТКАЎ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ — ДЫКТАТУРЫ ГОЛАДУ, ГАЛЕЧЫ, ВЫМІРАНЬНЯ, БЕСПРАЦОЎЯ, ТЭРОРУ І ВАЙНЫ! ЗА РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ВЫРАШЭНЬНЕ ГАСПАДАРЧАГА КРЫЗІСУ»!

Перад гіганцкімі клясавымі баямі ў Руры

РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ПРАФАПАЗЫЦЫЯ МАБІЛІЗУЕ ГАРНЯКОЎ ДА БАРАЦЬБЫ

АДЗІНЫ ФРОНТ АД ФАШЫСТЫХ ДА САЦ. - ФАШЫСТЫХ УКЛЮЧНА.

БЭРЛІН, 21. Саюз капальняўласьнікаў Рурскай вобласьці пастанавіў прыняць трацейскую пастанову, якая захоўвае 8-мігадзінны рабочы дзень. Рэфармісцкія прафсаюзныя лідэры пастанавілі зьвярнуцца да міністра працы з просьбай устрымацца ад абвяшчэньня трацейскае пастановы абавязковай. Толькі рэвалюцыйная прафапазыцыя мабілізуе гарнякоў да надыходзячай барацьбы. У капальнях абрана 55 камітэтаў па падрыхтоўцы барацьбы. Адбылося 8 канфэрэнцый рэвалюцыйнай прафапазыцыі, на якіх прысутнічала звыш тысячы дэлегатаў ад капальняў.

У гаспадарчай камісіі рэйхстагу тав. Торглер унёс ад імя камфракцыі прапанову не абвяшчаць абавязковай трацейскую пастанову адносна рабочага часу ў Рурскай горнай прамысловасьці. Адзіны фронт буржуазных партый, ад нацыянал - сацыялістых да сацыял-фашыстых уключна, адхіліў гэту прапанову і пастанавіў не абмяркоўваць пытаньня аб трацейскай пастанове. (ТАСС).

Чырвоная армія акружае Чаншу

ШАНХАЙ, 19. Як падае агенцтва Рэйтэр з Ханькоу, чырвонае войска за апошні тыдзень дабілася значных посьпехаў у правінцыі Хунань і наступова акружае Чаншу (сталіца Хунані). Буржуазнае насельніцтва эвакуіруецца з Чаншы. Ханькоўскія гандлёвыя фірмы спынілі адпраўку тавараў у Хунань. Паводле апошніх заяваў другу, барацьба з часьцямі Чырвонай арміі надзвычай цяжкая, бо пры набліжэньні ўрадавых войск камуністычнае войска падзяляецца на дробныя групы, і такім чынам урадавае войска ня можа іх акружыць.

Імпэрыялістыя пралічацца

У адказ арганізатарам інтэрвэнцыі яшчэ больш напружым свае сілы для змаганьня за пяцігодку за 4 гады

АДПУ--ОРДЭН ЛЕНІНА

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі дзяржаўнай гарбарні «Бальшавік» з вялізарнейшым абурэньнем клеймяць злачынную дзейнасьць групы шкоднікаў, шпіёнаў і здраднікаў з прамысловай партыі, якія сыстэматычна рыхтуюць крывавую расправу над працоўнымі Савецкага Саюзу з дапамогай імпэрыялістых.

Калектыў ІТР дзяржаўнай гарбарні «Бальшавік» патрабуе вышэйшай меры пакараньня — расстрэлу контр-рэвалюцыянэраў, якія імкнуцца затрымаць пераможны ход сацыялізму.

У адказ на пагрозу новай узброенай інтэрвэнцыі, у адказ на шкодніцкую работу контр-рэвалюцыянэраў, мы ІТР чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік» з яшчэ большай энэргіяй будзем змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за выкананьне і перавыкананьне заданьня на ўдарны квартал, за разгортваньне сацыялістычнага наступленьня. Мы абяцаем ленінскай партыі ўзмацніць удзел у рабоце ўдарных брыгад, па-бальшавіцку падрыхтавацца да ўступленьня ў трэці рашаючы год пяцігодкі.

Просім урад аб узнагародзе вернага вартаўніка кастрычніцкіх заваяваньняў — АДПУ ордэнам Леніна.

Ня можа быць літасьці служкам міжнароднага капіталу

Агульны сход супрацоўнікаў Белхэмпрому з пагардай клеймяць здраднікаў рабочае клясы.

Шматлікія факты выкрыцьця шкодніцтва павінны прымусіць кожнага спэцыялістага акрэсьліць сваё месца ў клясавым змаганьні. Нэйтральнасьць і «балота» сярод спэцыялістых павінны быць ліквідаваны, бо на дадзеным этапе гэта ёсьць шкодніцтва.

У адказ на шкодніцкія ўдары адказам пасканэньнем падрыхтоўкі новых кадраў, вылучаных з рабочае клясы, і згуртаваньнем усіх сіл вакол генэральнае лініі партыі.

Мы патрабуем самай суровай кары шкоднікам — служкам міжнароднага капіталу, якія паднялі руку на дыктатуру пралетарыяту.

Акрамя гэтага, рэзалюцыі пратэсту супроць шкодніцкай работы агентаў міжнароднага імпэрыялізму атрыманы ад агульнага сходу рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу фабрыкі «Камунарка», ад рабочых малога рамонту вагонаў і Электрасеці ст. Менск Пас. МББ чыгункі, ад рабочых і работніц фабрыкі «Беларуска», ад служачых шляху Менск таварная і пасажырская, ад агульнага сходу супрацоўнікаў Інстытуту Аховы Працы і г. д.

Рэзалюцыі паступаюць у рэдакцыю бязупынна.

На мітынгу супрацоўнікаў Дзяржпляну БССР

Мітынг супрацоўнікаў калектыву Дзяржпляну БССР, заслухаўшы даклад аб шкодніцтве ў плянавых органах, аб падрыўной контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці групы буржуазнай інтэлігенцыі па заданьні генэральных штабаў раду капіталістычных краін, з абурэньнем канстатуе, што частка інтэлігенцыі не толькі не апраўдала давер'я рабочае клясы і савецкай улады, але, будучы на камандных вышынях гаспадарчага будаўніцтва, надрывала і тармазіла разьвіцьцё першай у сьвеце пралетарскай краіны, падрыхтоўваючы зьвяржэньне дыктатуры пралетарыяту.

Няма такой агіднасьці, перад якой-бы спынілася буржуазія і яе прыхільнікі для таго, каб задушыць краіну саветаў. Урокі шкодніцтва з выключнай выразнасьцю сьведчаць чым рупарам зьяўляюцца правыя апартуністыя, усе тыя, хто апалчаецца на генэральную лінію партыі.

Калектыў патрабуе самай суровай кары ворагам рабочае клясы. Спэцыялістыя Дзяржпляну і іншых кіруючых органаў павінны сказаць, што ня можа быць нэйтральнасьці ў рабоце. Мала прысяг вернасьці справе сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба на справе давесьці, што кожны працуючы ў плянавым апараце садзейнічае ўмацаваньню дыктатуры пралетарыяту і пабудове сацыялізму ў нашай краіне.

Шкоднікам, якія адважыліся стаць на шлях здрадніцтва, можа быць дан толькі адзін адказ — у пашпарце на жыцьцё адмовіць. Сьмерць здраднікам!

Калектыў Дзяржпляну БССР у адказ на выступленьне клясавага ворага абяцае ўзмацніць падрыхтоўку і вылучэньне на кіруючую работу маладых пралетарскіх спэцыялістых, узмацніць тэмпы выкананьня пяцігодкі шляхам дадатковай падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

Калектыў Дзяржпляну просіць вышэйшыя органы аб узнагародзе ДПУ ордэнам Чырвонага Сьцягу.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК!

Тут-жа на мітынгу па выкліку рабочага-вылучэнца тав. Чэртка быў праведзены запіс на дадатковую падпіску на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады». Падпіска дала 445 руб. Яна будзе далей праводзіцца праз насьценгазэту «Дзяржплянавец».

У адказ на шкодніцтва—лепшыя рабочыя ідуць у партыю

Рабочыя шчотачнай фабрыкі патрабуюць ад Вярхоўнага суда СССР для шкоднікаў вышэйшай меры пакараньня.

Справа шкодніцкай арганізацыі з яшчэ большай сілай падкрэсьлівае неабходнасьць бязьлітаснай барацьбы з правымі і «левымі» ўхілістымі і з іх падпявааламі.

Рабочыя абавязваюцца выканаць свой прамфінплян ударнага кварталу з перавышэньнем па ўсіх паказальніках, абвясьціўшы яшчэ больш жорсткую барацьбу прагульшчыкам, лятуном і дэзэртырам працы.

У адказ на вылазкі права-«левацкага» блёку, рабочыя збліжаюць яшчэ шчыльней згуртавацца вакол камуністычнае партыі і яе ленінскага ЦК. Лепшыя рабочыя: Фінкель— 35 гадовы рабочы стаж, Віват — 33-гадовы стаж, Штаер — 18-гадовы, Жураўлёў — 12 гадовы і іншыя ўступілі ў партыю Леніна; Ермалаева, Квачова, Лятоўская, Новікава, Бэйлінсон, Фэйгінсон уступілі ва ўдарныя брыгады.

КОШТАМ ПРАЦОЎНЫХ МАС

БЭРЛІН, 21. З апублікаванага бюджэту Прусіі на 1931 год ясна відаць, што на скарачэньні выдаткаў мяркуецца з'эканоміць 384 млн. марак. Гэта «эканомія» дасягнута выключна за лік працоўных. Адно толькі скарачэньне аклядаў служачым павінна даць 170 млн. марак эканоміі. Наадварот, падатак на зямельную уласнасьць, па ўгоду буйным аграрыям, зьніжаны на 10 проц.

52 ТЫСЯЧЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ ЗА АДЗІН ТЫДЗЕНЬ

РЫМ, 16. Паводле афіцыйных дадзеных нацыянальнай касы сацыяльнае забясьпекі на 1 лістапада ў Італіі лічылася 446.496 беспрацоўных (327.396 мужчын і 119.100 жанчын), гэта значыць на 51.866 больш, чым на 1 кастрычніка. Усяго беспрацоўных у Італіі разам з незарэгістраванымі ня менш 1 млн. чалавек.

Па СССР

69 новых збожжавых саўгасаў

МАСКВА, 21. «Зернотрэстам» за апошні пэрыяд арганізавана ў Сібіры, Казакстане, Сярэдняй Волзе і на Урале 69 новых збожжавых саўгасаў з агульнай зямельнай плошчай у 4.482.000 гект. Новымі саўгасамі будзе ўзорана пад ураджай 1931 г. да 2½ млн. гект., азімых будзе засеяна каля 600.000 гект.

Перадача самалётаў Чырвонай арміі

МАСКВА, 21. Сёньня, 22 лістапада аднachасова ў 9 гарадох СССР— Маскве, Ленінградзе, Харкаве і інш. гарадох Асоавіяхім перадае Чырвонай арміі 87 самалётаў, пабудаваных на сродкі працоўных. Масква перадае 21 самалёт, Ленінград—10, астатнія гарады — ад 6 да 10 самалётаў кожны. Канфэрэнцыя Асоавіяхіму заводу «Красный Треугольнік» абрала тав. Варашылава ганаровым старшынёй заводзкага камітэту Асоавіяхіму.

Буйнейшая ў сьвеце навучальная ўстанова

МАСКВА, 21. У канцы 1931 году ў строй уступае Магнітагорскі завод. На заводзе будзе працаваць больш як 20.000 чалавек. Таму праблема кваліфікаваных кадраў для гэтага заводу мае выключнае значэньне. Інстытут прамысловых кадраў ВСНГ СССР распрацаваў праект вучэбнага камбінату для магнітагорскага заводу. Камбінат будзе буйнейшай у сьвеце навучальнай установай. Асноўная работа камбінату — навучаньне, якое поўнасьцю зьвязана з вытворчасьцю. Вучні апошніх двух груп сямігодкі павінны будуць ужо працаваць на вытворчасьці. На базе фабрычна - заводзкай сямігодкі будзе пабудаваны ФЗВ з 3-х гадовым тэрмінам навучаньня. Наступным этапам навучаньня зьявіцца 2-хгадовая школа майстроў са строгай спэцыялізацыяй. Інжынэры будуць падрыхтоўвацца ва ВТНУ мэталюргічнае вытворчасьці па адпаведных факультэтах.

Усесаюзная дэкада па зборы мэталёвага лому

МАСКВА. У другім годзе пяцігодкі недавыпрацавана 500.000 тон мэталю. Гэта стварае значныя затрудненьні ў галіне забесьпячэньня краіны мэталям. У мэтах хутчэйшай ліквідацыі прарыву УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ абвяшчаюць з 25 лістапада па 5 сьнежня ўсесаюзную дэкаду па зборы мэталёвага лому і адсылцы яго мэталюргічным заводам. Задача ўсесаюзнай дэкады па зборы лому — ачыстка заводзкіх двароў, палаў і чыгуначных дарог ад мэталёвага лому.

За строгую эканомію дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў

МАСКВА. Прэзыдыум ВСНГ СССР зноў катэгарычна абавязаў гаспадарчыя органы захоўваць прыкладную эканомію дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў. Галоўнай інспэкцыі ВСНГ СССР даручаецца, у выпадку парушэньня пастановы аб эканоміі будаўнічых матар'ялаў, перадаваць справы ў пракуратуру для прыцягненьня вінаватых да крымінальнай адказнасьці.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 21 лістапада 1930 г.

аб выступленьні паасобных газэт у адносінах да заявы т. Бухарына

МАСКВА, 21. 1) Прызнаць апублікаваную ў «Праўде» (20 лістапада) заяву тав. Бухарына ў асноўным здавальняючай.

2) Радакцыйны артыкул «Двурушніцтва і палітыка далёкага прыцэлу» у газэце «За Индустриализацию» (21 лістапада), дзе заява тав. Бухарына з прызнаньнем сваіх права - ўхілісцкіх памылак кваліфікуецца, як «акт двурушніцтва», а таксама артыкул у «Труде» (21 лістапада) «Заява Бухарына», дзе даецца ў асноўным такая-ж ацэнка заявы тав. Бухарына, лічыць яўна няправільнымі і, як адбіваючыя антыпартыйныя «левацкія» настроі.

3) Абвясьціць адказнаму рэдактару газэты «За Индустриализацию» Богушэўскаму і адказнаму рэдактару газэты «Труд» Аболіну строгую вымову за зьмяшчэньне паказаных у 2 пункце гэтае пастановы рэдакцыйных артыкулаў.

Крычаўскі цэмэнты гігант павінен быць пушчаны ў тэрмін

Белкаапсаюз зрывае забесьпячэньне рабочых будаўніцтва

„Зьвязда" бярэ шэфства над пабудовай заводу

Чырвоны сьцяг, атрыманы першым агрэгатам швейнай фабрыкі «Кастрычнік» за лепшую работу.

Нядаўна «Зьвязда» сыгналізавала аб радзе недахопаў, якія зрываюць сканчэньне будаўніцтва Крычаўскага цэмэнтнага заводу. І гэта ў той час, калі крычаўскі завод павінен адыграць рашаючую ролю ў справе разгортваньня капітальнага будаўніцтва, пачынаючы з вясны 1931 г.

Мы падкрэсьлівалі, што асабліва вузкім месцам на будаўніцтве зьяўляецца нікуды няварта работа кааперацыі, якая, літаральна, зрывае забесьпячэньне рабочых прадметамі першай неабходнасьці. За час з першага сыгналу «Зьвязды» і па сёнешні дзень становішча не зьмянілася, ня гледзячы на простую катэгарычную дырэктыву ЦК КП(б)Б, даную яшчэ 26-X т. Хаскіну.

Мы ўпэўнены, што т. Хаскін перадаў дырэктыву ЦК апарату Белкаапсаюзу. Але факт застаецца фактам. Дырэктыва ЦК ня выканана. Гэта сьведчыць аб недапушчальных адносінах кіраўнічых работнікаў БКС да пастаноў ЦК і аб недаацэнцы імі вялізарнага значэньня крычаўскага будаўніцтва. На працягу двух дзён рабочыя Крычава павінны быць забясьпечаны ўсім неабходным. Дырэктыва ЦК павінна быць выканана дакладна ў тэрмін. Цэмэнтны гігант павінен запрацаваць і запрацуе з вясны 1931 г.

«Зьвязда» бярэ шэфства над крычаўскім будаўніцтвам і будзе сачыць як Белкаапсаюз і іншыя арганізацыі выконваюць свае абавязкі ў адносінах крычаўскага будаўніцтва.

Барацьба за прамфінплян ударнага кварталу, падрыхтоўка да 3-га году пяцігодкі—важнейшая задача вытворчай парт'ячэйкі

Гнаць з бальшавіцкіх радоў двурушнікаў, здраднікаў партыі, дапаможнікаў капіталістычных рэстаўратараў

За бальшавіцкую пільнасьць і непрымірымасьць у змаганьні супроць правых і „левых“ апартуністых

Агонь па кулацкай агентуры

Гомельская партарганізацыя дала бязьлітасны бой вылазкам апартуністых з права-„лявацкага“ лягеру

Права-«лявацкія» вылазкі ў Гомельскай арганізацыі *) зьяўляюцца адрыжкай агульнай актывізацыі правых і «левых» апартуністых у змаганьні супроць генэральнай лініі партыі. «Зьвязда» некалькі дзён таму назад падкрэсьліла, што вылазкі апартуністых у Гомельскай арганізацыі мелі месца іменна ў сувязі з вылазкамі Руціных, Каўрайскіх, Сьлянковых і інш.—здраднікаў партыі, іменна ў сувязі з наяўнасьцю выкрытага партыяй права-«лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзэ. Кулацкія агенты, што зрабілі адкрытую вылазку на кустаўым сходзе ў Гомельскай арганізацыі, усе гэтыя **Трэйбухі, Шэйманы, Кукуявіцкія і Пераплётчыкавы,** паўтарылі ў сваіх выступленьнях хлусьліва-агідныя паклёпы на партыю, тыя паклёпы, якія выходзілі з боку правых апартуністых і контр-рэвалюцыйнага трацкізму. У сваіх, па сутнасьці, анты-савецкіх выступленьнях агенты варожае клясы—Трэйбух, Шэйман, Кукуявіцкі і Пераплётчыкаў установкі і тэорыі, ад начатку да канца прасякнутыя масьнавізмам, выказаныя ў свой час лідэрамі правых апартуністых, давялі да лёгічнага канца. Яны адкрыта патрабавалі аслабіць забесьпячэньне Чырвонай арміі і г. д.

У чыіх інтарэсах гэта патрабаваньне? Аб аслабленьні Чырвонай арміі марыць усе сацыяльна-варожыя элемэнты як унутры краіны, так і сілы імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі.

XVI зьезд УсеКП(б) сказаў: «Лінія правых ухілістых вядзе да капітуляцыі перад кулацка-капіталістычнымі элемэнтамі краіны. Ажыцьцяўленьне лініі правых ухілістых, якія зьяўляюцца аб'ектыўна агентурай кулацтва, азначала-б зрыў будаўніцтва сацыялізму і аднаўленьне капіталізму ў нашай краіне».

Усякі, хто становіцца на пункт гледжаньня апартуністых, хто абараняе іх лінію, якімі-б «левымі» фразамі ён не прыкрываўся, скочваецца ў лягер сацыяльна-варожых сіл, становіцца рупарам кандраценўска-рамзінскай контр-рэвалюцыі. Іменна да гэтага ў сваіх выступленьнях дакаціліся апартуністыя з Гомельскай арганізацыі, якія, узвадзячы паклёпы на Чырвоную армію, патрабавалі аслабіць яе баявую моц, аслабіць абароназдольнасьць краіны.

На вялікі жаль, пэўная частка партыйцаў, прысутных на кустаўым сходзе, не зразумелі гэтай анты-савецкай сутнасьці выступленьняў правых і «левых» апартуністых і **не далі правільнай палітычнай ацэнкі і бязьлітаснага адпору кулацкай агентуры.** Бюро Гомельскага гаркому зусім правільна падкрэсьліла ў сваёй рэзалюцыі, што **«у вогуле правільная пастанова, прынятая сходам, не дала вычарпальнай палітычнай ацэнкі** права-«лявацкай» вылазцы і прымірэнцтву да яе». Выступаўшыя на сходзе т. т. ня ўдарылі па вылазках апартуністых, не далі поўнай палітычнай ацэнкі гэтым вылазкам. **Наадварот,** некаторыя з выступаўшых таварышоў сваімі блытанымі да бязглуздзіцы прамовамі дэзарыентавалі сход, адводзілі ўдары сходу па кулацкай агентуры. Такім было выступленьне тав. **Кухарэнкі,** які, між іншым, працуе загадчыкам аднае з сямігодак Гомелю. Тав. Кухарэнка ў сваім выступленьні кваліфікаваў адкрытыя вылазкі кулацкай агентуры, як анархізм і, у дадатак да гэтага, праводзіў бязглуздыя аналёгіі з жудасьці, аналёгіі. Толькі дакладчык—член бюро гаркому — тав. **Рубін** у сваім заключным слове даў адпаведны аналіз сутнасьці права-«лявацкіх» вылазак апартуністых.

Буйной палітычнай памылкай кустовага сходу зьяўляецца тое, што ён ня ўдарыў па прымірэнцтву да апартуністычных вылазак. У рэзалюцыі сходу ні слова няма аб прымірэнцкім выступленьні тав. **Антонава**—члена ячэйкі працасьветы. Гэты прымірэнец у сваім выступленьні патрабаваў зьняць з парадку дня пытаньне барацьбы супроць правых і «левых» апартуністых і гэтым самым паставіў сябе ў ролю абаронцы кулацкай агентуры. А куставы сход не завастрыў увагі партыйных мас на гэтым выступленьні, ня даў адпору беспрынцыпнаму прымірэнцтву, якое, па сутнасьці, зьяўляецца адкрытай абаронай правых і «левых» апартуністых і накіравана супроць лініі партыі ў пытаньнях барацьбы за генэральную лінію партыі, за ленінізм.

Характэрна падкрэсьліць, што некаторыя партыйцы, у прыватнасьці, сакратар ячэйкі КП(б)Б працасьветы—тав. **Песін,** замест таго, каб прызнаць памылкі, дапушчаныя сходам, імкнуўся давесьці, што сход даў належны адпор права-апартуністычным вылазкам і прымірэнцтву да іх. Тав. Песін на пасяджэньні бюро гаркому прабаваў даказаць, што памылка сходу заключаецца толькі ў тым, што ён не ўпісаў у рэзалюцыю пункту, асуджаючага прымірэнцкія выступленьні.

Бюро партыйнай ячэйкі заводу «Рухавік рэвалюцыі», як на самым кустаўым сходзе, так і пасьля яго, не здолела даць бязьлітаснага адпору вылазкам апартуністых. Сакратар ячэйкі—**Шчакаціхін** нават не выступіў на кустаўым сходзе. Асобныя партыйцы на пасяджэньні бюро (Тарыцын) імкнуліся адвесьці ўдар па апартуністых, затушаваць палітычны зьмест і значэньне факту апартуністычных вылазак і зьвязаць яго з узаемаадносінамі ячэек працасьветы і заводу «Рухавік рэвалюцыі».

Толькі пры дапамозе гаркому, які зусім своечасова рэагаваў на вылазкі права-«лявацкіх» апартуністых на кустаўым сходзе, бюро ячэйкі зав. «Рухавік рэвалюцыі» выправіла свае памылкі і стала на бальшавіцкі шлях змаганьня супроць апартуністых. З дапамогай гаркому бюро ячэйкі мабілізавала партыйны калектыў на барацьбу супроць правага і «левага» апартунізму, на барацьбу за генэральную лінію партыі. Сход парткалектыву з бальшавіцкім аднадушшам асудзіў апартуністычныя вылазкі членаў ячэйкі — Трэйбуха, Кукуявіцкага, Шэймана і Пераплётчыкава і нанёс бязьлітасны ўдар па іх апартуністычных выступленьнях. Сход пастанавіў **зьняць з работы сакратара ячэйкі—Шчакаціхіна** і паставіць яму «на від» за нерэагаваньне на права-апартуністычныя і «лявацкія» вылазкі членаў ячэйкі на групавым сходзе. **Тав. Кукуявіцкаму і Шэйману, якія асудзілі свае выступленьні, вынесены суровыя вымовы і тав. Пераплётчыкаву—суровая вымова з папярэджаньнем, Трэйбух з партыі выключаны.**

Аднак, мы лічым недапушчальным тое, што партыйны сход з поўнай даверлівасьцю аднёсься да прызнаньняў і асуджэньня сваіх памылак правымі ўхілістымі. Партыйны калектыў, прыняўшы іх прызнаньні за чыстую манэту, не паставіў перад імі ўмовы на справе, на практычнай рабоце ў змаганьні за генэральную лінію партыі давесьці сваю адданасьць партыі.

Партыйны калектыў КП(б)Б працасьветы **пастанавіў абвясьціць суровую вымову тав. Антонаву** за апартуністычна-прымірэнцкае выступленьне і паставіў пытаньне аб вывадзе яго са складу кандыдатаў у члены бюро цэх'ячэйкі. Між іншым, парткалектыў пастанавіў праверыць работу тав. Антонава на музеі.

Гомельскі гарком КП(б)Б і яго орган «Палеская Праўда» зусім своечасова, на канкрэтных фактах права-«лявацкіх» апартуністычных вылазак, мабілізавалі масы на змаганьне супроць правых і «левых» апартуністых. Зараз ва ўсіх буйнейшых партыйных ячэйках і калектывах Гомельскай арганізацыі шырока абмяркоўваюцца пытаньні меўшых месца апартуністычных вылазак у арганізацыі. Партыйныя масы, аднадушна асуджаючы права-«лявацкія» вылазкі і прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі, якія мелі месца на кустаўым сходзе, узнімаюць рашучыя меры барацьбы супроць правых і «левых» апартуністых і патрабуюць ачышчэньня партыйных радоў ад кулацкай агентуры, двурушнікаў і здраднікаў партыі.

Гомельская партарганізацыя будзе бесьпаваротна выганяць са сваіх радоў усіх тых, хто стаў ці становіцца на пазыцыі правага і «левага» апартунізму, хто становіцца на пляцформу права-«лявацкага» блёку, хто здрадзіў інтарэсам пралетарыяту.

Права-«лявацкія» вылазкі кулацкай агентуры, што мелі месца ў Гомельскай арганізацыі, павінны павысіць бальшавіцкую пільнасьць усяе КП(б)Б і кожнай арганізацыі ў паасобку, павінны прымусіць насьцеражыцца кожнага камуністага.

КАР.

*) Гл. «Зьвязду» № 268 ад 17/XI 1930 г.

Пастанова

бюро гомельскага гаркому КП(б)Б і гар. КК аб права-„лявацкай“ вылазцы на кустаўым партсходзе 13-XI 30 г.

Заслухаўшы паведамленьне члена бюро гаркому тав. Рубіна і азнаёміўшыся з пастановамі бюро і сходаў ячэек заводу «Рухавік рэвалюцыі», працасьветы і заводу «Пралетарскі шлях» адносна права-«лявацкіх» вылазак на кустаўым сходзе гэтых ячэек 13-IX г. г., бюро гаркому адзначае:

1. Група членаў ячэйкі зав. «Рухавік рэвалюцыі» — т. т. Трэйбух, Шэйман, Пераплётчыкаў і Кукуявіцкі — выступілі з паклёпамі на партыю і яе генэральную лінію. Гэтыя паклёпы выявіліся ў іх заявах, што «партыя адарвана ад мас», што «цэнтральны апарат не заўважае, што робіцца ў масах», што «ёсьць зьніжэньне рэальнай зарплаты ў сувязі з няправільнай лініяй партыі», што «Чырвоная армія лепш забясьпечваецца за кошт рабочых», што «збожжавая праблема ня вырашана» і інш. Такога зьместу заявы зьяўляюцца права-«лявацкімі», апартуністычнымі: яны выходзяць з пляцформы права-«лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзэ; яны зьяўляюцца адлюстраваньнем шалёнага супраціўленьня клясавага ворага ў краіне і контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай дзейнасьці буржуазных рэстаўратараў і інтэрвэнтаў накшталт кандраценўска-рамзінскай партыі.

2. Гэта вылазка не атрымала даволі рашучага адпору і вычарпальнай палітычнай ацэнкі на самым кустаўым сходзе. Лічыць зусім недапушчальнай і грубейшай памылкай невыступленьне на сходзе сакратара ячэйкі зав. «Рухавік рэвалюцыі», а таксама і тое, што рад выступаўшых не ўзьнялі пытаньня на прынцыповую вышыню і не далі адпору прымірэнчым адносінам з боку паасобных таварышоў (выступленьне т. Антонава: «ці палепшым мы наша становішча, калі будзем лаяцца з правымі і «левымі» ухілістымі»). Рэзалюцыя, прынятая сходам, увогуле правільная, не дала вычарпальнай палітычнай ацэнкі права-«лявацкай» вылазцы і прымірэнцтву да яе, што мела месца на сходзе.

3. Бюро гаркому адзначае, што «Палеская Праўда» своечасова і правільна дала палітычную ацэнку гэтым вылазкам, мабілізуючы партарганізацыю на змаганьне за чыстату генэральнай лініі партыі.

4. Ухваліць пастанову і арганізацыі, прынятыя бюро і агульнымі сходамі ячэек «Рухавік рэвалюцыі», працасьветы і «Пралетарскага шляху», якія далі ў асноўным правільную ацэнку права-«лявацкім» вылазкам сваіх членаў і прымірэнчым адносінам да іх. Ухваліць пастанову бюро і сходу ячэйкі «Рухавіка рэвалюцыі» аб зьняцці з работы сакратара ячэйкі Шчакаціхіна. Рашуча асудзіць выступленьне на сходзе тав. Кухарэнкі, якое, па яго думцы, было накіравана на абарону лініі партыі, а на справе сваімі няправільнымі тлумачэньнямі (кваліфікацыя права-«лявацкіх» выступленьняў, як анархізм, аналёгія з польскай арміяй) унесла блытаніну і не дало выразнай палітычнай арыентоўкі на сходзе.

5. У сувязі з меўшай месца на сходзе парткалектыву фабрыкі «Камінтэрн» яўна-апартуністычнай вылазкі тав. Гаравога, даручыць бюро калектыву абмеркаваць гэта пытаньне ў парткалектыве з перанясеньнем яго на бюро гаркому. Прапанаваць ячэйкам разгарнуць глыбокую прапрацоўку вынікаў пленуму ЦК, шырокае азнаямленьне членаў партыі з унутрыпартыйным становішчам, даючы рашучы адпор усякім антыпартыйным вылазкам.

6. Права-«лявацкія» вылазкі апартуністых, меўшыя месца ў нашай арганізацыі, сыгналізуюць перад усёй партарганізацыяй аб неабходнасьці яшчэ большай мабілізацыі бальшавіцкай ярасьці супроць адшчапенцаў з права-«лявацкага» блёку, рашучага змаганьня супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе завостранага клясавага змаганьня, супроць «левых» падгалоскаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму, якія змыкаюцца з правымі для новых атак супроць партыі і яе ленінскага кіраўніцтва, таксама непрымірымага змаганьня з праявамі прымірэнцтва да ўсякіх ухілаў ва ўсіх формах іх праяўленьня.

Гомельская партарганізацыя ў рашучым змаганьні за чыстату ленінскай лініі супроць найменшых адхіленьняў ад яе, узброеная марксыцка-ленінскай тэорыяй і практыкай змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі, яшчэ больш згуртуе свае рады вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і пойдзе ўпэўненым крокам па шляху нястрымнага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце.

Няхай жыве сталёвае адзінства бальшавіцкіх радоў!

Няхай жыве ленінскі ЦК і выпрабаваны правадыр партыі—тав. Сталін!

Жорстка ўдарыць па апартуністычнай практыцы

Правыя і «левыя» апартуністыя, скрыўляючы партыйную лінію ў практычнай рабоце, дзейнічаюць на руку клясаваму ворагу.

Выразныя дырэктывы партыі аб збожжазагатоўках у практычным праводжаньні скажаюцца паасобнымі ячэйкамі і раённымі партарганізацыямі.

Правыя апартуністыя, з уласьцівай ім тэорыяй «урастаньне кулака ў сацыялізм», зьяўляюцца абаронцамі кулацкіх элемэнтаў. Па іх міласьці, шмат кулакоў застаюцца неабкладзенымі с.-г. падаткам у індывідуальным парадку і свабоднымі ад абавязкаў па збожжазагатоўках.

Дзякуючы праваапартуністычнай практыцы ў паасобных зьвеньнях **Лепельскай, Чэрыкаўскай, Магілеўскай, Мсьціслаўскай** і інш. раённых партарганізацый, цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўках яшчэ да гэтага часу не даведзены да кулацка-заможнага двара.

«Камуністыя», якія працуюць у **Сушчэўскім** сельсавеце (Чавускі раён), ужо не знаходзяць кулака ў вёсцы. Апартуністычная сьлепата засланіла ім вочы, перашкаджае бачыць кулака і небясьпеку яго варожай дзейнасьці.

Кулакі **Тальнаўскага, Блуснага** і Шацкага сельсаветаў (Пухавіцкі раён) апартуністычнай «міласьцю» мясцовых работнікаў, вызвалены ад с.-г. падатку яшчэ ў мінулым годзе. У Талачынскім раёне толькі 7 кулакоў абкладзены с.-г. падаткам індывідуальна, а ўсе астатнія прыраўнены да серадняка.

Гэтыя факты яскрава сьведчаць аб наяўнасьці праваапартуністычнай практыкі ў ячэйках і прымірэнчых адносінах да апартунізму на практыцы з боку кіраўніцтва паасобных раённых партарганізацый.

У праведзеньні збожжазагатоўчай кампаніі недапушчальна ігнаруецца паасобнымі ячэйкамі работа з беднатой. Больш таго, ёсьць апартуністычныя разважаньні, што «без беднаты лягчэй выконваць загатоўкі».

Партыец Вальчук, характарызуючы ход збожжазагатовак па Воўкаўскім сельсавеце, «даводзіў», што збожжазагатоўкі праходзяць параўнальна здавальняюча, дзякуючы таму, што ў гэтым сельсавеце няма беднякоў. Гэтакія праваапартуністычныя разважаньні часамі прымаюцца за «чыстую манэту».

З другога боку, наглядаюцца даволі частыя выпадкі загібаў «улева». У раёне населеных пунктаў **Жлобінскага, Любаньскага, Рачыцкага, Касьцюковіцкага і Грэснага** раёнаў цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўках даведзены да серадняцкага двара, не ў парадку грамадзкасьці, а адміністрацыйным націскам.

Сярод паасобных камуністых Высачанскай райпартарганізацыі праўляюцца настроі праводзіць збожжазагатоўкі выключна адміністрацыйнымі мерамі, без уліку клясавага падыходу.

Партарганізацыі на месцах павінны жорстка ўдарыць па правых апартуністых і «левых» загібшчыках, якія сваёю дзейнасьцю ўносяць дэзарганізацыю ў работу на вёсцы па выкананьні баявых дырэктыў партыі.

ПЕЦЯРЭНКА.

Па-баявому

ПАРТКАЛЕКТЫЎ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК» (Менск), пасьля апублікаваньня пастановы ўраду аб перанясеньні гаспадарчага году, адразу-ж пераключыўся на прапрацоўку сустрэчнага прамфінпляну асобага ўдарнага кварталу. Вакол гэтага пытаньня партыйны калектыў мабілізаваў масы рабочых.

Партыйны калектыў здолеў арганізаваць рабочых на выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу. Тэмпы ў рабоце ўзяты сапраўды баявыя. Плян выконваецца з перавышэньнем. Прадукцыйнасьць працы павялічана на 26 проц. замест вызначаных 24 проц. Сабекошт зьніжаны на 9 проц. замест прадугледжаных плянам 8. За першыя дні кастрычніка першы агрэгат перавысіў выкананьне прамфінпляну.

Цэхавыя парт'ячэйкі перабудавалі сваю работу, цалкам падначаліўшы яе задачам ударнага кварталу прамысловасьці.

На фабрыцы ўведзена новая сыстэма аплаты працы. Вакол яе ўвядзеньня цэхавыя ячэйкі правялі вялікую работу. Зараз цэхпарт'ячэйкі сваю работу разгортваюць вакол пытаньняў усесаюзнага і ўнутрызаводзкага конкурсу, умовы якога даведзены да кожнага рабочага.

Партыйная арганізацыя фабрыкі пашырае свае рады за кошт рабочых-ударнікаў. За кастрычнік старшымі рабочымі пададзена 60 заяў аб прыёме ў рады КП(б)Б. Партыйная арганізацыя правяла масавы вечар, прысьвечаны росту партыі, на якім 33 рабочых таксама падалі заявы аб уступленьні ў партыю

Ф.

У хвасьце вытворчага ўздыму

Кіраўніцтва парткалектыву **абутковай фабрыкі імя Лекерта** (Віцебск) стаяла ў баку ад вытворчых задач свайго прадпрыемства. Кожны цэх фабрыкі меў буйныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну па кольказных і якасных паказальніках. І, ня гледзячы на сыгналізацыю аб такім становішчы ў мясцовым і цэнтральным друку, цэх'ячэйкі не спынілі праваапартуністычнай практыкі. Бюро парткалектыву доўгі час заставалася ў ролі апартуністычнага назіральніка, не ўжывала адпаведных мер да ліквідацыі прарываў. Толькі пасьля таго, як створаныя самацёкам ударныя брыгады і вытворчыя камуны пачалі развальвацца, бюро парткалектыву ў кастрычніку месяцы занялося «абсьледаваньнем работай».

Праверкай выяўлена, што парт'ячэйка загатоўчага цэху, якая ў свой час зьяўлялася перадавой на фабрыцы ў справе мабілізацыі рабочых мас на выкананьне прамфінпляну шляхам арганізацыі сацыялістычных метадаў працы, у рашаючы момант скацілася на апартуністычныя шляхі. Бюро парткалектыву замест рашучай барацьбы супроць апартуністычнага кіраўніцтва ячэйкі абмяжавалася перамяшчэньнем паасобных апартуністых на іншую работу, запісаўшы ў пастанове: «Выправіць памылкі, выходзячы з пастаноў XVI партзьезду».

Такія адносіны да апартуністых з боку бюро парткалектыву нельга іначай разглядаць, як прымірэнцтва да апартунізму.

Прарывы ў вінтавым цэху замазваюцца, ня ўжываюцца ніякія захады да зьнішчэньня безгаспадарчасьці, якая пануе ў цэху. Загадчык цэхам **Хатанаў** на заўвагі рабочых аб яго нядбайных адносінах да працы адказвае лаянкай, бесьпадстаўна называе рабочых пікурнікамі. Хатанаў пагражае прыёмшчыку **Ніхаміну** за тое, што апошні сумленна адносіцца да сваіх абавязкаў у вызначэньні прыгоднасьці прадукцыі.

Зараз праводзіцца работа па падрыхтоўцы пераводу фабрыкі на 7-гадзінны рабочы дзень і трохзьменную работу. Партыйная арганізацыя фабрыкі павінна разгарнуць ударную работу па забесьпячэньні гэтай рэарганізацыі, увязваючы яе з задачамі арганізацыі вытворчай актыўнасьці рабочых мас на пасьпяховае ажыцьцяўленьне пляну ўдарнага кварталу, вядучы бязьлітасную барацьбу супроць апартунізму ва ўсіх розных яго праяўленьнях.

Ш. А.

На падрыхтоўку ўзброенага нападу на СССР

адкажам узмацненьнем сувязі з Чырвонай арміяй

Спаборніцтвам узьнімем ваенную работу

РАПАРТ

Бягомльскага райсавету Асоавіяхіму

Да «дэкады абароны» заключан сацдагавор між ячэйкамі раёну на ўцягненьне новых членаў, ня менш 150 чал. кожнай, з якіх 20 проц. жанчын, і на распаўсюджаньне падпіскі на розную вайсковую літаратуру.

Усе ячэйкі павінны прайсьці цалкам праграму вайсковых заняткаў, набыць ня менш 5 процігазаў, паставіць спэктакль, сабраць цалкам уступныя і членскія ўзносы за 1930 год, зрабіць перарэгістрацыю ўсіх членаў Асоавіяхіму, арганізаваць вайскова-стралковыя гурткі і адначасова ахапіць усё насельніцтва зборам сродкаў на пабудову дырыжабля «Праўда».

Ня гледзячы на тое, што сацдагавор заключан да канца 1931 году, на 15 лістапада 1930 году ёсьць значныя посьпехі ў выкананьні некаторых пунктаў.

Цяпер вядзецца растлумачальная работа сярод працоўнага насельніцтва аб значэньні Асоавіяхіму.

Райсаветам Асоавіяхіму праведзен паход па ліквідацыі прарываў у калгасах імя Вароўскага і «Беларусь» і ў саўгасе «Камінтэрн». Было выкапана 110 гэкт. бульбы і сабрана грошай на дырыжаблябудаўніцтва ў суме 912 руб. 52 кап

АСТАШЭВІЧ.

Сувязь мацнее

(Гутарка з камандзірам 6-га стралковага палка т. Кальванам)

Над 6-м палком шэфствуе саюз будаўнікоў. Рабочыя менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» шэфствуюць над першым батальёнам нашага палка. Трэба сказаць, што як будаўнікі, так і швэйнікі вельмі ўважліва і сур'ёзна адносяцца да шэфства над Чырвонай арміяй.

Рабочыя трымаюць цесную сувязь з вайсковымі часьцямі, усімі мерамі дапамагаюць у культурна-асьветнай рабоце сярод чырвонаармейцаў. Не праходзіць амаль ні адно сьвята, якое-б не сьвяткавалася сумесна рабочымі і вайсковымі часьцямі.

Усе важнейшыя палітычныя кампаніі праводзяцца шэфамі і падшэфнымі часьцямі ў цесным кантакце. Нядаўна 6-ты полк арганізаваў паход у калгасы на ўборку бульбы. Гэты паход быў арганізаваны разам з рабочымі-будаўнікамі.

«Дзень індустрыялізацыі» полк правёў непасрэдна на пабудовах разам з рабочымі.

Улетку рабочыя аказалі вялікую дапамогу ў пабудове палкавога клюбу ў лягерах «Чырвонае Урочышча». Амаль кожны выхадны дзень у лягеры прыязджалі 30-40 рабочых-будаўнікоў, якія дапамагалі будаваць клюб. Усяго будаўнікі далі на пабудову клюбу 300 рабочых дзён. Дзякуючы рабочым-будаўнікам, будаўніцтва клюбу было фарсавана і скончана ў гэтым сэзоне.

Падшэфныя роты часта запрашалі сваіх шэфаў у лягеры, арганізоўвалі для іх стралковыя спаборніцтвы, вайсковыя заняткі і г. д. Зараз на большасьці прадпрыемстваў арганізаваны вайсковыя гурткі, якімі кіруе камандны склад падшэфных рот.

Вайсковыя часьці ў сваю чаргу наладжваюць экскурсіі на прадпрыемствы і трымаюць сыстэматычную сувязь з рабочымі.

Трэба наладзіць больш-менш сталае шэфства арганізацый над вайсковымі часьцямі. Шэфы са свайго боку павінны вылучаць упаўнаважаных па сувязі з Чырвонай арміяй на больш-менш доўгі тэрмін.

Ваянізуем шэфаў

Беларуская Аб'яднаная Вайсковая школа імя ЦВК па-ўдарнаму падрыхтавалася да «дэкады абароны». Паводле пляну, будуць прачытаны даклады аб «дэкадзе абароны» і аб значэньні Асоавіяхіму ў справе абароны краіны. Уся гэта работа будзе зьвязвацца з вярбоўкай новых членаў у рады Асоавіяхіму. Будуць арганізаваны стралковыя гурткі і спаборніцтва сярод жонак камскладу і работніц. Клюб рыхтуе дзьве платныя кіно-пастаноўкі, сродкі ад якіх будуць перададзены ў фонд абароны краіны.

Апрача гэтага школа прыняла рад канкрэтных мер у галіне ваянізацыі шэфа — заводу «Энэргія». У часе экскурсіі на завод **«Энэргія» і МББ** курсанты будуць праводзіць праверкі становішча ваянізацыі і рэалізацыі асоавіяхімаўскай літаратуры. Вылучана тройка на дапамогу **падшэфнаму сельсавету** ў праведзеньні «дэкады абароны».

ВАЙТОВІЧ.

* * *

Рабочыя заводу **«Энэргія»** заключылі сацыялістычны дагавор з курсантамі падшэфнай **АБВШ.** Рабочыя абавязаліся выкаваць поўнасьцю прамфінплян, курсанты — узмацніць баявую падрыхтоўку.

25 лістапада адбудзецца аб'яднаны вечар рабочых «Энэргіі» і курсантаў АБВШ, на якім будуць падагулены вынікі праробленай работы па «дэкадзе абароны». Будуць таксама распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні сувязі рабочых з курсантамі.

* * *

На пленуме Менскага гарсавету быў заслуханы даклад намесьніка старшыні Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму тав. **Дрыленка** аб ходзе «дэкады абароны». Пленум даручыў прэзыдыуму гарсавету арганізаваць «скразную» брыгаду для абсьледаваньня і выяўленьня рэальных магчымасьцяй палепшаньня бытавых умоў часьцей Менскага гарнізону.

* * *

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР накіраваў 6 інструктараў **ЦС** у розныя раёны Беларусі для дапамогі ў праведзеньні «дэкады абароны».

Пабудуем савецкія дырыжаблі

— **Камуна «Шлях Саветаў»,** Азарыцкага раёну, уносіць на пабудову дырыжабля **«Клім Варашылаў»** 78 рублёў і **выклікае калгасы «Прасьвет»,** імя Чарвякова і **«Камінтэрн».**

— **Рабкорка** часопісі «Беларуская работніца і сялянка» **Мядзьведзева** (завод «Чырвоны Кастрычнік») уносіць свой ганарар у суме 6 р. на пабудову дырыжабля імя «Праўды» і **выклікае рабкора т. Завелевіча.**

— Старшыня праўленьня Боркавіцкага раённага спажывецкага таварыства тав. **Дзянісаў** па выкліку інструктара РКК РСІ Дрысенскага раёну тав. **Кагана** ўносіць на пабудову дырыжабля імя «Праўды» 15 руб. і выклікае т. т. **Баравік** (Дрыса), **Урублеўскую** (Полацак), **Вайсборда** (Ула), **Нейдліна** (Ушач), **Таўкачова** (Ветрыка), **Шапіра** (Расоны), **Барсукевіча** (Валынцы) і **Сьвірко** (Валынцы).

— **Рабочыя і служачыя торфзаводу «Новая Беларусь»** (Бабруйск) уносяць на пабудову дырыжабля імя «Праўды» 151 руб. і **выклікаюць торфзаводы «Свабода», «Чырвоны Тарфянік», «Зьвязда», «Давыдаўка», «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоная Беларусь» і «Труды».**

— **Цэнтральны савет таварыства прыхільнікаў радыё** уносіць у фонд пабудовы дырыжабля імя «Праўды» 100 р. **і выклікае працаўнікоў кіраўніцтва сувязі, Белрадыёцэнтр, Асоавіяхім і ўсе раённыя аддзелы сувязі і ячэйкі ТПР. і г. д.).**

* * *

Калгасьнікі Менскага прыгараднага сельсавету ўносяць 50 руб. грашыма і 20 рублёў аблігацыямі пазыкі **і выклікаюць т. Кісялёва** — старшыню калгасу «Адраджэньне», **Грэбенка, Лямешанка** — заг. сталоўкі калгасу, **Рудакоўскага**— настаўніка Кальварыйскай школы, тав. **Валодзька** — старшыню калгасу імя Сталіна і тав. **Бязушка і ўсіх калгасьнікаў прыгараднага сельсавету.**

За выразную клясавую лінію

(Да вынікаў Усебеларускай канфэрэнцыі Азету)

Азет (т-ва па зямельным упарадкаваньні яўрэйскіх працоўных) было створана для мабілізацыі пралетарскай грамадзкасьці **ў дапамогу** партыі, каб уладзе ў справе зямляўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных. У сыстэме грамадзкіх арганізацый, існуючых у Савецкім Саюзе, Азет павінен быў заняць месца арганізацыі, якая выконвае задачы на адным з важнейшых вучасткаў барацьбы—на вучастку нацпалітыкі, ніякім чынам не ізалюючы сябе ад агульна-палітычных і гаспадарчых задач, якія стаяць перад краінай.

Своеасаблівы характар работы Азету з самага-ж пачатку прыцягнуў да гэтай арганізацыі ня толькі пралетарскую грамадзкасьць, але таксама і нацыяналістычна настроеныя групы яўрэйскай інтэлігенцыі, якім гэта арганізацыя здалася магчымым каналам правядзеньня сваіх нацыяналістычных імкненьняў. Трэба сказаць, што як першапачатковы статут Азету, так і некаторыя пастановы I усесаюзнага зьезду Азету, які адбыўся ў 1926 г., навыразна акрэсьлілі клясавыя задачы гэтай арганізацыі і клясавы склад яе членаў. Нацыяналістычныя элемэнты прабавалі праз Азет сказіць лінію партыі ў справе зямляўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных, затушаваць клясавы характар і інтэрнацыянальную сутнасьць гэтай работы.

Ясна, што, вядучы сваю работу ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва на ўсіх фронтах, у пэрыяд завостранага змаганьня з клясавым ворагам, які прабуе шляхам шкодніцтва, кандрацьеўшчыны, контр-рэвалюцыйных арганізацый і г. д. падарваць нашу работу,—ясна, што ў гэты момант задачы Азету зьяўляюцца яшчэ больш актыўнымі, у асаблівасьці ў сувязі з актывізацыяй нацыяналізму і шавінізму ў краіне, на аснове завостранага клясавага змаганьня.

Усебеларуская канфэрэнцыя Азету павінна была канстатаваць, што арганізацыя Азет яшчэ не пераключылася па-новаму. У сваёй рэзалюцыі па дакладу ЦП Азету канфэрэнцыя адзначае, што «пераломны момант, які перажываецца зараз Азетам, мае сваёй падставай тое становішча, што Азет. арганізацыя яшчэ ня здолела перабудавацца ў адпаведнасьці з задачамі і тэмпамі эпохі выкананьня пяцігодкі за чатыры гады». Таму рэзалюцыя робіць зусім правільны вывад, што «асноўная задача Азету—пераключыцца на бальшавіцкія тэмпы работы, арганічна ўвязваючы усе свае задачы з агульнымі задачамі сацбудаўніцтва краіны».

У гэтым—асноўнае. Абмяркоўваючы дзейнасьць Азету за пэрыяд з 1-га ўсесаюзнага зьезду, выступаўшыя на Усебеларускай канфэрэнцыі таварышы аднадушна канстатавалі, што гэтай самакрытыкі і самаправеркі ў Азет. рабоце ня было ў патрэбнай меры. Памылак было многа, прычым гэтыя памылкі насілі глыбока прынцыповы характар, але яны ня былі ў выстарчальнай меры выпраўлены. Меўшыя месца ідэалёгічныя адхіленьні ад правільнай партыйнай лініі не атрымалі патрэбнага адпору, яны ня былі ўзьняты на адпаведную прынцыповую вышыню і ня былі выкарыстаны для выхаваньня мас у духу лініі партыі. На канфэрэнцыі было канстатавана, што факты праваапартуністычных і нацыянал-апартуністычных адхіленьняў, якія мелі месца і былі выкрыты ў рабоце ў БССР (аб іх было у свой час сказана на старонках нашага друку) і ў радзе іншых арганізацый, не атрымалі выстарчальнага адпору з боку кіруючых арганізацый. Даволі сказаць, што рэзалюцыі I зьезду Белазету, у якіх было рад праваапартуністычных месц, былі санкцыянаваны ЦП Азету, і цэнтральнае праўленьне нават не палічыла патрэбным сваёй пастановай скасаваць сваю санкцыю і даць крытыку гэтых установак. Тав. Дзіменштэйн—дакладчык на Усебеларускай канфэрэнцыі Азету ад ЦП Азету — згадзіўся з фармулёўкай рэзалюцыі, што з боку Азету сапраўды не было праяўлена даволі рашучасьці і актыўнасьці ў барацьбе з правымі ўхіламі і з кулацкімі папаўзеньнямі ў рабоце Азету, ён адзначыў, што заслугаю таварышоў з Беларусі зьяўляецца іменна тое, што яны правільна змагаліся супроць правага ўхілу і нацыянал-апартунізму, што яны правільна ўзьнімалі рад палітычных пытаньняў.

Таму канфэрэнцыя палічыла неабходным у сваёй пастанове адзначыць прынцыповыя памылкі, дапушчаныя у Азет. рабоце. «Адзначаючы,—гаворыць рэзалюцыя па дакладу ЦК Азету,—дасягненьні па лініі гаспадарчага ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных і беднаты, канфэрэнцыя канстатуе, што ў гэтай рабоце мелі месца скажэньні праваапартуністычнага і нацыяналістычнага характару, якія выявіліся ў тым, што ў радзе мерапрыемстваў Азету адсутнічала выразная клясавая ўстаноўка; мела месца ігнараваньне беднаты пры перасяленьні; слаба была разгорнута крытыка яўна праваапартуністычных момантаў у рабоце паасобных арганізацый Азет; мелі месца засьмечанасьць арганізацыі чужым элемэнтам, ня была скасавана пастанова I зьезду Азету ў тэй яе частцы, дзе Азет займае нэйтральную пазыцыю ў адносінах да сіянізму. З боку ЦП Азету ня была праяўлена патрэбная рашучасьць і актыўнасьць у барацьбе з гэтымі зьявішчамі».

Рэзка падкрэсьліваючы, такім чынам, задачы барацьбы з правым ухілам, як з галоўнай небясьпекай, і нацыянал-апартунізмам, аддаючы асаблівую ўвагу задачам Азет, як арганізацыі, якая вядзе сваю работу ў галіне нацпалітыкі, пытаньням барацьбы з шавінізмам і нацыяналізмам і задачам інтэрнацыянальнага выхаваньня, канфэрэнцыя дала рэзкі адпор ліквідатарскім і «лявацкім» настроям. Шырокія магчымасьці гаспадарчага ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных, у сувязі з разгорнутым сацыялістычным будаўніцтвам і патрабаваньнямі на рабочую сілу, выклікалі «галавакружэньне» ў паасобных таварышоў, якія думаюць, што праблема мястэчка і наогул праблема эканамічнага ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных і беднаты зусім адпадае. Між тым дэлегаты месц і работнікі ў гэтым абсягу падавалі той відавочны факт, што ў нас ёсьць яшчэ даволі кантынгентаў з беднаты мястэчак і гарадоў, некваліфікаваных груп працоўных і дэклясаванай беднаты, якія адчуваюць патрэбу ў нашай рабоце; разам з тым таксама ясна, што настроі аб ліквідацыі Азету зьяўляюцца шкоднымі і не адпавядаюць дырэктывам XVI зьезду партыі аб узмацненьні работы сярод працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

Канфэрэнцыя дала адпор гэтым «левым» настроям і крыкам, падкрэсьліваючы, наадварот, важнасьць работы Азет на даным этапе.

Зусім правільна сказаў тав. Гантман у сваім выступленьні на зьезьдзе з прывітальнай прамовай ад імя ЦК КП(б)Б аб тым, што Азет на даным этапе не павінна быць арганізацыяй, якая дапамагае наогул зямельнаму ўпарадкаваньню працоўных яўрэяў, а **сацыялістычнаму** ўпарадкаваньню.

Адным з асноўных пытаньняў, вакол якіх разгарнуліся гарачыя спрэчкі, было пытаньне аб спалучэньні работ па гаспадарчым упарадкаваньні яўрэйскіх працоўных унутры рэспублікі і па перасяленьні на вылучаныя фонды ў Крыме і Біра-Біджане. Гэта пытаньне стала прынцыпова актуальным у сувязі з пастановай апошняга пленуму ЦП Азету, дзе пытаньням перасяленчай работы і перспэктывам гэтай работы аддаецца ўся ўвага, але там зусім абойдзены ацэнкі тэй вялізнай работы па калгаснаму будаўніцтве, якая праведзена за апошні год у БССР і СССР, дзе нічога ня сказана аб перспэктывах гаспадарчага ўпарадкаваньня ўнутры рэспублік.—наадварот, гэтыя рэзалюцыі прапануюць перагледзець сетку калгасаў і арцеляў з тым, каб частку гэтых арцеляў, якія недастаткова ўмацаваліся, перакінуць на перасяленчыя фонды. У рэзалюцыі па дакладу ЦП Азету па гэтым пытаньні гаворыцца зусім ясна. Там сказана: «канфэрэнцыя лічыць няправільнай устаноўку, даную ў гэтым пытаньні (г. зн. у пытаньні работы на месцы і па перасяленьні—Х. Д.) IV пленумам ЦП Азету». Лічыць няверна тэндэнцыю «рэвізаваць» пытаньне аб рабоце ўнутры рэспублік, бо «такія погляды фактычна азначаюць курс на аслабленьне калектывізацыі, на згортваньне гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак» (рэзалюцыя ЦК КП(б)Б аб яўрэйсцэ). Канфэрэнцыя правільна падкрэсьлівае неабходнасьць удзелу яўрэйскіх працоўных у сацыялістычным будаўніцтве краіны, паказваючы разам з тым на неабходнасьць правільнага спалучэньня задач як па рабоце ўнутры рэспублік, так і па лініі перасяленьня.

Гэта пытаньне, якое мае вялікае практычнае значэньне, таксама зьяўляецца глыбока прынцыповым. Нацыяналістычныя элемэнты прабавалі і прабуюць тлумачыць вылучэньне суцэльных фондаў для засяленьня яўрэйскімі працоўнымі такім чынам, што толькі работа на гэтых фондах вырашае «яўрэйскія пытаньні», яны зусім змазваюць удзел яўрэйскіх працоўных мас у сацбудаўніцтве. Яны тлумачаць засяленьне крымскіх фондаў або вылучэньне Біра-Біджану, як савецкае выданьне сіянісцкай палестынскай ідэі. Ня варта гаварыць аб шкоднасьці і апартуністычнасьці гэтай ідэі, ня варта гаварыць аб тым, што такое тлумачэньне гэтага пытаньня лье ваду на млын контр-рэвалюцыі і інтэрвэнтаў, стварае настрой нацыянальнай абасобленасьці, нацыяналістычнай абмежаванасьці, замест сацыялістычнага будаўніцтва рабочых і працоўных мас у краіне на інтэрнацыянальнай аснове. Вось чаму канфэрэнцыя так многа месца аддала гэтаму пытаньню.

Многа месца на канфэрэнцыі таксама было аддана пытаньню аб сацыяльным складзе Азет. арганізацыі. Толькі нядаўна ЦП Азету паставіла пытаньне аб зьмене статуту, які даваў магчымасьць быць членамі Азету таксама і пазбаўленым права голасу. З боку паасобных работнікаў Азету нядаўна была ў друку (газэта «Эмэс») выказана думка, каб прымаць у Азет тыя кадры з яўрэйскага насельніцтва, якія ў будучым падлягаюць гаспадарчаму ўпарадкаваньню. Такім чынам, мы замест упору на арабочаньне складу Азету, атрымалі новыя прапановы, якія, калі іх ажыцьцявіць, прывялі-б да новай засьмечанасьці радоў гэтай арганізацыі. Канфэрэнцыя таму лічыла неабходным у сваёй рэзалюцыі падкрэсьліць, што «Азет з посьпехам справіцца са сваімі задачамі пры тэй умове, калі арганізацыя будзе, з аднаго боку, усё больш і больш расьці за лік рабочых і працоўных усіх нацыянальнасьцяй і калі яна, з другога боку, будзе рашуча ачышчаць свае рады ад клясава-чужога і нацыяналістычнага элемэнту, прыцягваючы да работы Азету рабочых і новую савецкую інтэлігенцыю. **Рашуча асудзіць прапанову аб прыёме ў Азет «патэнцыяльных кандыдатаў» на «рэканструкцыю» з яўрэйскага насельніцтва, бо гэта прапанова мае тэндэнцыю засьмеціць Азет клясава-чужым элемэнтам».** Разам з тым канфэрэнцыя паказала на неабходнасьць вылучэньня ў апарат Азету рабочых, на ўкараненьне камуністычных мэтадаў работы—сацспаборніцтва, ударніцтва і г. д., на неабходнасьць разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і чулых адносін да работы.

Канфэрэнцыя з асаблівай сілай падкрэсьліла задачы Азету ў галіне выхаваньня і культурна-бытавога абслугоўваньня. Гэта галіна да апошняга часу была зусім запушчана, бо галоўную сваю ўвагу Азет звяртаў на апарацыйную работу. У сваёй пастанове канфэрэнцыя прапануе гэту галіну ўмацніць, ставячы, як адну са сваіх асноўных задач, барацьбу з шавінізмам, клерыкалізмам.

Што датычыць друку, канфэрэнцыя зафіксавала ў сваёй рэзалюцыі, што «Трыбуна»—часопіс Азету—яшчэ ў патрэбнай меры ня стала баявым памочнікам партыі ў справе сацбудаўніцтва і ажыцьцяўленьня нацпалітыкі і прапанавала ўмацніць гэту часопіс, узмацніць самакрытыку, узяць устаноўку на рабочага чытача, узмацніць выданьне папулярнай Азет. літаратуры і г. д.

Канфэрэнцыя прайшла пад знакам шырокай бальшавіцкай самакрытыкі. У асноўныя пытаньні далейшай работы была ўнесена яснасьць. Канфэрэнцыя падкрэсьліла, што **ўся далейшая работа павінна будавацца на аснове непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі,** у барацьбе з правай небясьпекай, як галоўнай, «левымі» загібамі і рашучай барацьбе з адхіленьнямі ад лініі партыі ў нацпытаньні. Выбраўшы новае праўленьне, канфэрэнцыя абнавіла кіраўніцтва і ўвяла ў яго вялікую колькасьць рабочых.

* * *

Першыя два гады пяцігодкі, прасунуўшы далёка наперад сацыялістычную гаспадарку СССР, прынесьлі таксама вялізныя рэзультаты ў галіне ажыцьцяўленьня нацпалітыкі, у прыватнасьці, у справе гаспадарчага ўпарадкаваньня і культурнага будаўніцтва сярод яўрэйскіх працоўных мас. Для характарыстыкі дасягненьняў рабочых і працоўных мас яўрэйскай нацыянальнасьці даволі сказаць аб тым факце, што калі раней нам прыходзілася гаварыць аб вялізарным ліку беспрацоўных сярод яўрэйскага насельніцтва, які перавышаў агульны процант беспрацоўя, то гэты момант зараз не зьяўляецца актуальным і адыйшоў у даўнасьць. Палепшылася значна становішча яўрэйскіх працоўных мас мястэчак. Маем вялізарны рост яўрэйскіх калгасаў. Сацыялістычная прамысловасьць уцягнула новыя пласты з яўрэйскіх працоўных. Гэта ў выніку прывяло да ўцягненьня ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва новых мас яўрэйскіх працоўных. Разам з тым моцна расьце сетка культурных і навучальных установ для яўрэйскіх працоўных мас на роднай мове. Усё гэта, ня гледзячы на наяўныя яшчэ недахопы, зьяўляецца неадлучнай часткай генэральнай лініі партыі і яе рэзультатам.

Нашы дасягненьні выклікаюць супраціўленьне клясавага ворага. Мы бачылі, як нацыяналізм, як правы апартунізм прабуе на гэтай рабоце нажыць сабе капітал. Ухіл да яўрэйскага шавінізму прымае новыя формы, прабуючы прыстасавацца да моманту. Калі ў папярэдні пэрыяд яўрэйскія нацыяналісты спэкулявалі на тым, што «яўрэям кепска жывецца ў СССР», дык яны зараз высоўваюць момант аб «пагібелі яўрэйскай нацыі» ў рэзультаце асыміляцыі, у сувязі з масавым уцягваньнем яўрэйскіх мас у буйную прамысловасьць і ў інтэрнацыяналізацыі калгасаў. Гэты новы манэўр яўрэйскага нацыяналізму, хаваецца пад маскай барацьбы з асыміляцыяй, таксама будзе біты, бо генэральная лінія партыі, пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б забясьпечваюць далейшы бурны рост і росквіт нацыянальных па форме і сацыялістычных па зьмесьце культур і работы па эканамічным упарадкаваньні працоўных усіх нацыянальнасьцяй, у тым ліку і працоўных яўрэйскай нацыянальнасьці.

Х. ДУНЕЦ.

ПЛЯН ВЯЛІКІХ РАБОТ ТРЭЦЯГА ГОДУ

Саўнарком зацьвердзіў кантрольныя лічбы разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год

Вынікі другога году пяцігодкі і праграма далейшага сацыялістычнага наступленьня—найлепшыя доказы буйнога росту і ўзмацненьня БССР і Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, найлепшыя доказы правільнасьці генэральнай лініі партыі

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НА 1931 ГОД ПРАДУГЛЕДЖВАЮЦЬ РОСТ:

выпуску прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці (бяз Лесааб'яднаньня) на	104,5 проц.
рабочай сілы на	52,8 проц.
прадукцыйнасьці працы на	30,4 проц.
заработнае платы на	5,2 проц.
зьніжэньня сабекошту на	10,0 проц.

Асыгнуецца:

на капітальнае будаўніцтва	109,5 млн. руб.
жыльлёвае будаўніцтва	15,3 млн. руб.
сацыяльна-бытавое будаўніцтва	4,4 млн. руб.

У РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЕ З ПРАВА-„ЛЯВАЦКІМ“ БЛЁКАМ, ШКОДНІКАМІ І ІНШЫМІ ВОРАГАМІ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ—ПЕРАВЫКАНАЕМ ПЛЯНАВЫЯ ЗАДАНЬНІ ПАРТЫІ І УРАДУ

Посьпехі мінулага году—гарантыя далейшых перамог

Савет Народных Камісараў БССР зацьвердзіў кантрольныя лічбы народнае гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год.

СНК канстатаваў, што за мінулы гаспадарчы год рабочаю клясаю БССР, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі, дасягнуты вялікія посьпехі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, посьпехі, **якія пацьвярджаюць бясспрэчную магчымасьць выкананьня пяцігодкі за чатыры гады (а па некаторых галінах і за карацейшы тэрмін).**

У мінулым годзе значна разгарнулася сацыялістычная індустрыялізацыя Беларусі: Агульная прадукцыя рэспубліканскае прамысловасьці **павялічылася за другі год пяцігодкі на 67,5 проц.** і дала рост у параўнаньні з 1926-27 годам **на 150 проц.** Гэта ў той час, калі пяцігадовым плянам быў запраектаваны рост за два гады **толькі на 87 проц.**

Капітальнае будаўніцтва рэспубліканскае прамысловасьці, якое ствярае прадпасылкі для далейшай сацыялістычнай індустрыялізацыі БССР, выканана за мінулы год **у размеры 44 млн. руб.** (замест 38,4 млн. руб., вызначаных пяцігадовым плянам).

Уздым народнае гаспадаркі ішоў побач **са значным павялічэньнем кадраў пралетарыяту.** Колькасьць рабочых толькі ў адной рэспубліканскай прамысловасьці за 1929-30 г. узрасла **больш як на 14 тыс. чал.** Колькасьць усіх працуючых па найме павялічылася **да 40 тыс. чал.** замест 20 тыс. чал. прыросту ў 1928-29 г.

Разам з тым СНК адзначыў, што ў 1929-30 г., які даў па рашаючых галінах народнае гаспадаркі **павышэньне меркаваньняў пяцігадовага пляну,** меў **неапоўнае выкананьне гадавога пляну, асабліва па лініі якасных паказальнікаў і капітальнага будаўніцтва.** Зьніжэньне сабекошту складала таксама **каля 8 проц. замест 11 проц.,** якія вызначаны кантрольнымі лічбамі на 1929-30 г.

Разьвіцьцё індустрыі Беларусі і ўздым усіх галін народнае гаспадаркі ва ўмовах карэннай сацыялістычнай рэканструкцыі ўжо **прывяло да поўнай ліквідацыі беспрацоўя.** [illegible] зацьцю, што да апошніх гадоў гаспадарчага [illegible] зьяўлялася адной з [illegible] праблем народна-гаспадарчага пляну.

У выніку ўсяго папярэдняга народна-гаспадарчага разьвіцьця і рашучага павароту бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да калектывізацыі ў 1929-30 г., **дасягнуты значныя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі Беларусі.** Плошча сацыялістычнага сэктару **павялічылася з 5,5 проц.** у пачатку 1929-30 г. **да 18 проц. пад канец другога году пяцігодкі** ў той час, як пяцігадовым плянам было прадугледжана павялічэньне пад канец 1932-33 і апошняга году пяцігодкі да 18 проц.

Дасягнуты ўзровень народнае гаспадаркі, узросшая вытворчая актыўнасьць рабочае клясы, якая знайшла свой адбітак у разгортваньні сацспаборніцтва і яе ўздыме на вышэйшую ступень,—**даюць рэальную магчымасьць праектаваць на бліжэйшы год далейшае павялічэньне тэмпаў росту народнае гаспадаркі па шляху сацыялістычнай індустрыі і перабудовы сельскай гаспадаркі.**

Важнейшыя задачы 1931 году

Важнейшымі задачамі, якія павінны быць вырашаны ў бліжэйшым годзе, зьяўляюцца: **далейшы ўздым сацыялістычнага сэктару ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі, далейшае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце і рашаючае выцісканьне капіталістычных элемэнтаў, ліквідацыя кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, паляпшэньне ўмоў забесьпячэньня дабрабыту рабочае клясы.**

Практычнымі задачамі зьяўляюцца: **значны пералом па ўсіх групах якасных паказальнікаў на базе сацыялістычнае рэканструкцыі, рацыяналізацыі і максымальнага скарыстаньня працоўнага ўздыму рабочае клясы, значны пералом у вырашэньні праблемы кадраў і разгортваньне мерапрыемстваў па арганізацыі працы, поўнае выкананьне мерапрыемстваў па ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці.**

Выкананьне гэтых задач трэцяга году пяцігодкі патрабуе напружанай работы ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, гаспадарчых органаў, прафэсыянальных арганізацый і **далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўных фактараў выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.**

Выходзячы з усяго гэтага, Савет Народных Камісараў БССР зацьвердзіў наступныя асноўныя заданьні і ліміты на 1931 гаспадарчы год.

Буйны рост рэспубліканскае прамысловасьці

У мінулым годзе значна разгарнулася сацыялістычная індустрыялізацыя Беларусі.

Агульная прадукцыя рэспубліканскае прамысловасьці павялічылася за другі год пяцігодкі **на 67,5 проц.** і дала рост у параўнаньні з 1926-28 г. **на 150 проц.** у той час, як пяцігадовым плянам быў запраектаваны рост за два гады на 87 проц.

Рост агульнай прадукцыі рэспубліканскае прамысловасьці, непасрэдна падпарадкаванай ВСНГ (бяз Лесааб'яднаньня), **мяркуецца давесьці ў 1931 г. з 284,5 млн. руб.** (у цэнах 1926-27 г.) **да 581,9 млн. руб., г. зн. рост на 104,5 проц.** у параўнаньні з вынікамі, якія чакаюцца сёлета (улічваючы поўнае выкананьне заданьня асобнага кварталу), а з Лесааб'яднаньнем—на 99,8 проц.

Сярэднягадавую колькасьць рабочых рэспубліканскае прамысловасьці бяз Лесааб'яднаньня СНК мяркуецца павялічыць з 42,9 тыс. чалавек у 1930 годзе да 65,6 тыс. чал. у бліжэйшым 1931 годзе, або на 52,8 проц. Прадукцыйнасьць працы павінна ўзрасьці на 30,4 проц. (без тарфяной прамысловасьці).

Сярэдня-гадавая **заработная плата** па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці **ўзрасьце на 5,2 проц.**, а без тарфяной прамысловасьці—**на 8 проц.**

На 1931 год **зьніжэньне сабекошту** вызначана па рэспубліканскай прамысловасьці **ў 10 проц. пры абавязковай умове паляпшэньня якасьці прадукцыі.** СНК БССР паставіў задачу перад рэспубліканскай прамысловасьцю ВСГ **ахапіць бесьперапынкаю да канца 1931 году ўсіх рабочых, 7-мігадзінным рабочым днём—да 95 проц.,** замест 12,3 проц.

Капітальнае будаўніцтва па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці (бяз лесу і ільнааб'яднаньняў) вызначаецца **ў суме 109,5 млн. руб.** у цэнах 1930 году. У гэтым ліку **на новае будаўніцтва вызначана 14,2 млн. руб.** Для параўнаньня трэба заўважыць, што капітальныя ўкладаньні ў 1929-30 годзе на гэту мэту складалі **ўсяго 33,9 млн. руб.**

З агульнае сумы капітальных укладаньняў вызначана **15,3 млн. руб. на жыльлёвае будаўніцтва і 4,4 млн. руб. на сацыяльна-бытавое.**



Узрасьце прамысловасьць Лесааб'яднаньня

Па Лесааб'яднаньні прыняты наступныя кантрольныя лічбы на 1931 год:

Вытворчыя заданьні:	1930 г.	1931 г.
Агульная прадукцыя ў цэнах 26-27 г. (у млн. руб.)	47,5	81,7
Выраб пілаваных матар'ялаў (у тыс. кбм)	788	1075
» фанэры (у тыс. кбм)	98,5	129
Колькасьць рабочых	6050 чал.	8940 ч.
Зьніжэньне сабекошту	—	7%
Капітальныя ўкладаньні:		
Усе капітальныя ўкладаньні (у цэнах адпаведнага году) у тыс. руб.	8.400	19.269
У тым ліку на лясную гаспадарку		12.817
» » прамысловасьць		6.452

Харчовая прамысловасьць вырасьце на 215 проц.

Кантрольныя лічбы па прамысловасьці, падпарадкаванай Наркамгандлю, прыняты такія: **павялічэньне агульнай прадукцыі** па Белсельпроме, Белдзяржсьпірце і Белшвацыне з 35,6 млн. руб. (па цэнах 1926-27 г.) **да 97,4 млн. руб.** у 1931 годзе, **або на 173,6 проц.** Прадукцыя харчовай прамысловасьці павялічваецца з 28 млн. руб. **да 88,2 млн. руб., г. зн. на 215 проц.**

Колькасьць рабочых у паказаных аб'яднаньнях узрастае з 3.340 чал. **да 6.145 чал.** (на 78,6 проц.) Зьніжэньне сабекошту па гэтых аб'яднаньнях вызначана **ў сярэднім на 7 проц.**

Капітальныя ўкладаньні па прамысловасьці, падпарадкаванай Наркамгандлю, вызначаны **ў суме 34.699.000 руб.**

Наркамгандлю даручана не пазьней 15 сьнежня падаць у СНК плян будаўніцтва новых прадпрыемстваў, зьвязаных з перапрацоўкай гародніны і садавіны. Улічваючы патрэбу максымальнага павялічэньня харчовых рэсурсаў, СНК запрапанаваў паскорыць будаваньне маннага і сагавага заводаў і ўжыць канкрэтныя захады да пабудаваньня ў 1932 г. заводу «Корнфлекс».

Па мясцовай прамысловасьці прадугледжана павялічэньне агульнай прадукцыі (у цэнах 1926-27 г.) **да 70 млн. руб.** у параўнаньні з 27,1 млн. за 1929-30 г. Колькасьць рабочых узрасьце **да 13,5 тыс. чал.** (у 1929-30 г. іх было 7,3 тыс.). Капітальныя ўкладаньні ў мясцовую прамысловасьць **павялічваюцца да 14.442.000 руб.** у параўнаньні з 9.535.000 руб. у 1929-30 годзе.

На электрыфікацыю—звыш 41 млн. рублёў

На раённыя электрастанцыі капітальныя ўкладаньні **вызначаны ў 18.750.000 рублёў,** на камунальныя станцыі—**6.800.000 рублёў,** на сельскія—**7.850.000 руб.** і на прамысловыя—**8.350.000 руб.**

Магутнасьць электрастанцый павялічыцца з 18.000 клв. на 1 кастрычніка 1930 году **да 46,6 тыс. клв. на 1 студзеня 1931 году** і **на 70,8 тыс. клв. на 1 студзеня 1932 году.** Выпрацоўка энэргіі ўзрастае з 66,3 млн. клв.-гадзін на 1 студзеня 1931 году **да 183,6 млн. клв.-гадзін у канцы 1931 году.**

Першай ДРЭС даручана весьці работу па будаваньні другой чаргі электрычнай станцыі такім чынам, каб турбіна магутнасьцю ў 24.000 клв. магла быць пушчана не пазьней, як у пачатку кастрычніка 1931 году.

ВСНГ даручана ўжыць захады да таго, каб будаўніцтва Гомельскай раённай электрастанцыі было пачата раньняй вясной 1931 году і каб яно вялося ўдарным тэмпам з тым, каб першая турбіна магла быць пушчана ў сьнежні 1932 году.

Дапамагчы саматужна-прамысловай каапэрацыі

На 1931 год вызначан сярэднягадавы лік членаў вытворчых арцеляй **у 57,9 тыс. чал.** у параўнаньні з 26,7 тыс. чал. у 1930 годзе (рост на 116,7 проц.). Гэта будзе складаць 70.100 чал. у канцы году ў параўнаньні з 40.900 чал. на 1 студзеня 1931 году. Прырост—каля 30.000 чал.

Апрача таго, па лініі абслугоўваючых арцеляй вызначана павялічэньне сярэднягадавога ліку членаў іх з 3,7 тыс. чал. у 1930 годзе **да 4,3 тыс. чал.** у 1931 годзе (рост на 50 проц.).

Разам з павялічэньнем колькасьці каапэраваных саматужнікаў, адпаведна павялічэньню новай выпрацоўкі ў паасобных промыслах, мяркуецца давесьці кошт агульнай прадукцыі вытворча-саматужных арцеляй у 1931 г. **да 156 млн. руб.** у параўнаньні з 84,9 млн. р. у 1930 годзе. Капітальныя ўкладаньні ў 1931 годзе прыняты тут у 6.732.000 руб. у параўнаньні з 2.117.000 рублёў у 1929-30 годзе і 970.000 руб. у асобным квартале гэтага году. На выраб будаўнічых матар'ялаў асыгнуецца ў прыватнасьці 1.472.000 рублёў.

Белсампрамсаюзу даручана ўжыць усе захады да поўнага выкананьня вызначаных тэмпаў каапэраваньня. Асаблівую ўвагу трэ будзе зьвярнуць на выкананьне і перавыкананьне вызначанага разьвіцьця промыслаў, што працуюць на бездэфіцытным сырцы, а таксама на пашырэньне вырабаў больш каштоўных рэчаў асабістага і хатняга ўжытку.

Поўнасьцю забясьпечыць праграму будучага году

СНК БССР даручыў ВСНГ і Наркамгандлю ўжыць захады **для павялічэньня зьменнасьці на прадпрыемствах, для бесьперабойнага і своечасовага пераходу на бесьперапынны тыдзень і разгортваньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.** Намечаныя ўстановы павінны будуць таксама дабіцца сапраўднага зруху па ўсіх якасных паказальніках (прадукцыйнасьць працы, зьніжэньне сабекошту, паляпшэньне якасьці прадукцыі).

ВСНГ даручана забясьпечыць поўнае выкананьне заданьняў **па распрацоўцы торфу на 1931 год,** зьвярнуўшы пры гэтым увагу на здабываньне торфу **новым фрэзэрным спосабам** і на забесьпячэньне патрэбным абсталяваньнем. Торфараспрацоўкі павінны быць **своечасова забясьпечаны падрыхтаванай рабочай сілай.**

СНК прапанаваў разгарнуць усе патрэбныя падрыхтоўчыя работы, у прыватнасьці **ў галіне жыльлёвага будаўніцтва,** неабходнага для забесьпячэньня праграмы будучага году, а ў прамфінпляне надаць асаблівае значэньне **разгортваньню цагельнай прамысловасьці, яе мэханізацыі і эфэктыўнасьці новых мэханізаваных заводаў.**

Дзяржпляну і ВСНГБ даручана распрацаваць пытаньне **аб разьвіцьці сеткі рамонтных майстэрань** з тым, каб у максымальнай меры забясьпечыць рамонт сельска-гаспадарчых і іншых машын.

Ахапіць калектывізацыяй 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

У выніку ўсяго папярэдняга народна-гаспадарчага разьвіцьця і рашучага павароту бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да калектывізацыі ў 1929-30 годзе дасягнуты значныя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Роля сацыялістычнага сэктару **павялічылася з 5,5 проц. у пачатку 1929-30 г. да 18 проц. пад канец другога году пяцігодкі.** Гэта ў той час, як пяцігадовым плянам меркавалася павялічыць да 18 проц. сацыялістычны сэктар толькі пад канец 1932-33 і апошняга году пяцігодкі.

СНК паставіў задачы да 1 студзеня 1932 году размер калектывізацыі **давесьці да 45 проц. агульнай колькасьці бядняцка - серадняцкіх гаспадарак БССР.**

На 1931 год **агульная пасеўная плошча прынята ў 4.083.000 гэкт.** У гэтым ліку пад ільном—240.000 гэкт., пад бульбаю—650.000, пад кармавымі кораньнялодамі—81,5 тыс., пад палявымі травамі—406.000, пад сіласнымі культурамі—34,5 тыс. гэкт. і пад гародамі—70.000 гэкт.

Пасеўная плошча трэставаных савецкіх гаспадарак павінна быць давядзена да вясны 1931 году **да 135,5 тыс. гэкт.** (у параўнаньні з 57.000 гэкт. у 1930 г.).

Адпаведнымі мерапрыемствамі на сельскай гаспадарцы павінна быць забясьпечана **павялічэньне ўраджайнасьці збожжавых культур** у саўгасах да 12 проц. з гэктара і ў калгасах—да 10 проц. з гектара, а ў індывідуальных гаспадарках—да 8 проц.; па ільне—на 15 проц. з гэкт. і па бульбе—на 10 проц.

Колькасьць сьвіней павялічыць на 50 проц.

Зьмены ў складзе стада да вясны 1931 году ў параўнаньні з 1930 г. вызначаны ў наступных велічынях: **павялічэньне стада буйной рагатай жывёлы на 26,6 проц.** у тым ліку кароў—на 5,7 проц., **сьвіней—на 50 проц.**, а ўсёй іншай жывёлы ў пераводзе на буйную рагатую—**на 8 проц.**

Для пашырэньня колькаснага складу стада і павялічэньня таварнасьці жывёлагадоўлі павінны быць праведзены ў 1931 годзе наступныя мерапрыемствы: да 1 студзеня 1932 году давядзена колькасьць **спэцыялізаваных прыгарадных малочных калгасаў да 102 гаспадарак з агульнай колькасьцю кароў у 27.000.** Лік глыбінных малочных жывёлагадоўчых калгасаў **трэба павялічыць да 360 з колькасьці кароў 35,5 тысяч штук.** Трэба **арганізаваць 200 калгасаў спэцыяльна для гадаваньня буйной рагатай жывёлы** з агульнай колькасьцю цялят у іх **ня менш 20.000 штук,** разгарнуць работу ў непрамысловых калгасах па гадаваньні цялят у колькасьці **ня менш 30.000 штук;** з арганізуемых і арганізаваных калгасаў вызначыць 10 спэцыяльных **для развядзеньня палепшанай малочнай жывёлы з матачным складам ня менш чым 1.700 кароў.**

Стада буйной рагатай жывёлы Белсаўгастрэсту павінна быць давядзена **да 50,5 тыс. штук,** у тым ліку кароў—**да 17,9 тыс. штук і цялят—да 20.000 штук.**

Адначасова з разьвіцьцём сьвінагадоўлі па лініі Сьвінаводтрэсту павінна рашуча ўзмацніцца работа ў калгасах. Калгасы павінны паставіць задачай давесьці лік сьвінаматак **да 150.000 штук.** Да 1 студзеня 1932 году лік спэцыялізаваных у прамысловай сьвінагадоўлі калгасаў **павінен быць давядзен да 1000.**

Узмацніць кармавую базу

Для **арганізацыі кармавое базы** павінна быць праведзена найбольш **простае паверхневае паляпшэньне сенажацяй на плошчы 300.000 гэкт. і карэннае паляпшэньне на плошчы 50.000 гэкт.** Павінны быць арганізаваны шматпалёвыя севазвароты з палявым травасеяньнем з тым, каб давесьці **плошчу пад укоснаю канюшынаю да 162.000 гэкт. і пад вікаю на сена—да 185.000 гэкт.** Адначасова з пашырэньнем плошчы пад кармавымі кораньнялодамі **да 80.000 гэкт.** арганізаваць сіласаваньне кармоў у колькасьці ня менш **1,3 млн. тон,** а для размяшчэньня сіласнай масы паставіць **665 вежаў,** у тым ліку ў саўгасах—155 і ў калгасах—510, разьмеркаваўшы рэшту масы ў траншэях і ямах. Для павышэньня зямляробчай прадукцыі, забесьпячэньня ёю ўзрастаючай жывёлагадоўлі і сельска-гаспадарчай індустрыі ўжыты наступныя мерапрыемствы ў частцы палявой і гародна-садовай гаспадаркі:

На працягу 1930 году загатовіць торфа-мохавага подсьцілу 60.000 тон, у тым ліку ў савецкіх гаспадарках—10.000 тон, у калгасах—30.000 тон, у сельска-гаспадарчых т-вах—20.000 тон; **торфу на ўгнаеньне—2 млн. тон.** Павінна быць пашырана **культура лубіну на зялёнае ўгнаеньне** з давядзеньнем пасеўнае плошчы пад ім да 150.000 гэктараў, **заапнавана** на працягу 1931 году ня менш 80.000 гэкт. Агульная сума **забесьпячэньня машынамі вызначана ў 30.000.000 руб.**

239.000.000 рублёў—сельскай гаспадарцы

Пад прыгараднымі прамысловымі гародамі плошча **вызначана ў 12.000 гэкт.** Па лініі Белсадгастрэсту павінны быць спэцыяльна арганізаваны агародна-садовыя базы з давядзеньнем да канца будучага году плошчы іх пад пладовымі рассаднікамі **да 1.360 гэкт.**

Для ўцягненьня ў сельска-гаспадарчы зварот нескарыстаных зямель і арганізацыі на іх буйных спэцыялізаваных саўгасаў прыняты наступныя аб'ёмы мэліярацыйных работ: рэгуляваньне рэк з агульным вынімам 2 млн. к.-м. зямлі, пракладка магістральных каналаў на даўжыні 500 клм., інтэнсыўная асушка плошчы ў 113,5 тыс. гэкт., паднятьце цаліны на асушаных балотах 30.000 гэкт. і выкарчоўка 50.000 гэкт.

Агульны ход мерапрыемстваў, вызначаных кантрольнымі лічбамі на 1931 год, па сельскай гаспадарцы прыняты **ў суме 238,8 млн. руб.**

У галіне лясное гаспадаркі СНК вызначыў **агульны размер фінансаваньня ў 16.12.000 рублёў,** у тым ліку на капітальныя ўкладаньні—7.604.000 рублёў і на апэрацыйныя выдаткі—8.808.000 руб.

Асноўнае — далейшая калектывізацыя вёскі

Задача далейшай калектывізацыі вёскі—асноўная задача ў справе сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гаспадаркі. Таму СНК БССР даручыў Наркамзему, Белкалгасцэнтру, сыстэмам вытворчай каапэрацыі і ўсім мясцовым органам з усёй энэргіяй разгортваць работу па разьвіцьці калгаснага руху, стаць на чале новай хвалі прыліву ў калгасы і кіраваць ім з тым, каб нясупынна і сыстэматычна праводзіць на базе суцэльнае калектывізацыі ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Наркамзему разам з Белкалгасцэнтрам, Белмалжывёласаюзам і іншымі арганізацыямі, якія гадуюць жывёлу, а таксама з усімі мясцовымі органамі, даручана забясьпечыць своечасовае выкананьне пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкананьне пляну будаўніцтва і на дасягненьне высокіх якасных паказальнікаў (удойлівасьць, нагул).

Падрыхтаваць кадры

У выніку росту паасобных галін народнае гаспадаркі пры павышэньні прадукцыйнасьці працы і сярэднягадавы **лік гарадзкога пралетарыяту павялічваецца ў 1931 годзе на 31,7 проц.**—Прыняўшы гэта да ведама, СНК вызначыў мерапрыемствы па падрыхтоўцы масавых кадраў па лініі Наркампрацы: будаўнікоў—20,5 тыс. чал., мэталістых—1,1 тыс. чал., шофэраў—1,8 тыс. чал., падросткаў для фабрычна-заводзкіх школ—6,4 тыс. чал. і інш.—4.000 чал. а ўсяго—33,3 тыс. чал.

Наркампрацы таксама даручана перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі ў галіне пляніраваньня, разьмеркаваньня рабочай сілы і арганізацыі працы і не пазьней 1 сьнежня 1930 году падаць у СНК канкрэтны плян рэгуляваньня і пляніраваньня набору рабочае сілы ў прамысловасьць, арганізацыі сэзоннага рынку працы, правядзеньня мерапрыемстваў для ліквідацыі разрыву ва ўзроўні заработнае платы паміж паасобнымі групамі рабочых, для змаганьня з цякучасьцю рабочае сілы, а таксама ўцягненьня жаночай рабочай сілы ў прамысловасьць.

НКПрацы павінен не пазьней 1 студзеня 1931 г. падаць у СНК БССР праз Дзяржплян разгорнуты баланс працы гарадзкога насельніцтва на 1931 год, адбіўшы ў ім канкрэтныя мерапрыемствы для ўдасканаленьня работы ў галіне пляніраваньня размеркаваньня рабочае сі-

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НА 1931 ГОД ПРАДУГЛЕДЖВАЮЦЬ РОСТ:

калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да	45 проц.
пасеўнай плошчы саўгасаў на	237 проц.
ураджайнасьці збожжавых культур у саўгасах на	12 проц.
у калгасах на	10 проц.
індывід. гаспадарках	8 проц.
ураджайнасьці ільну на	15 проц.
ураджайнасьці бульбы на	10 проц.
пагалоўя буйной рагатай жывёлы на	26,6 проц.
стада сьвіней на	50 проц.

Асыгнуецца:

на ўзмацненьне сельскае гаспадаркі. 239 млн. р[уб.]

Максымум увагі культурнаму фронту

Пры прадпрыемствах ВСНГ зацьверджана арганізацыя ня менш 25 школ ФЗВ з лікам вучняў да 8,7 тыс. чалавек. Па 6-ці дзенных і 25 вячэрніх рабфаках зацьверджан кантынгент па дзенных—1,5 тыс. студэнтаў са студзеня і 2,2 тыс. з верасьня, па вячэрніх—да 6.940 са студзеня і да 10.000 з верасьня 1931 году.

Падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў розных кваліфікацый праз курсы і інш. зацьверджаны ў наступных размерах: па прамысловасьці—11.000 чал., па сампрамкаапэрацыі—2.000 чал., дарожна-транспартнай справе—4,1 тыс. чал., па сельскай гаспадарцы 24,6 тыс. чал., па фінансава-крэдытнай сыстэме—3,1 тыс., па пэдагагічнай і інш. кадрах асьветы—10.000 чал., мэдычных кадраў—540 чал., па спажывецкай каапэрацыі—13.000 чал., Белдзяржкіно—70 чал., сувязі—500 чал., на курсах Наркампрацы—47,7 тыс. чалавек і па завочным навучаньні—12.000 чал.

Ахоп дашкольным выхаваньнем, пачынаючы са студзеня 1931 году, вызначаны ў 102.000 дзяцей, з верасьня—115.000, а лік дзяцей у дзіцячых дамох да верасьня 1931 году павінен быць давядзен да 6,6 тыс. дзяцей.

Улічваючы значны наплыў у 1929-30 г. дзяцей у школы ўсеагульнага навучаньня і прымаючы пад увагу абавязковасьць навучаньня ў 4-х-гадовай школе дзяцей 8-9—10 г., СНК БССР прызнаў патрэбным разгарнуць на сродкі мясцовага бюджэту сетку такіх школ, каб ахапіць імі 675.000 дзяцей пры сярэдняй нагрузцы на камплект ня больш 45, ад верасьня пры тэй-жа нагрузцы—648.000 дзяцей. Лік камплектаў са студзеня ўстаноўлены ў 12.928, а з верасьня—у 14.400.

Школамі другога канцэнтру са студзеня павінна быць ахоплена ня менш 22.000 дзяцей. Ад верасьня лік вучняў даводзіцца да 108.000. **Да абавязковага навучаньня ў 5-ай групе прыцягваюцца ўсе скончыўшыя пачатковую школу дзеці рабочых ва ўзросьце 12-14 год. Сетка гэтых школ будзе разгорнута ў гарадзе і рабочых пасёлках з такім разьлікам, каб дзеці ўсіх працоўных, скончыўшыя пачатковую школу, былі забясьпечаны ў школах месцамі.**

За лік сродкаў, вызначаных кантрольнымі лічбамі па дапамогу беднаце, **павінны быць створаны пры школах інтэрнаты для дзяцей рабочых, беднаты, батракоў і калгасьнікаў** з такім разьлікам, каб у кожным раёне была **ня менш аднэй школы з інтэрнатам.**

Вячэрнімі школамі для рабочых [і] калгасьнікаў павінна быць ахоплена 20.000 чал., а з верасьня—каля 47.000. Агульны аб'ём фінансаваньня асьветы і падрыхтоўкі кадраў на 1931 год вызначаны **ў суме 176,36 млн. рублёў,** у тым ліку на капітальныя ўкладаньні па культурна-асьветных установах—55,8 млн. руб.

Павялічэньне стацыянарных кіноўстановак з 300 у 1930 годзе прадугледжана **да 425** у 1931 годзе і кіно-перасовак з 399 да 761. На капітальныя ўкладаньні Белдзяржкіно вызначана **2 млн. 114 тыс. руб.,** з якіх 1 млн. руб. на пабудову новай кіно-фабрыкі, а рэшта—на пабудову і абсталяваньне кінотэатраў і дапаможных установ.

На **навукова-дасьледчую справу** прыняты выдаткі ў суме **8.629,5 тыс. рублёў.** Капітальныя ўкладаньні ў навукова-дасьледчыя ўстановы вызначаны ў суме 3.967,5 тыс. руб. На падрыхтоўку аспірантаў навукова-дасьледчых установ, вышэйшых школ і тэхнічных ВНУ БССР вызначана 940,7 [illegible]. Дзяржпляну даручана [illegible] да 15 сьнежня [illegible] даклад аб [illegible] работы ў 1931 г., аб структуры паасобных навукова-дасьледчых інстытутаў і сыстэме арганізацыі пляніраваньня навукова-дасьледчае справы.

Прымаючы пад увагу значнае пашырэньне мерапрыемстваў па народнай асьвеце ў будучым годзе, СНК БССР лічыць патрэбным, каб Наркамасьветы забясьпечыў **шырокі ўдзел пралетарскай грамадзкасьці ў справе далейшага разгортваньня культурнай рэвалюцыі.**

Культурна-матар'яльнае становішча працоўных мас няўхільна расьце

Рабочае забесьпячэньне—на вышэйшую ступень

У галіне рабочага забесьпячэньня прыняты наступныя заданьні на 1931 год на прыгарадных гаспадарках спажывецкай каапэрацыі:

	На 1 студз. 1932 г.		На 1 студз. 1931 г.
Агароды	5.600 гэкт.	замест	800 га
Малочныя фэрмы	12.600 кароў	,,	7.820 кароў
Сьвінаматкі	9.100 штук	,,	3.682 штук
Адкорм. сьвіней	12.000 месц	,,	7.536 месц
Парнікі	54.000 рам	,,	1.750 рам
Садова-ягады	1.100 гэкт.		—

Прырост паянакапленьня па сыстэме спажывецкай каапэрацыі на 1931 год прыняты **ў 16 млн. рублёў.**

Прызнана неабходным **пашырыць сетку закрытых разьмеркавальнікаў настолькі, каб імі былі ахоплены ўсе рабочыя найбольш буйных прамысловых прадпрыемстваў.**

СНК лічыць неабходным забясьпечыць у будучым годзе **паляпшэньне таварнага забесьпячэньня рабочых** за кошт росту агульнага кантынгенту забесьпячэньня і правядзеньня разьмеркаваньня прадуктаў і тавараў паводле клясавага прынцыпу. Асноўнымі задачамі сыстэмы спажывецкай каапэрацыі на 1931 год зьяўляюцца:

Максымальнае прыцягненьне рабочых да справы рабочага забесьпячэньня і грамадзкага харчаваньня, поўнае выкананьне ўсіх вызначаных лімітаў па разгортваньні прыгарадных гаспадарак, забесьпячэньне эфэктыўнасьці гэтых прадпрыемстваў, паляпшэньне якасьці абслугоўваньня і ліквідацыі чаргі, значнае паляпшэньне грамадзкага харчаваньня і поўнае выкананьне заданьняў па паянакапленьні і каапэраваньні.

Спажывецкай каапэрацыі даручана зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне сыстэмы закрытых разьмеркавальнікаў і забясьпечыць значнае паляпшэньне іх работы. Гэтага можна будзе дасягнуць, забясьпечыўшы кантроль рабочых у справе размеркаваньня тавараў і арганізацыі работы закрытых разьмеркавальнікаў.

Мерапрыемствы па ахове здароўя

Агульны аб'ём выдаткаў на ахову здароўя ў 1931 г. вызначаны **ў 40,6 млн. руб.** Вырастуць новыя мэдычна-прафіляктычныя ўстановы; на гэту мэту мяркуецца пусьціць 15,5 млн. руб. На капітальны рамонт гэтых установ адпускаецца 0,8 млн. руб. Улічваючы невыстарчальнасьць абслугоўваньня працоўных мэдычна-прафіляктычнай сеткай, якая існуе зараз, СНК запрапанаваў Наркамату аховы здароўя прыступіць у будучым годзе **да рэарганізацыі ўсёе сыстэмы аховы здароўя.** Лекава-прафіляктычныя ўстановы больш буйных прамысловых цэнтраў мяркуецца [illegible]

Палепшыць сацыяльнае забесьпячэньне

Кантынгент забясьпечаных у 1931 г. вырасьце на 18 проц. З гэтага ліку ваенныя пэнсіянэры—на 9,5 проц. і пэнсіянэры з састарэлых сялян—на 150 проц. Лік каапэраваных у арцелі інвалідаў узрасьце ў бліжэйшым годзе на 137 проц.

З прычыны таго, што значна павялічваецца кантынгент забясьпечаных, а таксама расьце сума пэнсіі, СНК БССР прыняў размер выдаткаў на сацыяльнае забесьпячэньне ў 1931 г. **у суме 2.866.400 руб.** (параўнальна з мінулым годам рост на 17,7 проц.).

Будуць расьці рыштаваньні

Аб'ём чыстага будаўніцтва арыентоўна вызначаецца ў суме 327 млн. руб. і зьніжэньне кошту будаўніцтва параўнальна з мінулым годам—у размеры 15 проц. (на жыльлёвым будаўніцтве—на 12 проц.).

Важнейшай задачай будаўнічых арганізацый у 1931 г. зьяўляецца дасягненьне вызначанага кантрольнымі лічбамі зьніжэньня кошту будаўніцтва. Тэмпамі зьніжэньня кошту будаўніцтва. Тэмпы складаньні пляну будаўніцтва на бліжэйшы год забясьпечыць правядзеньне адпаведных мерапрыемстваў для выкананьня гэтага заданьня.

Канчаткова ліквідаваць бездарожжа

На **дарожным будаўніцтве** аб'ём укладаньняў прыняты ў суме **27.094.500 рублёў** (на будаўніцтве мясцовых дарог).

Укладаньні на **водным** транспарце прыняты ў суме **16 млн. 604 тыс. рублёў.** Размер **капітальных укладаньняў у галіне сувязі** на 1931 г. прыняты ў суме 32 млн. 247,8 тыс. рублёў.

СНК мяркуе завесьці ў будучым годзе на Беларусь 350 [illegible] аўта-машын розных тыпаў, у тым ліку грузавых—2.440, [illegible] аўтобусаў—125 і спэцыяльных [illegible]

РВК і Галоўдарстранс [illegible] канаць плян дарожнага будаўніцтва 1931 году, поўнасьцю скарыстаўшы мясцовыя працоўныя рэсурсы ў межах вызначаных плянаў.

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ—У ЦЭХІ

Новым уздымам рабочай актыўнасьці, дзесяткамі тысяч новых рабочых прапаноў, поўным выяўленьнем скрытых унутраных рэсурсаў, максымальным сустрэчным прамфінплянам—спаткаем трэці рашаючы год пяцігодкі

Ударнікі, рабочыя і работніцы! Выканаем баявы загад партыі—пяцігодку—за чатыры гады. Узмацнім абароназдольнасьць савецкай краіны

Лепшы адказ інтэрвэнтам

Ударнікі „Камунара" ідуць у партыю Леніна

БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА ЗА ПЯЦІГОДКУ

А. ЧАРВЯКОЎ

Гаворыць старая пралетарская гвардыя

...-га лістапада я быў запрошан на нараду старых рабочых заводу «Камунар». Гэта была сапраўдная нарада старой пралетарскай гвардыі, бо яе ўдзельнікі былі пралетары-мэталістыя з вытворчым стажам 20 год і вышэй. Нарада склікалася для таго, каб падвесьці вынікі першага месяца ўдарнага кварталу, абгаварыць пытаньне аб падрыхтоўцы да трэцяга рашаючага году пяцігодкі, каб падзяліцца думкамі аб задачах рабочае клясы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

...з вялікі жаль на гэтым сходзе ня было ні кіно-здымшчыкаў, ні выдатных ...меньнікаў, ні стэнаграфістых, каб ...ацаваць паасобныя незабыўныя моманты гэтай нарады.

Гаворыць тав. **ОКУНЬ**. Ён мае вытворчы стаж звыш 30 год. Ён успамінае барацьбу рабочых у Вільні ў часы генэрал-губарнатара Фон-Валя, ён быў удзельнікам выступленьняў рабочых у ...ску ў часы Курлоўскіх расстрэлаў.

— Усё бачылі,—кажа ён,—многае, мы перажылі многае і таму не баімся труднасьцяй. Мы перамагалі таму, што вяла партыя бальшавікоў, і зараз пераможам пад кіраўніцтвам ЦК, рашуча змагаючыся за генэральную лінію партыі, даючы рашучы адпор ухілам, у першую чаргу праваму, як найбольш небясьпечнаму, і «леваму». З гневам ён гаворыць пра антыпартыйны ПРАВА-«ЛЯВАЦКІ» БЛЁК ГРУПЫ Сырцова-Ламінадзэ, патрабуючы рашучых мер з боку партыі ў дачыненьні да іх.

Слова просіць **ШАГУДЗЕВІЧ**. Ён ня ўмее добра гаварыць па-расійску, але ўсе добра зразумелі. Ён ад імя рабочых патрабуе: шкоднікаў контр-рэвалюцыянэраў расстраляць, каб зьнішчыць усё шкоднае варожае племя. Тых, хто, будучы ў партыі, дапамагае шкоднікам, правых і «левых» апартуністых, ...ікаў, маўчальнікаў, ня гледзячы на асобы, з партыі выгнаць. І сталіна, дзе ідзе нарада, гудзе ў адказ—«...расстраляць... выгнаць!».

Нарада рашуча ставіць пытаньне аб тым, каб ня спыняць узятых тэмпаў ..., каб вытворчы плян ударнага кварталу заводу «Камунар», павышаны супроць мінулага кварталу на 47 проц., абавязкова выканаць. Вось чаму завастраецца ўвага на тым, каб рашуча выкрыць шкурнікаў, рвачоў, лятуноў, прышлых на завод з чужога асяродзішча. Гэтых шкоднікаў выкрыць, выкінуць. Свой вопыт, загартаванасьць старой гвардыі перадаць маладым рабочым, навучыць моладзь справе рэвалюцыйнай барацьбы.

Тав. **ЛАЗАВІК** высьмейвае тых, хто нараджаецца на труднасьці. Ён напамінае, што завод «Камунар» пачатак свой узяў з невялікай кузьні. Ён гаворыць, што былі часы, калі рабочыя самі зьніжалі сабе расцэнкі, каб не закрыць завод. Вось чаму ён так востра адчувае вялізны рост сацыялістычнага будаўніцтва, нашы посьпехі і заяўляе аб гатоўнасьці працаваць да поўнай перамогі сацыялізму, перамагаючы ўсе труднасьці.

А стары ліцейшчык тав. **ГЖЫВЕЦ**, які мае 40-гадовы стаж, заяўляе: «Пераходны сьцяг, які атрымаў ліцейны ўдарны цэх, мы нікому ня ўступім».

Надзвычайнае хваляваньне да сьлёз выклікала выступленьне рабочага з Нямеччыны, які заявіў, што, ня гледзячы на ўсе хітрыкі буржуазіі, рабочая кляса Нямеччыны і ўсяго сьвету добра разумее, што краіна Саветаў будуе сацыялізм, што ў буржуазных краінах ідзе жорсткая клясавая барацьба за дыктатуру пралетарыяту і што рэвалюцыя пераможа. Рот фронт!

— Браты,—кажа стары «камунаравец», — пры царызьме мы сталі адзін супроць другога з вінтоўкай, мы не павінны гэтага дапусьціць у сучасны момант. Буржуазія рыхтуе новую вайну. Яна рыхтуе напад на Савецкі Саюз. Мы вайну імпэрыялістычную павінны ператварыць у вайну грамадзянскую, накіраваць свае штыхі супроць сусьветнай буржуазіі.

— Рот фронт!—гучыць у адказ з вуснаў прысутных.

25 старых пралетараў, агалашаюць заяву аб уступленьні ў рады партыі. «Каб павялічыць пралетарскае ядро партыі, каб аддаць усе нашы апошнія сілы на барацьбу за справу рабочае клясы, за сацыялізм, мы ідзем у партыю»—кажа тав. Лазавік.

Вытворчы стаж тав. **ЛАЗАВІКА**—40 год. Разам з ім т. т. **ГЖЫВЕЦ**—ліцейшчык — вытворчы стаж 40 гадоў, **ГОЛЬДБЭРГ** — 35 гадоў, **ЛЕВІН** і інш.

Зусім сівы маляр тав. **ГРЫГОР'ЕЎ** кажа коратка: «Гаварыць я ня ўмею, а працаваць умею і буду, за рэвалюцыю гатоў памерці, прашу прыняць у рады партыі».

Вялікім, урачыстым момантам нарады было агалашэньне адозвы заводу «Камунар» да ўсіх мэталістых Беларусі. Гэта адозва была распрацавана на падставе папярэдняга выяўленьня думак, жаданьняў, заўваг паасобных рабочых.

Адозва падводзіць вынікі працы заводу за мінулы час. Завод стаіць у ліку тых, хто выканаў і перавыканаў прамфінплян мінулага году, перавыконвае прамфінплян ударнага кварталу.

Адозва вызначае тэмпы і задачы будучай працы — ня спыняць, а пашыраць вытворчую праграму, зьніжаць сабекошт, паляпшаць прадукцыйнасьць, паляпшаць якасьць.

Адозва рашуча заклікае ўсіх рабочых шчыльней згуртавацца вакол кампартыі і яе ленінскага ЦК, каб на аснове генэральнай лініі партыі шырэй разгортваць рашучае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, зьнішчаючы клясавых ворагаў, ачышчаючы рады партыі ... чужацкай агентуры ў партыі...

Нарада закончылася з вялікім уздымам. Словы «Інтэрнацыяналу» гучэлі з вуснаў упрыгожаных сівізной пралетараў, як прызыўны кліч да ўсіх рабочых весьці няспынную барацьбу за канчатковую перамогу сацыялізму.

Нарада выявіла надзвычай высокі ўздым энтузіязму рабочае клясы, рашучасьці змагацца за перамогу сацыялізму, перамагаць усе труднасьці, ісьці разам, пад кіраўніцтвам кампартыі і яе ленінскага ЦК, у разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце.

Нарада яшчэ і яшчэ раз паказала, што рабочыя масы надзвычай востра адчуваюць важнасьць асобнага, ударнага кварталу і з усёй пралетарскай адказнасьцю рыхтуюцца да надыходзячага трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

Лейпцыгскія рабочыя аб заводзе „Камунар“

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

ПАСЬЛЯ НАВЕДАНЬНЯ ВАШАГА ЗАВОДУ МЫ МОЖАМ КАНСТАТАВАЦЬ, ШТО ВЫ, РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ «КАМУНАР», У ПРАЦЯГУ 2-х ГОД ЗУСІМ ЗЬМЯНІЛІ ТВАР ВАШАГА ПРАДПРЫЕМСТВА, ВЫ ПАЙШЛІ МАГУТНЫМІ КРОКАМІ НАПЕРАД, ВЫ ЗДОЛЕЛІ Ў ТЭХНІЧНЫХ АДНОСІНАХ СТАЦЬ НА ЎЗРОЎНІ АДПАВЕДНЫХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ ФАБРЫК.

НЕКАТОРЫЯ НЕДАХОПЫ ЁСЬЦЬ ЯШЧЭ Ў АДЛІВАЧНЫМ ЦЭХУ, НА ЯКІЯ МЫ ПАКАЗАЛІ ПРЫ НАШАЙ ГУТАРЦЫ З МАЙСТРАМ.

З ВЯЛІЗАРНЕЙШЫМ ЗДАВАЛЬНЕНЬНЕМ І РАДАСЬЦЮ МЫ СЬЦЬВЯРДЖАЕМ, ШТО ЎСЕ ВАШЫ ПОСЬПЕХІ ДАСЯГНУТЫ ДЗЯКУЮЧЫ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЮ ШМАТЛІКІХ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, ДЗЯКУЮЧЫ ТАМУ, ШТО ЎСЕ ВЫ, РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ «КАМУНАР», ПРЫМАЕЦЕ ЎДЗЕЛ У РАЗГОРТВАНЬНІ ВАШАГА ПРАДПРЫЕМСТВА.

ТАВАРЫШЫ! ПАСЬЛЯ НАШАГА ЗВАРОТУ Ў НЯМЕЧЧЫНУ МЫ РАСКАЖАМ НЯМЕЦКІМ РАБОЧЫМ ПРА ВАШУ ПРАЦУ ПА БУДАЎНІЦТВЕ САЦЫЯЛІЗМУ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ГЕНЭРАЛЬНАЯ ЛІНІЯ ПАРТЫІ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ БРАЦКІ САЮЗ РАБОЧЫХ СССР І НЯМЕЧЧЫНЫ!
РОТ ФРОНТ!

ДЭЛЕГАЦЫЯ РАБОЧЫХ ЛЕЙПЦЫГУ.

Да ўсіх мэталістых БССР

Таварышы!

Мы толькі што адсьвяткавалі 13-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэта гадавіна супала з новай гістарычнай паласой у палітычным і гаспадарчым разьвіцьці як Савецкага Саюзу, так і капіталістычных дзяржаў. У той час, як капіталістычны сьвет знаходзіцца ў моцных цісках глыбокага крызісу, які выкінуў на вуліцу мільённыя арміі беспрацоўных і зьнізіў і без таго жабрацкі заработак рабочых, у той час, як фашызм імкнецца ў крыві патапіць нарастаючы ўздым рэвалюцыйна-клясавага змаганьня рабочых мас—у гэты час краіна Саветаў шпарка з посьпехам будуе сацыялізм на базе сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Наперакор кулацкім агентам—правым і «левым» апартуністым і нацыянал-апартуністым, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, дабіваецца адной перамогі за другой.

Уключаны ў агульны фронт сацыялістычнай будоўлі, наш завод «Камунар» за другі год пяцігодкі выканаў сваю праграму на 103 проц., зьнізіў сабекошт на 29,9 проц., замест 29,2 проц. і павялічыў прадукцыйнасьць працы на 35,2 проц. замест вызначаных плянам 29,9 проц.

Прамфінплян ударнага кварталу, павялічаны супроць 4-га кварталу 2-га году пяцігодкі на 43 проц., таксама выконваецца з перавышэньнем. Напрыклад, праграма кастрычніка выканана на 101,3 проц.

Як мы дабіліся гэтых посьпехаў? У нас ёсьць шмат дасягненьняў, забясьпечаных новымі мэтадамі работы і ўжываньнем вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. І вось мы лічым, што станоўчымі момантамі нашай работы трэба падзяліцца з іншымі прадпрыемствамі, каб дапамагчы ім лепш паставіць сваю работу.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партарганізацыі заводу і своечасовай мабілізацыі ўвагі ўсёй рабочай масы супроць паасобных прарываў, дзякуючы рашучай барацьбе з праваапартуністычнай практыкай асобных кіраўнікоў, актыўнасьць рабочых узьнялася на яшчэ больш высокую ступень. Рабочыя ўнесьлі каля 600 прапаноў. Значная частка гэтых прапаноў ужо выканана. Эканамічны эфэкт, падлічаны толькі па 51 прапанове, складае 218.000 руб. Гэтыя-ж прапановы далі нам магчымасьць высунуць на трэці год пяцігодкі сустрэчны прамфінплян, які павялічвае кантрольныя лічбы на суму каля 2-х мільёнаў руб.

Толькі ў часе вытворчых манэўраў, якія мы правялі ў другой палове кастрычніка, мы сабралі 125 прапаноў рабочых. Прамфінплян у нас даведзены да варштату, арганізаваны 4 «скразныя» брыгады і 2 камуны. У часе манэўраў каля 700 рабочых прымацавалі сябе на заводзе да канца пяцігодкі. Вытворчыя манэўры яшчэ больш узьнялі энтузіязм і энэргію рабочых. Гэты ўздым асабліва выявіўся ў тым, што 55 рабочых з вялікім вытворчым стажам падалі заявы аб прыёме іх у партыю.

Вось нашы дасягненьні ў кароткіх агульных рысах. Каб больш падрабязна асьвятліць наш станоўчы вопыт, мы ў бліжэйшы час выпускаем шматтыражку, спэцыяльна прысьвечаную новым мэтадам нашай работы, і рассылаем гэтую шматтыражку па ўсіх заводах мэталапрамысловасьці.

Але ўсё-ж трэба адзначыць, што ў нас ёсьць рад недахопаў. Няпоўнасьцю яшчэ мабілізаваны ўнутраныя рэсурсы, няпоўнасьцю выкананы рабочыя прапановы. Яшчэ мае месца брак, хаця за апошні час у гэтай справе ў нас ёсьць вялікія дасягненьні. У сувязі з пераходам на бесьперапынку, у нас назіраецца рад няўвязак у расстаноўцы рабочай сілы. Мы таксама шмат цэрпім ад адсутнасьці спэцыялізацыі. Усё гэта прымушае нас зьвярнуцца да рабочых іншых прадпрыемстваў мэталапрамысловасьці з просьбай падзяліцца сваёй практыкай работы, каб дапамагчы нам зьнішчыць гэтыя недахопы. Мы прапануем для гэтага таксама выпусьціць спэцыяльныя нумары шматтыражак, прысьвечаныя лепшым мэтадам работы, і гэтыя нумары прыслаць нам для азнаямленьня.

Асаблівае значэньне зараз мае прапрацоўка кантрольных лічбаў на 1931 год і складаньне сустрэчнага прамфінпляну. Мы практычную работу па ... кантрольных лічбаў ужо ...

абмеркаваньня. Цікава было-б ведаць, як стаіць справа на іншых прадпрыемствах.

Дарагія таварышы! У адказ на пагрозу імпэрыялістых выступіць вайною супроць краіны Саветаў, у адказ на падрыўную шпіёнскую работу контр-рэвалюцыянэраў-шкоднікаў з «прампартыі», у адказ на вылазкі права-«лявацкага» блёку,—рабочая маса павінна ў шмат разоў узмацніць абароназдольнасьць краіны, з большай энэргіяй і ўпартасьцю змагацца за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады і за генэральную лінію партыі.

Мы ўпэўнены, што ініцыятыва і энтузіязм рабочай клясы і, у першую чаргу, рабочых-мэталістых зьяўляецца найлепшай гарантыяй, што ўсе адказныя задачы, якія перад намі ставіць пяцігодка, будуць поўнасьцю выкананы.

Няхай жыве будаўнік сацыялізму—рабочая кляса СССР! Няхай жыве яе выпрабаваны правадыр—ленінская камуністычная партыя, яе ЦК на чале з тав. Сталіным!

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ ЗАВОДУ «КАМУНАР»

Хто ідзе ў партыю

На вечары на зав. «Камунар» 25 рабочых падалі заявы аб жаданьні ўступіць у рады партыі. Многія з іх маюць 30-ці і нават 40-гадовы рабочы стаж. Вось, напрыклад, т. **Левін**, рабочы сьлясарнага цэху, мае 40-гадовы рабочы стаж, тав. **Бельковіч** — (бляшаны цэх) і **Грыгор'еў**—маляр таксама на вытворчасьці па 40 год. Рабочыя **Балескі, Шпілеўскі, Банецкі, Мэндковіч** — маюць стаж па 30 год, тав. **Гэрцыгер**—35 год, т. т. **Лазавік і Зубкоўскі** — па 28 год, **Кісялёў і Рольбэйн**—па 26 год, **Левін М. і Красьнікаў**—па 20 год, **Кандратовіч і Вайц**—па 15 год, тав. **Залкінд** 12 год, **Курс і Рубенчык**—па 10 год і г. д.

Плян выканаем

Тав. ІЗЭКСОН, (фабрыка „Кастрычнік“). Вытворчы стаж—16 год

Асабліва добрае ўражаньне на мяне зрабіў у кантрольных лічбах рост прадукцыі прамысловасьці ВСНГБ, які ўжо перакрывае пяцігодку па рэспубліканскай прамысловасьці. Зьніжэньне сабекошту, вызначанае ў разьмеры 10 проц., можа быць выканана толькі тады, калі на гэта фабрыкі і заводы зьвернуць асаблівую ўвагу.

Пытаньне аб кадрах у кантрольных лічбах пастаўлена шырока, але яшчэ поўнасьцю не вырашаецца. Па маёй думцы, там, дзе ёсьць магчымасьць шырока разгарнуць унутрызаводзкае вучнёўства: прымацаваньне да майстроў, павялічэньне фонду праміяваньня за навучаньне вучняў і г. д. — гэта трэба зрабіць.

Павялічэньне ліку прыгарадных гаспадарак, малочных фэрм дасьць магчымасьць аслабіць нашы затрудненьні.

Намечаныя кантрольныя лічбы рэальны. Наша фабрыка, якая за барацьбу за прамфінплян атрымала ордэн «Чырвонага Сьцягу», зараз змагаецца за першынства ва ўсесаюзным конкурсе на лепшае прадпрыемства. Зараз мы рыхтуемся да трэцяга году пяцігодкі. Плян прапрацоўкі кантрольных лічбаў ужо складзен.

Жыльлёвае будаўніцтва патрабуе дадатковых сум

(Тав. Шыманскі, рабочы заводу „Ударнік", вытворчы стаж—25 год)

Я лічу, што лічба ў 15,3 млн. рублёў, якая вызначана на жыльлёвым будаўніцтве, бязумоўна, вялікая. Але-ж, бяручы пад увагу сучасны разгон будаўніцтва фабрык і заводаў і новы прыцёк рабочых, здаецца, што на гэтыя сродкі мы ня здолеем пабудаваць патрэбнай колькасьці кватэр. Было-б добра, каб ЦСПСБ з свайго боку адшукаў поўную суму і далучыў яе да тых, што вызначаны ў кантрольных лічбах.

Наша дапамога партыі ў змаганьні за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну забясьпечана. Лічбы разьвіцьця прамысловасьці БССР зараз-жа трэба пачаць прапрацоўваць на рабочых сходах.

Кантрольныя лічбы рэальны

МЫ ГАТОВЫ БІЦЦА ЗА КОЖНЫ ПРОЦАНТ—ТАК ЗАЯЎЛЯЮЦЬ УДАРНІКІ МЕНСКІХ ЗАВОДАЎ

Лепшы адказ на вылазкі права-„лявацкага" блёку

Тав. МАЛАШЭНКА, (ф-ка „Кастрычнік“) Вытворчы стаж—16 год

Зацьверджаныя кантрольныя лічбы на 1931 год даюць магчымасьць зрабіць вывад як Беларусь адсталая ператвараецца ў краіну прамысловую. Гэта яшчэ раз пацьвярджае правільную лінію партыі па індустрыялізацыі краіны і сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі.

Вызначаны рост прадукцыі па прамысловасьці ВСНГБ на 104,5 проц. больш вынікаў 1930 г. — лепшы адказ ныцікам, ухілістым з права-«лявацкага» блёку.

Артыкул Пуанкарэ, зьмешчаны ў буржуазнай прэсе, у якім ён наводзіць паклёп на Савецкі Саюз, нібы ў нас ужываецца прымусовая праца і рабочых прымушаюць працаваць наперакор іх волі, зьяўляецца хлусьнёй.

У той час, калі ва Францыі ёсьць немалы мільёнаў беспрацоўных, у нас **зусім ліквідавана беспрацоўе**. З кантрольных лічбаў мы бачым, што на 1931 год запраектаваны рост рабочае клясы па адной толькі прамысловасьці ВСНГБ у 23.000 чал., больш, чым на 50 проц. у адносінах да агульнага ліку рабочых, якія ёсьць зараз. Шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва толькі на добраахвотных пачатках зьяўляецца лепшым адказам на паклёп Пуанкарэ. Год таму назад на нашай фабрыцы была вызначана норма па зімовых польтах—240 адзінак у зьмену, у гэтым годзе норма—315 адзінак, а самі рабочыя, дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву, зараз выпрацоўваюць 400 адзінак.

Наша фабрыка другі год пяцігодкі скончыла з перавыкананьнем прамфінпляну. Праграму ўдарнага кварталу ф-ка перавыконвае. Ёсьць усе магчымасьці сказаць, што выкананьне праграмы ўдарнага кварталу на нашай фабрыцы забясьпечана.

Зараз мы прыступаем да распрацоўкі кантрольных лічбаў на 1931 год па нашай фабрыцы. Мы ўлічым усю максымальную прапускную здольнасьць агрэгатаў ва ўдарным квартале і вызначым больш павышаныя нормы выпрацоўкі, якія-б забясьпечвалі перавыкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

У адказ на вылазкі права-«лявацкага» блёку, які жадае затрымаць тэмпы індустрыялізацыі краіны, я падаў заяву аб уступленьні ў партыю.



Лічбы трэцяга году павялічым

Тав. АВЭРБУХ (фабрыка „Кастрычнік“). Вытворчы стаж—24 г.

Зацьверджаныя кантрольныя лічбы на 1931 год яшчэ раз паказваюць правільнасьць генэральнай лініі партыі. Такіх тэмпаў разьвіцьця ў такой адсталай краіне, як Беларусь, ніколі ня бачылі капіталістычныя краіны.

Што асабліва важна ў кантрольных лічбах, гэта абавязковае выкананьне заданьняў па якасьці прадукцыі. Гэта вельмі неабходна і своечасова, бо якасьць прадукцыі шырокага спажываньня — абутак, запалкі і г. д. — значна пагоршылася. І ў нас на фабрыцы ёсьць яшчэ недахопы ў галіне якасьці прадукцыі. Праўда, за апошні час мы, самі рабочыя, абвясьцілі барацьбу за якасьць прадукцыі. Створаны брыгады па барацьбе за якасьць.

Для выкананьня і перавыкананьня пляну жывёлагадоўлі я прапаную стварыць **рабочы кантроль**, сапраўдны кантроль **і дапамогу прыгарадным гаспадаркам. Трэба ўзяць рабочае шэфства над сьвінымі гаспадаркамі і малочнымі фэрмамі.**

Вялізарнае значэньне мае выдача сродкаў на культурнае, шляхавае будаўніцтва і інш. Усё-ж адпушчаныя 15 млн. руб. на жыльлёвае будаўніцтва пры вялікім росьце рабочае клясы яшчэ не дадуць магчымасьці забясьпечыць патрэбы ў жыльлёвым будаўніцтве. Я лічу, што **трэба больш пашырыць будаўніцтва пры ЖАКТ'ах і ўнутрызаводзкае будаўніцтва.**

Вызначаны плян на 1931 г. рэальны і можа быць выкананы. Гэта можна пацьвердзіць на прыкладзе работы нашай фабрыкі. Па сустрэчным пляне на ўдарны квартал рабочыя значна павялічылі кантрольныя лічбы. На справе мы зараз перакрываем і гэтыя лічбы. **На 1931 год мы мяркуем павялічыць выпрацоўку супроць ударнага кварталу.**

ПЯЦІГОДКУ—ЗА 3½ ГАДЫ

РАБОЧЫЯ ПАПЯРОВЫХ ФАБРЫК, ДАВЯДЗЕЦЕ, ШТО ВЫ ЗДОЛЬНЫ ЗМАГАЦЦА ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ!

Папяровая прамысловасьць БССР за першыя два гады пяцігодкі дасягнула значных посьпехаў. Выпуск прадукцыі папяровых фабрык перавышае папярэдні плян першых двух год пяцігодкі **на 38,3 проц., а картонных фабрык—на 30,4 проц.** Прадукцыйнасьць працы за гэты час **павялічылася на 91,3 проц., замест 27,1 проц.** паводле папярэдняга пляну пяцігодкі. Сярэдняя зарплата за два гады ўзрасла на 16,5 проц. замест 6,9 проц., вызначаных папярэднім плянам. Сабекошт прадукцыі зьніжан на 18,8 проц. замест 9,8 проц.

Гэтыя посьпехі дасягнуты, на падставе генэральнай лініі партыі, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б.

У красавіку бягучага году рабочыя папяровай прамысловасьці БССР у адказ на выкрытае шкодніцтва ў папяровай прамысловасьці і на выклік газэт «За Индустриализацию» і «Зьвязда», урачыста абяцалі ня толькі выканаць прамфінплян, а нават даць краіне дадаткова 4.430 тон паперы і 368 тон картону звыш пляну. Рабочыя сваё абяцаньне выканалі: краіна атрымала звыш пляну **4.586 тон паперы і 485 тон картону і дрэўмасы.** Гэтыя, посьпехі дасягнуты, дзякуючы шырокаму разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва на папяровых фабрыках.

У адпаведнасьці з сустрэчнымі прамфінплянамі фабрык, у 1931 годзе папяровая вытворчасьць павінна ўзрасьці **на 29,9 проц.** 1931 год—рашучы год выкананьня пяцігадовага пляну. Паводле запраектаваных кантрольных лічбаў, да 1-га студзеня 1932 году, г. зн. за тры гады і адзін квартал па папяровай прамысловасьці мы выканаем 95,7 проц. пяцігадовага пляну, а **па картонных фабрыках—89,5 проц.**

Пры мабілізацыі ўвагі ... рабочых калектываў усіх фабрык, ... правядзеньні ў жыцьцё ... рацпрыемстваў, рабочыя ... мысловасьці БССР на ... пяцігодка—за чатыры ... можа быць ажыцьцёў... Аналіз вынікаў ... прамысловасьці ... што **нам**

яшчэ не скарыстаны вялізарныя рэзэрвы. Так, за мінулы год ... значныя прастоі абсталяваньня. ... прастоі былі зьніжаны да норм... фінпляну, папяровыя фабрыкі ... маглі-б дадаткова даць краіне **1.610 тон паперы.**

Адсюль галоўная задача—бязлітасная барацьба з прастоямі, за павялічэньне прадукцыйнасьці. Адным ... выкананьня вялізарная ... ажыцьцяўленьне ... рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і прапаноў рабочых. Цяганіне, якая яшчэ існуе ў гэтых ..., павінен быць пакладзен рашучы канец.

Паказальнікі выкананьня пляну ... кастрычніку ... б'юць трывогу—краіне недадана ... 169 тон паперы. Супроць верасьня вытворчасьць зьменшылася на 632 тоны. ... гэтыя лічбы вымагаюць ад партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый фабрык сапраўды павярнуцца тварам да вытворчасьці, мабілізаваць рабочыя калектывы вакол гаспадарчых задач выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Затрабаваньні культурнай рэвалюцыі вымагаюць ад нас накіраваць усе сілы і веды на хутчэйшае вызваленьне ад залежнасьці замежных паўфабрыкатаў, якімі мы пакуль што прымушаны карыстацца. Наша лясная прамысловасьць павінна даць нам 60.000 тон цэлюлёзы і дрэўнай масы. Скарыстаньне адкідаў і адыходаў дрэваапрацоўчай лесапільнай і ільнапяньковай прамысловасьці адкрывае перад папяровай прамысловасьцю БССР вялікія пэрспэктывы ў сэнсе атрыманьня новых відаў сыр'я. Гэта можа даць нам каля 100.000 тон цэлюлёзы ў год, г. зн. у тры разы больш патрэбнасьці папяровай прамысловасьці БССР у 1931 годзе.

Пры шырокім удзеле рабочых мас, пры дапамозе адданых нам спэцыялістых, рашуча змагаючыся з правымі і «левымі» апартуністымі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы, бязумоўна, вырашым гэтыя задачы.

І. КОФМАН.

У кастрычніцкіх прарывах у прамысловасьці БССР многа вінаваты прафсаюзы

Члены прэзыдыуму ЦСПСБ выкрываюць недахопы прафработы

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры актыўным удзеле пралетарскай грамадзкасьці, ударнікаў дапаможам прафсаюзам БССР перабудавацца ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі пяцігодкі

Старшыня ЦСПСБ тав. **Рыжоў** у сваім дакладзе аб становішчы і чарговых задачах прафруху зусім правільна заявіў, што **асноўным мерылам становішча прафработы зьяўляецца ступень выкананьня прамфінпляну.** Ня будзем гаварыць аб рэзультатах другога году пяцігодкі. **Яны маглі быць лепшымі**, хаця дасягненьні беларускай прамысловасьці за 1929-30 год вельмі вялікія і намячаныя пяцігадовага пляну **перавыкананы.**

Але вось вынікі работы за кастрычнік — першы месяц ударнага кварталу — прымушаюць рэзка ставіць пытаньне аб паляпшэньні прафкіраўніцтва прадпрыемствамі. Мы паведамлялі ўжо, што мэталаапрацоўчая прамысловасьць выканала праграму за кастрычнік на 90 проц., лесапільная — на 75 проц., фанэрная — на 66 проц., папяровая — на 82,8 проц., запалкавая — на 87 проц., швэйная — на 91,5 проц., шкляная — на 90 проц. Паасобныя прадпрыемствы працуюць проста **ганебна**, зьнізіўшы тэмпы нават параўнальна з верасьнем. Напрыклад, завод с.-г. машынабудаўніцтва «Чырвоны мэталісты» ў Віцебску выканаў праграму на 53,6 проц., другі гігант — «Гомсельмаш» — на 76 проц., запалкавая фабрыка «Пралетарская перамога» — на 75,6 проц., запалкавая фабрыка «Дняпро» — на 70,4 проц., швэйная фабрыка імя Валадарскага ў Магілеве — на **34,5 проц.** і г. д. Колькасьць прадпрыемстваў, выканаўшых праграмы, параўнальна з верасьнем, **зьменшылася ў 3-4 разы.** Гэтыя лічбы зьяўляюцца лепшым доказам таго, што прафсаюзы БССР **яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці, яшчэ не даволі ўвагі, сіл і энэргіі аддаюць задачам, якія ставіць перад імі пяцігодка.** Гэты вывад знайшоў поўны адбітак і ў выступленьнях членаў прэзыдыуму па дакладу тав. Рыжова.

Тав. **Шараеў** проста заявіў, што асноўнай прычынай невыкананьня праграм раду магілёўскіх прадпрыемстваў зьяўляецца слабая работа прафсаюзаў, у прыватнасьці гарпрафсавету. **Зусім невытрымальная** ...

... чага запалкавай фабрыкі «Дняпро» ў Рэчыцы аб механізацыі падачы запалак, што з'эканоміла-б 8.000 руб. у год, марынуецца вось ужо 10 месяцаў (выступленьне тав. **Мэзровіча**). На Аршанскім вузьле рад рабочых прапаноў **згублены** (тав. **Вашкевіч**). Рацыяналізацыя вельмі тармозіцца таму, што інжынэрна-тэхнічныя работнікі ня ўцягнуты ў грамадзкую работу, кіраўніцтва прафсаюзаў інжынэрна-тэхнічнымі сэкцыямі адсутнічае. «З вытворчымі нарадамі і вынаходзтвамі, груба кажучы, амба» (тав. **Дамброўскі** — старшыня Белкамітэту саюзу мэталістых). Палітэхнізацыя ня сустрэла падтрыманьня прафсаюзаў (доктар **Марзон**).

Вельмі многа ўвагі ў спрэчках аддалі члены пленуму перабудове культработы. І ў гэтым пытаньні ўсе зышліся на адным, што культработа па большасьці прадпрыемстваў **зусім ня ўвязана з вытворчасьцю.** Уся культработа заключаецца ў вывешваньні лёзунгаў. Прычым часта бывае, што лёзунг «Няхай жыве 1 мая» вісіць круглы год (тав. **Шараеў**). Але некаторыя кіраўнікі лічаць і лёзунгі лішняй раскошай. Так, дырэктар швэйнай фабрыкі ў Віцебску забараніў вывешваць лёзунгі ў цэхах, матывуючы тым, што «лёзунгі адцягваюць увагу рабочых» (тав. **Клімковіч**). Клюбы не вядуць культ-масавай і вытворчай работы. «У Мазыры клюбы абмяжоўваюцца тым, што раз у год выпускаюць на сцэну прафэсыянальную трупу з дапатопнай пастаноўкай, а рэшту часу круцяць кіно». У бібліятэках няма кніг па сацспаборніцтве і ўдарніцтве (тав. **Туманоў**). **Начныя зьмены культурнымі мерапрыемствамі зусім не абслугоўваюцца** (тав. **Дамброўскі**).

Некаторыя члены пленуму (т.т. **Вашкевіч, Пархоменка, Мэзровіч**), лічачы кіраўніцтва культработай слабым, паставілі пытаньне аб рабоце культсэктару ЦСПСБ. Яны лічаць, што цяперашні склад работнікаў культсэктару з работай не спраўляецца і таму патрабуе рашучага абнаўленьня.

Асабліва востра падкрэсьлівалася членамі пленуму слабое кіраўніцтва з боку ЦСПСБ і ЦП саюзаў **райпрафсаветамі і прафработай на раёне.** Апрача скаргаў на цыркулярнічаньне, часамі зусім непатрэбнае, члены пленуму расказалі шмат фактаў ... гастралёрства інструктароў ЦСПСБ і ЦП саюзаў.

Прыяжджаюць на дзьве гадзіны, на дзень, запасаюцца лічбамі, весткамі аб рабоце і... ад'яжджаюць. Ніякай дапамогі, ніякіх практычных указаньняў.

Шматлікасьць гэтых скаргаў гаворыць аб тым, што і з «жывой» сувязьзю **ня ўсё добра.** Адзіны выхад са становішча — пасылаць інструктароў і прадстаўнікоў ЦП з канкрэтнымі плянамі работы на мясцох, **канкрэтнымі заданьнямі**, а па звароце патрабаваць з іх не справаздачы аб знойдзеных памылках і прарывах, а аб тэй практычнай дапамозе, якую яны пасьпелі аказаць райпрафсавету ці фабзаўкому—(т.т. **Дамброўскі, Хэйфэц**).

Многа гаварылася аб буйных недахопах у **падрыхтоўцы прафкадраў.** Няма падручнікаў. Курсантаў адрываюць ад заняткаў на розныя кампаніі. Адносіны прафарганізацый да падрыхтоўкі кадраў — агідныя, дырэктывы ня выконваюцца.

Ацэнка прафработы, даная «Трудом» і «Зьвяздой», сустрэла поўнае ўхваленьне ў выступленьнях раду членаў пленуму (з запісаных 41 выказалася 34 чалавекі). Усе згадзіліся з тым, што прафсаюзнае кіраўніцтва і апараты патрабуюць моцнага асьвяжэньня.

Старшыня ЦСПСБ тав. **Рыжоў** у заключным слове заявіў, што лічыць выступленьні і крытыку членаў пленуму **правільнымі.** Таксама правільны скаргі на паперовае кіраўніцтва і гастралёрства. **Усе факты гастралёрства будуць неадкладна расьсьледваны.**

— Спрэчкі, — заявіў тав. Рыжоў, — паказалі, што ў беларускіх прафсаюзах ёсьць яшчэ шмат апартуністычных адрыжак, што некаторыя прафработнікі плятуцца ў хвасьце адсталых груп рабочых, некаторыя заражаны ўпадніцкімі настроямі. Жорсткі агонь па правым апартунізьме, недахопы — пад рашучы абстрэл. Праверыць свае рады. На месца няздольных пасадзіць ударнікаў. Не адставаць ад актыўнасьці рабочых мас, стаць на чале іх. **Працаваць так, як працуюць сапраўдныя ўдарнікі.**

Пленум аднагалосна прызнаў палітычную лінію ў рабоце ЦСПСБ у асноўным правільнай і выбраў камісію для вырацоўкі практычнай рэзалюцыі.

ПРАЎДЗІН.

У нас і ў „іх“

(Тав. Эл...нд—рабочы-ўдарнік заводу „Энэргія“, вытворчы стаж—20 год)

Я прачытаў надоечы ліст, атрыманы ад рабочага, які працуе на нямецкай фабрыцы «Лямпэншнайдэр». Гэты «невялічкі» ліст дае яскравы малюнак жыцьця замежных рабочых.

Вялікае беспрацоўе, павялічэньне цэн на прадукты першае патрэбы, зьніжэньне заработнае платы — вось сітуацыя нямецкай «вольнай» рэспублікі, — піша мне тав. Рауль Шрабер.

Вось у якіх умовах працуюць замежныя рабочыя. І гэта ў той час, калі, дзякуючы правільнасьці лініі нашай партыі, мы ў Савецкім Саюзе маем вялікія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва. У іх беспрацоўе расьце, у нас беспрацоўя ўжо няма. У іх — зьніжэньне заработнае платы, а ў нас кантрольныя лічбы на 1931 год прадугледжваюць павялічэньне зарплаты рабочых у сярэднім больш, як на 5 проц. У іх рабочыя працуюць 10-12 гадзін, а ў нас на 7-гадзінны рабочы дзень павінны перайсьці ў 1931 годзе 95 проц. усіх рабочых.

Назад — ні кроку! Яшчэ больш змагацца за выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну ўдарнага кварталу — вось наша чарговая задача.

На барацьбу за якасьць прадукцыі

(Работніцы шчотачнай фабрыкі — т. т. Гольдбэрг, Канцістор, Казлоўская, Шмулевіч — вытворчы стаж — 10-25 год)

Мы прапануем зьнізіць сабекошт па рэспубліканскай прамысловасьці замест 10 проц. на 12 проц. З свайго боку мы будзем весьці рашучую барацьбу за якасьць прадукцыі.

Лічбу ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы (30,4 проц.) трэба, на нашу думку, павялічыць да 33 проц., пры ўмове рашучага змаганьня з прагуламі, рвацтвам, лятунствам.

За кошт узьняцьця прадукцыйнасьці працы прапануем павялічыць суму на жыльлёвае будаўніцтва з 15,3 млн. руб. да 16 млн. рублёў і таксама на сацыяльна-бытавое будаўніцтва з 4,4 проц. да 5 проц.

Гэта дасьць магчымасьць палепшыць умовы працы на вытворчасьці і тым самым забясьпечыць поўнае выкананьне кантрольных лічбаў на 1930-31...

Шкоднікам, якія рыхтуюць вайну супроць Савецкага Саюзу, адкажам выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну па ўсіх паказальніках.

Забясьпечым посьпех другой бальшавіцкай вясны!

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Зламаць сабатаж апартуністых, якія прабуюць скараціць плошчу ярвога кліну, кінуць усе сілы на стварэньне насенных фондаў у калгасах

Апартуністыя спалохаліся плянаў

…спрэчна вялікае значэньне своечасовай падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны—будучай веснавой … Прыходзіцца, аднак, канстатаваць, што месяцы яшчэ фактычна зусім … разгарнулі падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі. Наркамзем своечасова (яшчэ 31 кастрычніка) накіраваў у раёны кантрольныя лічбы пашырэньня ярвога кліну ў … годзе. Ня гледзячы на гэта, у … падрыхтоўка да веснавой сяўбы **не разгорнута.**

…трольныя лічбы далей канцылярыі райза не пайшлі. Сельсаветы … аб іх ніякага ўяўленьня. … асноўных прычын такога … зьяўляецца **апартуністычнае** … **ацэнка** своечасовай падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, … што «яшчэ ня скончылася … веснавой сяўбой пасьпеем». … сьці сымптомы, якія пагражаюць зацягнуць пачатак падрыхтоўкі … вельмі напэўны тэрмін. Аб … сьведчыць нездаровая рэакцыя … раёнаў на дырэктыву … аб пашырэньні ярвога … веснавую сяўбу на 17 проц. Замест неадкладнай распрацоўкі дырэктывы і канкрэтных прапаноў … даданьняў сельсаветам, райза … з НКЗ, усякім спосабам … давесьці «немагчымасьць … гэтай дырэктывы».

…рыя райза праяўляюць махровы апартунізм на практыцы, патрабуючы зьніжэньня заданьня па пашырэньні ярвога кліну, ня маючы … ніякай магчымасьці высунуць … …ія-б заслугоўвалі хоць ня… …агі.

…ць раёнаў, якія спрачаюцца, у сваіх довадах грунтуюцца … што «даныя ЦСУ вельмі непэўныя» і г. д. Праверка гэтых … выявіла іх беспадстаўнасьць. … факты ярка сьведчаць аб … асобныя раёны заражаны … чнай тэмпабоязьню. Клі… раёну, напрыклад, заданьне … у 18.000 гектараў. Раён … супярэчыць супроць гэ… і прымае памер ярвога … у 13.000 га, ні на адзін … Пасьля дакладнага і … абмеркаваньня скаргі … райза, плянава-эканаміч… НКЗ БССР прызнаў да вы… заданьне Клічаўскаму раёну … магчыма павялічыць да … гектараў.

…кі раён атрымаў заданьне … гектараў. Адная раён згодзен … на … 38.900 га. Між тым, … паказаў, што весткі ЦСУ …скім раёне значна пера… Есьць поўная магчымасьць … заданьне Рагачоўскаму … 48.000 гектараў.

…кі раён скарачае заданьне … ярвым кліне на 12.700 гектараў. … бакавы разгляд скаргі рай… … ее поўную няўгрунтаванасьць і беспадстаўнасьць. Заданьне … ому раёну зьяўляецца зусім … і такія факты не зьяўляюцца выключэньнем. Капыльскі раён … заданьне НКЗ на 10.600 га, … 8.200 га, Талачынскі— … га, Крупскі—на 7.000, Віцебскі—на 7.000 і г. д. Што гэта, як не апартунізм на практыцы, як не ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду аб змаганьні за пашырэньне пасеўнага кліну. Апартуністычная практыка гэтых раёнаў выкрываецца перадавымі раёнамі, якія паставілі ў цэнтр сваёй увагі задачу змаганьня за кожны лішні гэктар ярвога кліну. Мы маем цэлы рад такіх дасканалых фактаў, калі некаторыя раёны ў адказ на заданьне НКЗ БССР высунулі свае сустрэчныя павялічаныя пляны пашырэньня ярвога кліну. Напрыклад, Касьцюковіцкаму раёну было дана заданьне—33.500 гэктараў. Райза, абмеркаваўшы гэта пытаньне, павялічыў заданьне да 38.000 га. Дубровенскі раён павялічыў кантрольныя лічбы Наркамзему на 5.000 гэктараў, Рэчыцкі раён сваім сустрэчным плянам пашырэньня ярвога кліну павялічыў кантрольныя лічбы НКЗ на 2.000 га. Гэтыя факты—найлепшы адказ апартуністым, якія спалохаліся плянаў і тэмпаў і панічна енчаць аб «нерэальнасьці» заданьняў.

Трэба яшчэ больш сурова ўдарыць па апартунізьме на практыцы. Мы ні ў якім выпадку ня можам дапусьціць памяншэньня кантрольных лічбаў па пашырэньні ярвога кліну ні на адзін гэктар. Партарганізацыі, даючы бязьлітасны адпор кулацкай агентуры—апартуністым, мабілізуючы масы калгасьнікаў і адзінаасобнікаў на яшчэ больш рашучую барацьбу з кулацтвам, павінны забясьпечыць своечасовую, усебаковую і найшырэйшую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі. Трэба зараз-жа брацца за справу. Ня хныкаць, як гэта робяць пасобныя раённыя работнікі, заражаныя апартунізмам, а з бальшавіцкай настойлівасьцю трэба змагацца за тэмпы, за кожны лішні гэктар ярвога кліну, за арганізацыю сустрэчных плянаў, якія прадугледжваюць ня толькі стопрацэнтнае выкананьне кантрольных лічбаў, але і іх значнае перавышэньне. Падрыхтоўка да веснавой сяўбы павінна быць пачата неадкладна, без усякіх адтэрмінаваньняў. Нельга дапусьціць ніякіх спазьненьняў. Трэба памятаць, што своечасовая падрыхтоўка гарантуе баявое правядзеньне другой бальшавіцкай вясны. **Уся падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі павінна быць падпарадкавана задачы арганізацыі новага калгаснага прыліву, арганізацыі новага ўздыму калгаснага будаўніцтва.**

Вярбоўшчыкі калектывізацыі

ЛЕЗНА. (Наш. кар.). Паасобныя вярбовачныя камісіі, створаныя ў калгасах Лёзьненскага раёну, разгортваюць вялікую работу па арганізацыі калгаснага прыліву. Так, **вярбовачная камісія на чале з калгасьнікам Аляксеевым за два дні завербавала ў свой калгас 17 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.** У калгас «Бязбожнік» за апошні час падана 50 заяў. За апошнюю дэкаду ў раёне арганізаваны адзін новы калгас, у які ўжо ўступіла 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Новыя калгасы

ПОЛАЦАК. (Наш. кар.). Напярэдадні 1-га зьезду калгасьнікаў ў Полацкім раёне пачаўся новы калгасны прыліў. З кожным днём паступаюць усё новыя і новыя заявы адзінаасобнікаў аб прыёме ў калгасы. У паасобных сельсаветах, у сувязі з першым раённым зьездам калгасьнікаў, **створаны новыя с.-г. арцелі.** У Дамнікоўскім сельсавеце арганізаваны калгас імя Карла Маркса, у Васілеўскім сельсавеце — калгас імя Дзям'яна Беднага, у Верхалецкім — «Чырвоны Кастрычнік», Шацілаўскім— «Новыя Гараны». Асабліва моцны прыліў заўважаецца ў Бельскім сельсавеце, дзе ўжо арганізаваны два новыя калгасы — «Чырвоны Маяк» і імя 1 раённага калгаснага зьезду. **Прыліў працягваецца.** Гэтаму спрыяюць значныя посьпехі перадавых старых калгасаў Полацкага раёну (камуны «Чырвоная зорка» і «Чырвоны артылерысты», калгасы «Верны шлях», «Чырвоны шлях», і г. д.), паказаўшых бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні асеньняй с.-г. кампаніі.

У тылу калгаснага прыліву

ВЕТКА. (Наш кар.).

У Веткаўскім раёне калектывізацыя **праходзіць самацёкам.** Раённыя арганізацыі ня сталі на чале змаганьня за новае калгаснае папаўненьне. У раёне ствараюцца ініцыятыўныя групы, у калгасы паступаюць заявы адзінаасобнікаў аб прыёме, а раённыя арганізацыі стаяць у баку ад гэтага руху мас, не праводзяць упартай і сыстэматычнай работы па ўцягненьні заўтрашніх калгасьнікаў у калектывы. У часе асеньняй сяўбы і зябліва арганізаваны тры новыя калгасы. Створаны 4 ініцыятыўныя групы. Усяго ў калгасы раёну за перыяд асеньняй с.-г. кампаніі ўступіла 147 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэтыя вынікі яўна невыстарчальныя і пры адпаведнай рабоце з боку раённых арганізацый маглі быць значна большымі.

Цэлы рад фактаў ярка ілюструюць нездавальняючую работу раённых арганізацый па ўцягненьні новых мас адзінаасобнікаў у калгасы. Зябліва—гэты важнейшы вагар арганізацыі новага калгаснага прыліву—у Веткаўскім раёне амаль зусім ня было выкарыстана для ўцягненьня адзінаасобных бядняцкіх мас у с.-г. арцелі. Плян зябліва ня выкананы. Толькі калгасы «Чырвоны Кастрычнік», «Вэзувій» і «Гаралок» дасягнулі некаторых посьпехаў у выкананьні пляну зябліва. Рэшта калгасаў праваліла заданьне. Кіраўніцтва калгасамі з боку райкалгассаюзу выключна **папярова-бюракратычнае. Веткаўская арганізацыя КП(б)Б павінна рашуча ўдарыць па праваапартуністычнай стаўцы на самацёк і разгарнуць сапраўднае змаганьне за новы калгасны прыліў, даючы руйнуючы ўдар кулаку і яго агентуры—апартуністым.**

Калгас „Ільліч"—у авангардзе

БРАГІН. (Наш. кар.).

Ня гледзячы на шалёнае супраціўленьне кулацтва, калгас «Ільліч», Брагінскага раёну, з посьпехам справіўся з асеньняй с.-г. кампаніяй. Дзякуючы выразнай арганізацыі працы, усе палявыя работы, зьвязаныя з асеньнім перыядам, у калгасе былі своечасова выкананы. Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, калгасьнікі паказалі высокія тэмпы работы. Так брыгада калгасьніц, на ўборцы льну, павысіўшая прадукцыйнасьць працы на 100 проц. Ня дзіва, што ў калгас паступаюць заявы аб прыёме. У Кастрычніцкія дні ў калгасе пачаўся прыліў імя XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ужо ўступіла 9 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. За кароткі тэрмін свайго існаваньня калгас «Ільліч» вырас на 200 проц. Гэта—рэзультат баявых тэмпаў і ўдарнай работы калгасьнікаў па будаўніцтве сваёй калектыўнай гаспадаркі.

Калгас поўнасьцю выканаў свае абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай. Плян загатовак па ўсіх культурах выкананы. Звыш пляну калгас здае некалькі тон збожжавых культур.

У XIII гадавіну Кастрычніка калгас наладзіў урачысты сход, на які запрасіў суседзяў адзінаасобнікаў. На сходзе калгасьнікі азнаёмілі адзінаасобнікаў з вынікамі калектыўнае працы і парадкам разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў. Факты і лічбы, з якімі выступілі калгасьнікі на сходзе, былі найлепшымі перакануючымі агітатарамі за калектывізацыю. Тут-жа на сходзе ў калгас **уступіла 20 новых адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.**

Насенфонды стварыць у тэрмін

На мясцох калгасы яшчэ **не прыступілі** да стварэньня насенных фондаў. Наяўныя весткі сьведчаць аб тым, што амаль ні ў адным раёне дырэктыва па гэтым пытаньні яшчэ **ня выконваецца.** Між іншым, Калгасцэнтр БССР абсалютна нічога **ня ведае** аб сапраўдным становішчы стварэньня насенных фондаў.

Як паведамляюць работнікі, бытыя ў раёнах у новых калгасах, якія арганізаваны ў часе асеньняй сяўбы, насенныя фонды яшчэ не засыпаны, нічога рэальнага ў гэтым напрамку **ня зроблена.**

Вялікую небясьпеку выклікае сыўнасьць калгаснай сыстэмы ў стварэньні насенных фондаў з дэфіцытных культур. Цяпер, без стварэньня належных насенных фондаў, немагчыма павялічыць удзельную вагу тэхнічных і кармавых культур. У 1931 годзе прадугледжваецца значнае пашырэньне тэхнічных і кармавых культур. Вось некалькі характэрных лічбаў. У 1931 годзе ільну павінна быць засеяна 10,1 проц. ярвога кліну замест 5,9 проц. у 1930 годзе. Коранеплодаў павінна быць засеяна 3,4 проц. замест 1,6 проц. у мінулым годзе, канапель—1,5 проц замест 0,7 проц. У сьвятле гэтых лічбаў зусім відавочна вялізарнае значэньне своечасовай і насьпяховай засыпкі адпаведных насенных фондаў.

Круты і прытым неадкладны пералом навінен быць зараз-жа дасягнуты. Раённыя арганізацыі павінны неразлучыцца на баявыя тэмпы змаганьня за стварэньне насенных фондаў. Трэба паклясьці канец бязьдзейнасьці і нядбайнасьці на гэтым адказным вучастку і разгарнуць найшырэйшую работу па стварэньні насенных **фондаў. Кулацтва прабуе сарваць** кампанію засыпкі насенных фондаў, шалёна агітуючы супроць гэтага мерапрыемства. Кулацтву павінен быць даны бязьлітасны і руйнуючы адпор. Трэба жорстка біць па ўсякіх праявах апартуністычнай недаацэнкі задачы стварэньня насенных фондаў у калгасах. **Гэта баявая гаспадарча-палітычная кампанія павінна быць праведзена па-баявому.**

Ідзеце да новых перамог

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.).

Калгас імя Будзённага, Увараўскага раёну, паказаў сапраўды ўдарныя тэмпы ў баёх за асеньнюю сяўбу і зябліва. **Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і выразная арганізацыя працы забясьпечылі калгасу перамогу.** Пляны асеньняй пасеўнай кампаніі ня толькі выкананы, але і перавышаны. Заданьне па асеньняй сяўбе выканана на **127 проц.**, плян зябліва перавышаны на **50 проц.** Ворыва скончана на 4 дні раней тэрміну, вызначанага ў пляне. Скончыўшы зябліва, калгас імя Будзённага ўзяў на грамадзкі буксір калгас «Калінін», які не спраўляўся з асеньняй с.-г. кампаніяй. На працягу некалькіх дзён калгасьнікі - будзёнаўцы лік[illegible] адавалі ў калгасе «Калінін» прарывы. Зараз калгасьнікі б'юцца за арганізацыю новага калгаснага прыліву. Зусім зразумела, што гэта работа праходзіць без цэлага раду недахопаў і труднасьцяў, але калгасьнікаў гэта не палохае. Яны ўпарта агітуюць суседзяў адзінаасобнікаў, уцягваючы іх у калектыў.

Пад кіраўніцтвам партыйца т. Кабаева, калгасьнікі арганізавалі групу вярбоўшчыкаў, якая праводзіла работу на падрыхтоўцы прыліву імя XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Вярбоўшчыкі праводзілі сходы адзінаасобнікаў у бліжэйшых вёсках па пытаньнях калектывізацыі. Вынікі ў наяўнасьці. У калгас уступіла 20 новых адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Варта адзначыць актыўную работу калгасьнікаў - вярбоўшчыкаў калектывізацыі т. т. **Мартыненка Сапрона, Шарыкава Сьцяпана, Грушчанкі, Кавалёва, Карпачова** і інш., якія з дня на дзень праводзяць сыстэматычную работу сярод адзінаасобнікаў па ўцягненьні іх у калгас. За апошнія два тыдні колькасьць членаў с.-г. арцелі імя Будзённага павялічылася амаль у тры разы.

Е. С.



…інградзкі …арны завод …а мэханічны цэх



Посьпехі Койданаўскай МТС забясьпечылі магутны прыцёк адзінаасобнікаў у калектывы

КОЙДАНАВА. (Па тэлефону).

Посьпехі Койданаўскай МТС у правядзеньні асеньняй с.-г. кампаніі выклікалі новую магутную хвалю калгаснага прыліву. У калгасы, якія знаходзяцца на тэрыторыі машына-трактарнай станцыі, паступілі шматлікія заявы аб прыёме з боку адзінаасобнікаў—бядняцкоў і серадняцкоў. Баявыя тэмпы МТС у правядзеньні асеньняй сяўбы і зябліва забясьпечылі арганізацыю новых калгасаў. У перыяд сяўбы і зябліва на тэрыторыі МТС арганізавана 17 новых калгасаў, у якія ўвайшло 275 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У старыя калгасы раёну ўступіла 175 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Процант калектывізацыі значна ўзьняўся. Да асеньняй сяўбы Койданаўскі раён быў калектывізаваны на 17,3 проц., а зараз сацыялістычны сэктар займае 31 проц. агульнай зямельнай плошчы раёну. Прыліў ня спыняецца і працягваецца з новай сілай. Нарэйкаўскі, Байдацкі, Ляхоўскі і іншыя сельсаветы, дзякуючы машына-трактарнай станцыі, на сёньняшні дзень калектывізаваны на 40-50 проц.

ЗЕМЧАСТКА РВК.
ДЫРЭКЦЫЯ МТС.

213 гаспадарак—новае калгаснае папаўненьне

КАМАРЫН. (Па тэлеграфу). Камарынская партарганізацыя, узмацняючы бязьлітаснае змаганьне за лінію партыі супроць права-«лявацкага» блёку, згуртоўваючы калгасьнікаў і адзінаасобныя бядняцка-серадняцкія масы на адпор кулаку, дабілася магутнага прыліву ў калгасы. З 10 па 18 лістапада ў Крукаўскім сельсавеце, Камарынскага раёну, створаны 3 новыя калгасы, у якія ўступілі 213 гаспадарак.

Сакратар РК КП(б)Б ІГНАТОВІЧ.

Давядзем да мас маршруты культэстафэты

Асіпавіцкі штаб ня стаў на чале ініцыятывы мас, сваёй апартуністычнай недаацэнкай культбудаўніцтва—стаўкай на самацёк—сарваў выкананьне важнейшых задач партыі

Ударыць па апартуністычнай недаацэнцы культбудаўніцтва

Усебеларускі штаб культэстафэты, заслухаўшы даклад асіпавіцкага райштабу, канстатаваў, што працоўная маса Асіпавіцкага раёну да гэтага часу не мабілізавана на выкананьне маршрутаў культэстафэты. Толькі гэтым можна вытлумачыць, што патрэбнага зруху ў ліквідацыі прарываў у галіне культурнага будаўніцтва ўсё яшчэ няма.

Усебеларускі штаб работу асіпавіцкага райштабу прызнаў нездавальняючай і абвясьціў райштабу вымову за нядбайныя адносіны да выкананьня дырэктыў па мабілізацыі мас на выкананьне маршруту культэстафэты.

Райштабу катэгарычна запрапанавана прыняць захады да стварэньня карэннага пералому ў рабоце па культэстафэце, скарыстаўшы яе, як лепшы і магутны сродак па мабілізацыі працоўных мас на ліквідацыю прарываў у галіне культурнага будаўніцтва. Ня гледзячы на рад катэгарычных прапаноў, у Асіпавіцкім, як і ў шмат іншых раёнах, далёка няпоўнасьцю ахоплены дзеці, якія павінны праўсьці ўсеагульнае навучаньне. У сувязі з гэтым усебеларускі штаб прапанаваў правесьці шырокую праверку наведваньня дзецьмі школ і разгарнуць растлумачальную работу сярод насельніцтва аб неабходнасьці пасылкі дзяцей у школы, ужываючы пры гэтым да асоб, якія зрываюць усеагульнае навучаньне, адпаведныя меры адміністрацыйнага ўплыву.

У раёне далёка ня ўсе школы забясьпечаны патрэбнымі памяшканьнямі, не скончаны рамонт і абсталяваньне школ. Штаб прапанаваў у тэрміновым парадку забясьпечыць усе школы адпаведнымі памяшканьнямі.

Дырэктывы партыі і ўраду аб забесьпячэньні настаўніцтва прамтаварамі і прадуктамі па нормах для рабочых у раёне кааперацыяй ня выконваюцца. Дзеці бедняты ў большасьці не забясьпечаны вопраткай, абуткам, гарачымі сьнеданьнямі, сшыткамі і падручнікамі. Штаб паказаў на неабходнасьць прыцягненьня да суровай адказнасьці асоб, якія перашкаджаюць і зрываюць выкананьне дырэктыў партыі па гэтым пытаньні і запрапанаваў, пры дапамозе грамадзкасьці, забясьпечыць дзяцей бедняты ўсім неабходным. Спажывецкая кааперацыя павінна без усякіх агаворак выканаць дырэктыву ўраду аб забесьпячэньні вясковага настаўніцтва прамтаварамі і прадуктамі харчаваньня.

У раёне ў тэрміновым парадку павінна быць праведзена мабілізацыя для работы ў лікпунктах усіх працоўных, якія маюць адпаведную пэдагагічную або агульную асьвету.

Выходзячы з таго, што пытаньні палітэхнізацыі школы не знайшлі свайго канкрэтнага вырашэньня ў раёне, штаб катэгарычна прапанаваў тэрмінова скончыць работу па прымацаваньні школ да прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў. Райінспэктарыят народнай асьветы, мясцком саюзу і адпаведныя грамадзкія арганізацыі павінны разгарнуць работу па арганізацыі гурткоў па перападрыхтоўцы настаўніцтва ў сувязі з палітэхнізацыяй.

Пакуль што раённы штаб, партыйныя і камсамольскія арганізацыі не разгарнулі работы па агляду становішча пардамоў, хат-чытальнень і інш. культасьветных устаноў над кутом пераўтварэньня апошніх у сапраўдныя цэнтры камуністычнага выхаваньня працоўных мас.

Павінна быць максымальна ўзмоцнена работа па вярбоўцы культармейцаў з батракоў, калгасьнікаў, беднякоў і серадняков, а таксама з працоўнай інтэлігенцыі.

Усебеларускі штаб канстатаваў зусім слабы ўдзел у рабоце па правядзеньні культэстафэты камсамольскай арганізацыі, у сувязі з чым уняў кіраўніцтва перад ЦК ЛКСМБ аб праверцы работы асіпавіцкай арганізацыі ЛКСМ. Штаб адзначыў, што асіпавіцкія прафсаюзныя арганізацыі стаяць у баку ад работы па мабілізацыі мас на выкананьне маршрутаў культэстафэты.

Асіпавіцкі райштаб ня стаў на чале мас у барацьбе за высокія тэмпы культурнага будаўніцтва, па-даляяцку недаацаніў палітычных задач у правядзеньні работы па выкананьні маршрутаў культэстафэты. Тое, што працоўныя масы раёну не мабілізаваны на ліквідацыю прарываў у культурным будаўніцтве, не мабілізаваны на пасьпяховае выкананьне дырэктыў партыі па палітэхнізацыі школы, па правядзеньні ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі непісьменнасьці выразна гаворыць, што райштаб баявую, ударную работу падмяніў апартуністычнай практыкай і ганебнай бязьдзейнасьцю ў гэтым найважнейшым палітычным пытаньні.

Становішча работы ў раёне па правядзеньні культэстафэты выразна сьведчыць аб тым, што шмат якія арганізацыі недаацэньваюць палітычнага значэньня паходу працоўных мас за пралетарскую культуру, недаацэньваюць сутнасьці культэстафэты, як аднаго са сродкаў па мабілізацыі шырокіх пластоў працоўных на ўдзел у культурным будаўніцтве. Мы з усёй катэгарычнасьцю падкрэсьліваем, што за работу па выкананьні маршрутаў культэстафэты ў раёне перад партыяй адказвае ня толькі райштаб, але і партыйныя арганізацыі. Гэта накладае вялізарную адказнасьць на партыйныя арганізацыі за мабілізацыю працоўных мас на барацьбу за высокія тэмпы культурнага будаўніцтва. Партыйныя арганізацыі павінны безадкладна выканаць дырэктывы ЦК аб кіраўніцтве работай па правядзеньні культэстафэты і стаць на чале гэтай важнейшай работы. Трэба рашуча змагацца з апартуністычнай тэорыяй і практыкай, якая зрывае ажыцьцяўленьне важнейшых задач партыі.

В.

У паход за сацыялістычную культуру

Культурнае будаўніцтва — непадзельная частка ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва. Адгэтуль зусім зразумела, што справа культурнае рэвалюцыі зьяўляецца аднэй з важнейшых праблем рэканструкцыйнага перыяду, што барацьба за культурную рэвалюцыю ёсьць барацьба за сацыялізм.

Вось чаму XVI зьезд УсеКП(б) і XIII зьезд КП(б)Б побач з іншымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва ставяць пытаньне культурнае рэвалюцыі, як баявую задачу партыі і рабочае клясы

З мэтаю мабілізацыі мас на ліквідацыю прарываў па ініцыятыве ленінскага камсамолу Беларусі з 25 кастрычніка арганізавана ўсебеларуская культэстафэта. Культэстафэта павінна зьявіцца баявым і магутным сродкам у справе ўзмацненьня тэмпаў і арганізацыі культурнага будаўніцтва на службу сацыялізму, дапамагаючы высоўваньню культурнага фронту ў перадавыя рады сацыялістычнае будоўлі.

Гэтыя баявыя задачы мы можам выканаць і да фінішу культэстафэты — 9 усесаюзнага зьезду ленінскага камсамолу і XI гадавіны існаваньня БССР—выйсьці з патрэбнымі вынікамі. Але для гэтага неабходна, каб кожны рабочы, калгасьнік, бядняк, серадняк і культурны працаўнік арганізавана змагаўся за справу культурнай рэвалюцыі, рашуча выкарчоўваючы ўсе перашкоды на гэтым фронце.

Няхай жыве КП(б)Б — адзіны і сапраўдны кіраўнік культурнага будаўніцтва БССР!

УСЕБЕЛАРУСКІ ШТАБ КУЛЬТЭСТАФЭТЫ.

Плян вялікіх работ трэцяга году

(Канец, пачатак гл. на 3 старонцы)

СНК лічыць патрэбным, каб былі ўжыты адпаведныя захады па давядзеньні ў будучым годзе глыбінь па адпаведных вучастках рэк БССР да норм, прадугледжаных пяцігадовым плянам, а ў перыяд навігацыі воднага транспарту—на ўсім працягу эксплёатаваных і даходных рэк.

У галіне камунальнае гаспадаркі СНК запрапанаваў усім РВК і гарадзкім саветам, пры правядзеньні мерапрыемстваў па дарбрабыце, зьвярнуць асаблівую ўвагу **на паляпшэньне дабрабыту рабочых пасёлкаў і рабочых раёнаў у гарадох, асабліва ў галіне санітарна-гігіенічных прадпрыемстваў** (лазьні, пральні і г. д.).

Мабілізаваць унутраныя рэсурсы

На 1931 год агульны аб'ём фінансавага пляну без аваротных сум, сродкаў агульнасаюзнага бюджэту і саюзных арганізацый **вызначаны ў 727 млн. руб.** У 1930 г. было вызначана 429 млн. Такім чынам, мы маем рост фінансавага пляну на 70 проц.

Плян **сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту** на 1931 год запраектаваны ў суме 57,3 млн. руб. Плян камунальнага крэдыту вызначаны ў 16,7 млн. руб., у тым ліку за конт сродкаў ЦКБанку 15,2 млн. рублёў.

Прырост кароткатэрміновага крэдыту запраектаваны ў 14.240 тыс. руб. Заданьне па назапашаньні ў кааперацыйных сыстэмах Беларусі ўстаноўлена ў 35,6 тыс. руб.

Надаючы **вялікае значэньне выкананьню і перавыкананьню пляну мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў,** СНК БССР даручыў НКФ і ўсім ведамствам і мясцовым органам скласьці канкрэтны плян мерапрыемстваў, якія забясьпечвалі-б **поўную рэалізацыю заданьня па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.** Наркамфіну даручана мець сталы нагляд за ходам выкананьня адпаведных заданьняў па кожнай арганізацыі паасобку і забясьпечыць удзел усёй пралетарскай грамадзкасьці ў справе выкананьня гэтага заданьня.

Кантрольныя лічбы—да кожнага рабочага і калгасьніка

Усе прынятыя Саветам Народных Камісараў БССР капітальныя ўкладаньні, а таксама і памеры фінансаваньня на 1931 год—напярэдадні і арыентовачныя.

Выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва на бліжэйшы год **павінна быць забясьпечана найшырэйшым удзелам у плянавай рабоце ўсёй рабочай клясы і ўсіх працоўных БССР.** Таму ўсім гаспадарчым арганізацыям разам з прафсаюзамі даручана зараз-жа разгарнуць работу па [illegible] гэтых кантрольных лічбаў да рабочых прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасьнікаў, даручана забясьпечыць пры гэтым складаньне сустрэчных прамфінплянаў.

Пры складаньні [illegible] плянаў трэба забясьпечыць адлюстраваньне ў іх сустрэчных прамфінпляна[illegible] рабочых мас, паказаўшы [illegible] дадаткі, унесеныя ў выніку [illegible] на шырокіх сходах рабочых.

…крычаўскага будаўніцтва.

Новікава, Бэйлінсон, Фэйгінзон уступілі ў ударныя брыгады.

Мабілізаваць 55.446.000 р.

ПАТРАБУЕ ФІНПЛЯН УДАРНАГА КВАРТАЛУ

КАНТРОЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ВЫКОНВАЕЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

ПАМЯТАЙЦЕ

„Пленум ЦК КП(б)Б абавязвае цэнтральныя і мясцовыя арганізацыі цалкам і поўнасьцю выканаць установленыя пляны мабілізацыі грашовых сродкаў... гэта работа павінна праводзіцца ўдарнымі тэмпамі і заняць галоўнае месца ў працы ўсіх партыйных арганізацый..."

(З рэзалюцыі Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б

Ударны квартал прад'яўляе самыя сур'ёзныя запатрабаваньні да фінансавага апарату ў галіне ўзмацненьня фінансавай базы сацыялістычнага наступленьня.

На працягу ўдарнага кварталу, паводле заданьня партыі і ўраду, трэба мабілізаваць па ўсіх галінах як добраахвотных, так і абавязковых плацяжоў—55.446.000 руб.

Мабілізацыя сродкаў—адказнае баявое заданьне, якое патрабуе напружаных намаганьняў усёе пралетарскае грамадзкасьці, усіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый.

Як-жа ідзе мабілізацыя сродкаў па БССР? Як выконваюцца кантрольныя лічбы фінансавага пляну ўдарнага кварталу?

Наведзе даных НКФ БССР, **мабілізацыя сродкаў па ўсіх вучастках ідзе нездавальняюча.**

Да 1-га сьнежня павінны быць скончаны кампаніі адзінага с.-г. падатку, самаабкладаньня і збору страхавых плацяжоў.

З 1-га кастрычніка да 15 лістапада **заданьне па с.-г. падатку** выканана толькі на 69.5 проц. — за ўдарны квартал трэба сабраць 5 млн. руб., паступіла 3.475.000 руб.

Па **простых падатках** сабрана 83,7 проц. кантрольнай лічбы.

Вельмі слаба ідзе **збор самаабкладаньня.** Да 1-га сьнежня трэба сабраць 5 млн. руб., пакуль што сабрана 1.386.000, або 27,7 проц. заданьня.

Кантрольная лічба ліквідацыі заляжчанасьці па **3-яй пазыцы індустрыялізацыі і збору ўзносаў па пазыцы «Пяцігодка — за чатыры гады»** прадугледжвае паступленьне на працягу ўдарнага кварталу 5.150.000 руб., паступіла 1.899.000—36,8 проц. кантрольнай лічбы.

Вельмі дрэннае становішча па **ашчаднай сыстэме.** Ашчадкасы ў пачатковай стадыі выканалі заданьне — замест 3.350.000 руб. імі сабрана ўкладаў 200.000 руб., або 5,9 проц.

Зусім нездавальняючае становішча па **каапэрацыйнай сыстэме.**

Спажывецкая каапэрацыя сабрала паёў у размеры 27,5 проц. заданьня; саматужна-прамысловая каапэрацыя — 16.2 проц., жыльлёвая—9,9 проц.; інвалідная—8.8 проц.; паляводчая—3.6 проц.; малочна-жывёлагадоўчая —1.7 проц.: садова-гародная—7,3 проц. Як мы бачым, сельска-гаспадарчая каапэрацыя зрывае выкананьне дырэктыў аб мабілізацыі сродкаў.

Кантрольная лічба звароту пазычак па **сыстэме с.-г. крэдыту** выканана ў размеры 42.7 проц.

Наогул, за час з 1-га кастрычніка па 15 лістапада сабрана **21.343.000 руб., ці 38,5 проц. кантрольнай лічбы.**

Бліжэйшыя задачы—**да 1-га сьнежня скончыць збор сельгаспадатку, страхоўкі і самаабкладаньня; канчаткова ліквідаваць залазьянасьць па 3-яй пазыцы; дабіцца афармленьня і поўнага ўзносу сабраных сум па пазыцы «Пяцігодку—за чатыры гады».**

Самую сур'ёзную ўвагу трэба зьвярнуць на вучастак ашчадных кас. Ашчадны апарат займае адказнае месца ў сыстэме мабілізацыі сродкаў. Заданьне ўраду павінна ім быць поўнасьцю выканана.

І, нарэшце, трэба дабіцца пералому ў мабілізацыі сродкаў па каапэрацыйнай сыстэме. На каапэрацыю ўскладзена баявое заданьне па зборы добраахвотных плацяжоў, каапэрацыйныя арганізацыі павінны забясьпечыць выкананьне кантрольных лічбаў ударнага кварталу.

Пры дапамозе ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, пры належнай увазе арганізацый фінансавы апарат справіцца з даручанай яму адказнай задачай—мабілізаваць 55.446.000 руб. на справу сацыялістычнага будаўніцтва, на справу пераможнага сацыялістычнага наступленьня.

Усебеларуская канфэрэнцыя па хлебапячэньні

Закрылася ўсебеларуская вытворчая канфэрэнцыя па хлебапячэньні. У рабоце яе прымала ўдзел больш за 60 чал., з якіх пераважная частка рабочыя з прадпрыемстваў.

Канфэрэнцыя заслухала даклады аб выкананьні прамфінпляну за 1929-30 год, кантрольных лічбах на 1931 год, аб ходзе месячніка па аглядзе хлебапячэньня і г. д.

У 1931 годзе прадугледжваецца павялічыць валавую прадукцыю па выпечцы хлеба з 90.000 тон да 152.000 тон (павялічэньне на 56,7 проц.). У Менску намечана пабудова хлебазаводу - аўтамата, які будзе выпускаць 100 тон хлеба ў суткі пры наяўнасьці 30 рабочых. Будуць пабудаваны: хлебазавод у Магілеве, 20 пякарань у раёнах, палепшаны гомельскі, магілеўскі і аршанскі хлебазаводы.

З мэтай паляпшэньня якасьці хлеба пры буйных ЦРК арганізуецца бюро якасьці, якія штодзенна будуць сачыць за якасьцю хлеба і за захаваньнем яго ў экспэдыцыях і крамах. Пры кожным прадпрыемстве будзе створан транспарт, уведзены пасады бракераў і арганізаваны лябараторыі.

Нарада адзначыла, што месячнік агляду хлебапячэньня праходзіць слаба. Усебеларускі штаб па аглядзе мала кіруе месячнікам. Сельскі сэктар у агляд зусім ня ўцягнуты. Інструктары Белкаапсаюзу выяжджаюць выключна ў парады. Саўгасы, калгасы і наогул раёны імі не наведваюцца.

Зараз па ўсіх прадпрыемствах праводзяцца справаздачы «трыкутнікаў». На буйных прадпрыемствах вылучаны рабочыя брыгады для ўстанаўленьня пастаяннага кантролю за хлебапячэньнем па прадпрыемствах.

У выніку правядзеньня месячніка хлеб менскага хлебазаводу некалькі палепшыўся, але выпуск стандартнага хлеба пакуль дасягае ўсяго 62 проц. усяе выпечкі. У Магілеве нестандартны хлеб складае 20 проц.

Намечана арганізацыя курсаў для падрыхтоўкі хлебапёкаў на 100 чал. 10 чал. пасланы на курсы дырэктароў у Ленінград. Адкрываюцца курсы вылучэнцаў-пекараў для падрыхтоўкі загадчыкаў пякарань на 30 чал.

Па БССР

Добры пачын ФЗК гомельскіх прадпрыемстваў

ГОМЕЛЬ. Пры ўсіх фабрычна-заводзкіх камітэтах гомельскіх прадпрыемстваў вылучаюцца спэцыяльныя ўпоўнаважаныя па сувязі з рабочымі-25-тысячнікамі. Упоўнаважаныя будуць дапамагаць 25-тысячнікам у рабоце адказамі на розныя запытаньні, абараняць іх інтарэсы на прадпрыемствах і асьвятляць работу на рабочых сходах.

Злачынная безгаспадарчасьць

ПОЛАЦАК. Начальнік работ № 2 Полацкага дарожнага вучастку **Анісімаў** па заданьні Галоўдарбуду закупіў 2.000 рабочых коняй. Гэтыя коні, з прычыны адсутнасьці калёс і збруі, не выкарыстоўваюцца па прызначэньні. Частка іх стаіць у в. Пушча, Алесеўскага сельсавету, частка — у Асьвеі.

Яшчэ вясной г. г. было заказана ленінградзкім заводам 800 калёс, арлоўскім заводам — 1.200 калёс і Магілеўскаму саапрамсаюзу — уся збруя. Аднак, ніводнае з гэтых прадпрыемстваў не выканала поўнасьцю заказаў.

Коні стаяць пад акрытым небам, не забясьпечаны кармамі. Частка коняй падохла.

РСІ і пракуратура павінны заняцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

В. ЖУКАЎ.

60.000 рублёў—на вецер

ГОМЕЛЬ. На рамонт гомельскага кінотэатру імя Калініна патрачана 60.000 руб. Гэтыя грошы фактычна выкінуты на вецер. Рамонт зроблены зусім дрэнна, з недобраякасных матар'ялаў. У выніку **ў будучым будаўнічым сэзоне прыдзецца ўсё перарабіць.**

Ужо праз некалькі дзён пасьля адкрыцьця кіно - тэатру пачалі абвальвацца бальконы. У нармальную эксплёатацыю пусьціць кіно - тэатр —небясьпечна.

Гомельскі Жылсаюз дапусьціў злачынную безгаспадарчасьць і нядбайнасьць пры рамонце кіно-тэатру. Трэба тэрмінова расьсьледаваць гэту справу і прыняць адпаведныя меры.

М. ГРЫГОР'ЕЎ.

МЕНСК

Адкрыцьцё курсаў ахматмладу

З 1-га сьнежня ў Менску пачнуць працаваць 6-цімесячныя курсы ахматмладу па падрыхтоўцы работніц для раённых ясьляў і кансультацый. Курсы разьлічаны на 50 чал.

Нарады-курсы загадчыкаў райземаддзелаў

СНК БССР дазволіў Наркамзему склікаць у другой палове сьнежня нарады-курсы загадчыкаў райземаддзелаў і раінаграномаў.

Назначэньні

СНК БССР назначыў т. **Нахільніцкага** старшынёю падрыхтоўчай камісіі СНК.

Тав. **Вайцэховіч** вызвалены ад абавязкаў члена калегіі Наркамзему. Членам калегіі назначаны т. **Шчарбакоў.**

Перапіс работнікаў асьветы

Улічваючы вялікае палітычнае значэньне, якое набывае зараз склад работнікаў асьветы, СНК прызнаў неабходным правесьці ў БССР 100 проц. перапіс работнікаў асьветы.

Да адказнасьці ўсеагульнага навучаньня

Калегія Наркамасьветы адзначыла, што ў некаторых раёнах БССР ўсеагульнае навучаньне праходзіць зусім нездавальняюча з прычыны нядбайных адносін з боку пасобных раённых арганізацый. Калегія НКА пастанавіла прасіць Нарвыкаму разглядзець у тэрміновым парадку справы аб зрыве ўсеагульнага навучаньня. Апрача таго, калегія пастанавіла ўзбудзіць перад СНК БССР хадайніцтва аб прыцягненьні Лядзянскага РВК да адказнасьці за злачынна-нядбайныя адносіны да ўсеагульнага навучаньня. Інспэктару Нарасьветы Лядзянскага раёну тав. **Бялугіну** абвешчана вымова.

Арганізацыя эстраднай групы артыстых

Галоўмастацтва БССР арганізуе ў Менску першую паказальную эстрадную групу артыстых, якая будзе абслугоўваць рабочыя клюбы, калгасы, саўгасы і інш.

Навіны МЦРК

З 26 лістапада МЦРК будзе адпускаць пайшчыкам па дзіцячых кніжках па 200 грам масла і па 200 грам галяндзкага сыру.

**

З 25-га лістапада МЦРК пачне водпуск крупы пайшчыкам і няпайшчыкам—па 1½ кілё для 1-й катэгорыі і па кілё для 2-й і 3-й катэгорый.

СОНЯ ПІКУС

Трагічная сьмерць вырвала з нашых радоў маладую, 28 год, палаючай адданую справе партыі Соню Пікус.

Соня Пікус прайшла жорсткую школу грамадзянскай вайны і падпольнай работы на тэрыторыі Беларусі.

У перыяд 1919-1920 г. г. Соня Пікус вядзе вельмі адказную работу ў падпольнай арганізацыі ў часе жорсткага тэрору белапольскай акупацыі. У 1919 г. т. Пікус у вельмі цяжкіх умовах пераходзіць фронт для ўстанаўленьня сувязяй з брацкімі арганізацыямі. Пасьля вяртаецца і зноў праводзіць цяжкую падпольную работу, аказваючы вельмі вялікія паслугі ўсёй падпольнай партыйнай арганізацыі. У чэрвені 1920 году Соня Пікус была арыштавана разам з групай таварышоў.

У польскай дэфэнзыве т. Пікус была моцна скатавана, і тут, як і на рабоце, яна праявіла вялікую стойкасьць і вытрымаласьць.

У 1921 годзе Соня Пікус была абменена з польскай турмы, скончыла Сьвярдлоўку і як вельмі здольная да тэарытычнай работы была накіравана ў Інстытут Чырвонай Прафэсуры, які скончыла ў 1929 годзе. Тав. Пікус працавала некаторы час у Менску ў БДУ і апошні час у Аграрным інстытуце. Працуючы як адказная навуковая - дасьледчая работа на аграрным тэарытычным фронце, Соня Пікус праявіла вялікую энэргію і здольнасьць у галіне пастаноўкі новых праблем, у іх распрацоўцы і ў арганізацыйнай рабоце. Соня Пікус належыла да таго ліку камуністых — навуковых работнікаў, што кожны крок сваёй тэарытычнай работы зьвязваюць з самымі актуальнымі палітычнымі заданьнямі партыі.

Будучы ўжо вельмі хворай, Соня Пікус вяла рашучую барацьбу за набліжэньне тэарытычнага фронту да актуальных задач партыі, асабліва ў галіне калектывізацыі.

Але хвароба, якая зьявілася яшчэ ў часе **і ў выніку нечалавечых катаваньняў у польскай дэфэнзыве**, не давала блізучыння весьці работы і прывяла 19-XI да трагічнай сьмерці.

Партыя ў асобе Соні Пікус страціла бязмоўна адданага бальшавіка і добрага, энэргічнага і здольнага навуковага работніка — эканамістага - аграрніка.

Сякерская, Югаў, Поташ, Сэрбэнта, Лур'е.

— **Фрунзэнскі РК КП(б)Б** паведамляе, што дакладчыкамі па распрацоўцы ІІ кастр. пленуму ЦК КП(б)Б для камсамольскіх ячэек і калектываў вылучаюцца наступныя т. т.: зав. «Камунар» — Дубавіцкі (СНК), зав. «Дрэвапрац.» — Папоў («Зьвязда»), друк. імя Сталіна — Гольбрайс (НКА), працасьветы — Белашэўскі (ЦК КП(б)Б), Эльвод — Міралгоф (НКГ), ф-ка «Кастрычнік» — Вяржбаловіч («Зьвязда»), саюз мэталістых — Літвіновіч (дырэкт. гумтрэсту), «Чырв. Тэкстыльшчык» — Пабітка (ГарІНА), ф-ка «8 сакавіка» — Кацнэльсон (Дзяржпляні), ф-ка «Беларуска» — Ляскоўскі (СНК). Сакратары камсамольскіх калектываў павінны паведаміць дакладчыкаў аб месцы і тэрміне правядзеньня сходу.

— **Раённы савет ваяўнічых бязбожнікаў Фрунз. раёну** паведамляе, што ўсе ячэйкі СВБ павінны па справах бязбожнай работы зварачацца ў райсавет (Дом Камасьветы, уваход з вул. Энгельса) да т. Гурвіча штодзенна ад 11 да 18 гадз.

— **БАН.** 23-XI, у 18 гадз., у пак. 6 БАН—пасяджэньне асьпірант. сэмінару па мэталалёгіі.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае на 24 лістапада, у 18 гадз., у памяшк. РК КП(б)Б (вул. К. Маркса № 3) нараду фракцый ЖАКТ'аў сумесна з БЖС, з наступным парадкам дня: 1) Даклады сакратароў фракцый ЖАКТ'аў аб зборы паёў. 2) Даклады фракцый ЖАКТ'аў № 7 і пас. «Камінтэрн» аб становішчы культмасавай работы ў ЖАКТ'ах. 3) Падрыхтоўка да перавыбараў гарсавету (дакл. прадстаўн. БЖС). Адказнасьць за поўную і своечасовую яўку ўсіх членаў фракцый ЖАКТ'аў і членаў культмасавай работы ЖАКТ'ах (партыйцаў) ускладаецца на сакратароў фракцый ЖАКТ'аў.

— **БАН.** Тэрмін рэгістрацыі асьпірантаў прадоўжан да 25 лістапада. Асьпіранты, якія не перарэгіструюцца, будуць пазбаўлены пэнсіі.

— **Да ведама беспрацоўных членаў саюзу хамікаў.** З 20 па 30 лістапада ў ЦП саюзу праводзіцца перарэгістрацыя беспрацоўных членаў саюзу хамікаў. На перарэгістрацыю зьяўляцца абавязкова з членскім саюзным білетам і вучотнай карткай біржы працы. Беспрацоўныя, якія не перарэгіструюцца, будуць механічна зьняты з вучоту.

Папраўка

У № 271 «Зьвязды» ад 21 лістапада на трэцяй старонцы ў шапцы па тэхнічным недаглядзе дапушчана памылка, а іменна—напісана «фашысцкі імпэрыялізм рыхтуе ваенную інтэрвэнцыю супроць СССР», а трэба чытаць—«французскі імпэрыялізм рыхтуе».

У рэзалюцыі пленуму ЦКК («Зьвязда» № 270) дапушчана грубая памылка. Надрукавана «акадэмічная блёкада», а трэба чытаць «эканамічная блёкада».

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдактар 10-74, Сакратар 6-19, Партсэктар 13-80, Сэкт. р інфармацыі 13-80; Начны рэдактар 6-42, Галоўная кантора 7-31, Аддзел падпіскі 7-81, абвестак 7-31.

Умовы падпіскі (з дармовым дадаткам „Прафрух"): На 1 мес. — 90 к., 3 мес. — 2 р. 60 к., 6 мес. — 5 р., 12 мес. — 9 р. 75 к.

Плата за абвесткі: За радок ноип. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—зьніжка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бяруцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА", Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

СПЭКУЛЯНТЫ ДЭФІЦЫТНЫМІ ТАВАРАМІ

15 лістапада Вярхоўны суд БССР пачаў разгляд справы былых работнікаў і пайшчыкаў МЦРК, якія падраблялі наборныя кніжкі і спэкулявалі дэфіцытнымі таварамі. **На лаўцы падсудных 28 чалавек.**

Супрацоўнікі стала пайшчыкаў **Жыкарэвіч, Каліцкая і Гняцько** выдавалі работнікам ЦРК **Рапапорту, Фрыдлянду і Рабушка** наборныя кніжкі, на якіх апошнія атрымлівалі дэфіцытныя тавары і прадавалі іх на рынку. Потым гэтыя зьдзелкі «адзначаліся» папойкамі ў шынкара Вігдорчыка.

Камсамольцы **Трацьцякоў і Майсеенка** трапілі на менскія курсы радыёманцёраў. Пры паступленьні яны атрымалі часовыя карткі на прадукты харчаваньня. Праз некаторы час яны сталі пайшчыкамі МЦРК і, не вярнуўшы часовых картак, атрымалі новыя кніжкі. Такім чынам Трацьцякоў і Майсеенка атрымлівалі падвойныя нормы прадуктаў. 2 верасьня Майсеенка заявіў у стол пайшчыкаў аб згубе сваёй наборнай кніжкі. Яму выдалі новую, і Майсеенка атрымліваў тавары ўжо на трох картках.

Рабочыя былога працкалектыву друкароў **Альпяровіч, Шустэр, Штэйнман і Мацкевіч** кралі з друкарні наборныя кніжкі і атрымлівалі на іх дэфіцытныя тавары.

На Ніжнім рынку міліцыя затрымала гр. **Кудзерскую,** якая прадавала атрыманыя ў МЦРК дзьве пары балетак па 20 руб. за пару.

Чорнарабочы ліцейнага цэху заводу «Энэргія»—**Герман** уцёрся ў давер'е рабочых і быў выбран цэхавым каапупоўнаважаным. Скарыстоўваючы сваё становішча, Герман сыстэматычна прысвойваў талёны па дэфіцытныя тавары, якія ён атрымліваў для рабочых. Прадаваць тавары яму дапамагалі субутэльнікі **Губінскі, Мецік і браты Мельнікавы.** Пры вобыску ў Германа знайшлі закапаныя ў зямлю 361 талён. Вялікую колькасьць талёнаў ён прадаў і прапіў.

Былы работнік Усебеларускай с.-г. выстаўкі **Ніціцін** падрабіў мандат кааупаўнаважанага МЦРК і атрымліваў па ім талёны. Апрача таго, ён прысвоіў 73 сэзонныя наборныя кніжкі. Між іншым, гэтыя-ж Ніціцін сістэматычна краў з выстаўкі экспанаты, грошы з касы і інш.

Былы кладаўшчык пабудовы дому ваенведу у Тучынцы—**Яворскі**—прысвоіў лімат сэзонных наборных кніжак. Пры вобыску ў яго знойдзена 37 пачак махоркі, 62 пачкі папярос і інш. прадукты, якія ён атрымаў на гэтых кніжках.

*

Увесь гэты «букет» спэкулянтаў дэфіцытнымі таварамі зараз на лаўцы падсудных. Справа працягнецца 5-6 дзён.

Ц.

Паведамленьні

— Сеньня, 22 лістапада, у 6 гадз. вечару, у памяшканьні аргтрупы ЦКК склікаецца **шырокая нарада працаўнікоў рэдакцый цэнтральных, шматтыражных і насьценных газэт па пытаньні:** 1) Вынікі ўсебеларускага рабсельнкораўскага рэйду аб рэагаваньні на рабсэлькораўскія заметкі. 2) Удзел цэнтральнага і нізавога друку ў абсьледаваньні становішча вылучэнства па БССР. Запрашаюцца рабкоры і юнкоры г. Менску. **ЦКК.**

СЕНЬНЯ:

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз.—вечар, прысьвечаны «дэкадзе абароны». Даклад т. Васілевіча: «Дэкада абароны і задачы партыі». Білеты дзя парт. і камсам. актыву па РК і ў чыт. дому.

— У 18 гадз., у Доме Камасьветы (уваход з вул. Энгельса)—1-шы пленум нанава выбранага савету ваяўнічых бязбожнікаў Фрунз. раёну.

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—сходы дашкольнай і школьнай цэк'ячэек. Яўка абавязкова.

— **БАН.** У 10 гадз. ран., у пак. 36 БАН—пасяджэньне асьпірант. сэмінару па дыялект. матэрыялізме.

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз.—сход грамадазнаўцаў і географаў. У 20 гадз. — сход выкладчыкаў маляваньня. У 19 гадз.—сход настаўнікаў 4-х груп.

— **Групком № 10 працасьветы.** У 19 гадз., у памяшк. 8 школы (Энгельса № 8)— агульны сход членаў 10 групкому саюзу працасьветы (настаўн. вяч. школ).

— **Пракуратура рэспублікі** 24 лістапада, у 19 гадз. склікае нараду па пытаньні аб ходзе будаўніцтва і падрыхтоўцы да 1931 г. У парадку дня—даклады Будаб'яднаньня, Калгасбуду, Белжылсаюзу і Беллартрансу.

— **Кастрычн. РК МОПР'у.** 24 лістапада ў 18 гадз. у памяшк. РК КП(б)Б склікаецца фракцыя нанава выбранага РК МОПР'у, у 19 з пал. гадз. склікаецца пленум РК.

ЦК ЛКСМБ, рэдакцыя беларускай старонкі «Камсамольская Праўда» і ЦО ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена»

Сёньня, 22 лістапада а 12-ай гадзіне дня ў памяшканьні Дзяржпляну (Заля пасяджэньняў)

склікаюць нараду па шырокай распрацоўцы плянаў канкрэтных дзеяньняў беларускага камсамолу

НА НАРАДУ ЗАПРАШАЮЦЦА:

Дзяржплян (т. Гольцтэйн і зводна-плянавае бюро), ВСНГБ (член прэзыдыуму і зводна-плянавае бюро), Наркамзем—(намесьнік наркома, сэктар мэліярацый, плянава-эканаміч. сэктар), Мэліятрэст (прадстаўнік), Лёсбел (прадстаўнік), Белторф—(прадстаўнік), Белкалгасцэнтр (прадстаўнік), Жывёлаводсаюз—(прадстаўнік), Свінаводтрэст—(прадстаўнік), Ільнапянькоўага аб'яднаньня-(прадстаўнік), НДІ імя Леніна—(прадстаўнік), Інстытуту Прамысл. (прадстаўнік), Балотная станцыя—(прадстаўнік), Вопытна-сьвінаводч. станцыя—(прадстаўнік), інгасп. БДУ—(дэкан), сакратары камсамольскіх ячэек: ВСНГБ, Дзяржплян, і Інгасп. БДУ і камсамольцы-асьпіранты

ЦК ЛКСМБ,
РЭД. БЕЛ. СТАР. «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА»
ЦО ЛКСМБ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА».

---

24 лістапада, у 6 гадз. веч., у клюбе САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

ЦКК-НК РСІ СКЛІКАЕ НАРАДУ

кіраўнікоў, сакратароў партыйных і камсамольскіх ячэек, старшынь МК і рабкораў усіх цэнтральных і гарадзкіх савецкіх, гаспадарчых і каапэрацыйна-гандлёвых устаноў

на пытаньні:

„Работа і задачы савецкага апарату" (дакл. тав. КАЛНІН).

Запрашаецца партыйна-прафэсыянальны актыў гэтых устаноў.

ЦКК-НК РСІ.

III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД МОПР'у

склікаецца 25 лістапада г. г.

ПАРАДАК ДНЯ ЗЬЕЗДУ:

1) Даклад ЦК МОПР'у СССР.
2) Справаздача ЦК МОПР'у БССР і рэвізійнай камісіі.
3) Вынікі ўдзелу мопр-арганізацый БССР у сацыялістычным будаўніцтве і далейшыя задачы.
4) Выбары ЦК, рэвізійнай камісіі і дэлегатаў на III усесаюзны зьезд МОПР'у.

Адкрыцьцё зьезду 25 лістапада ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні клюбу гарсавету (пл. Волі).

Фракцыя зьезду там-жа ў 5 гадз. веч.

Дэлегаты з дарадчым голасам не павінны прыяжджаць і не будуць забясьпечаны ні харчаваньнем, ні кватэрамі.

Мандаты выдаюцца ў ЦК МОПР'у з 24 лістапада.

ДА ВЕДАМА ФАБЗАУМЯСЦКОМАЎ

Сеньня, у 4 гадз. дня. у кіно „КУЛЬТУРА" пачынаецца

ПАПЯРЭДНІ ПРОДАЖ БІЛЕТАЎ на карціну „НЯНАВІСЬЦЬ"

Білеты прадаюцца па заяўках толькі арганізаванаму гледачу на поўныя сэансы або калектыўныя прагляды

Усім інш. білеты будуць прадавацца толькі перад сэансам

Слухайце! Слухайце!

26 лістапада, роўна ў 7 гадз. веч.

кіраўніцтва ашчадкасамі БССР сумесна з радыё-цэнтрам арганізуе

Ўсебеларускі РАДЫЁ-МІТЫНГ

па пытаньні **МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА і ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ПА АШЧАДСПРАВЕ.**

На мітынгу выступаць адказныя прадстаўнікі ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, НКФ, кіраўніцтва ашчадкасамі БССР і інш.

Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.

---

22 і 23 лістапада. БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
КАНЦЭРТЫ Канстанціна Ісіевіча **КАВАЛЬСКАГА**
Першага зал стага на тэрменвоксе. Білеты прадаюцца ў тэатры і ў раб. касе.

Гукавое кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — 2-гі тыдзень **ГУКАВАЯ ПРАГРАМА** вытворчасьці Белдзяржкіно. Пачатак сэансаў: 6 гадз., 7 г. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м. Каса ад 4 гадз. дня.

Кіно-тэатр „Культура" — **ЗЯМЛЯ ПРАГНЕ** Звыш праграмы вялікі канцэрт. Пачатак сэансаў дзённых: а 1 гадз. і 2 гадз. 30 м. Увечары: 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса адчынена з 12 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал" — Нямецкі фільм **ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ** (КРЫВАПРЫСЯГА). Пачатак 1 г. а 6 г. Каса ад 4 гадз. 30 м.

Кіно „Пралетары" — Мастацкі фільм **Невядомая асоба** Надзённая п'еса з жыцьця матросаў у 6 частках. Звыш прагр. хроніка „Союзкино" № 54. Пачатак 1 сэансу у 6 гадз. Каса ад 5 гадз.

Кіно „Юны піянэр" — Спартыўны фільм **УДАЛЫ СКОК** камэдыя ў 5 частках. Звыш пр. хроніка „Союзкино" № 61. Пачатак 1 с. у 1 г. дня. Каса ад 12 гадз. дня.

Кіно „Спартак" — З прычыны посьпеху 2-гі тыдзень 1-я сэрыя **НІБЭЛУНГІ** трагедыя у 12 част. Пачатак сэансаў: 6 г. 30 м., 8 г. 45 м., 10 г. 45 м. Каса ад 5 гадз.

Гомельскі агра-пэдагагічны інстытут абвяшчае **ЗІМОВЫ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ** на фізыка-тэхнічнае і хіміка-біялёгічнае аддзяленьні.
Тэрмін прыёму заяў з 20 лістапада да 15 сьнежня, іспыты—з 15 па 26 сьнежня.
Пачатак заняткаў з новым наборам—1 студзеня.
Умовы прыёму раней'шыя.
Заявы без належных дакументаў разглядацца ня будуць.
Дырэктар інстытуту ЕРМАКОЎ.

ЗОА-ВЫСТАЎКА **ЗЬВЯРЫНЕЦ** ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай
адкрыта штодзенна з 8 г. ран. да 11 г. увеч.
ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ: леў, леапард, гіена паласатая, гіена плямістая, ваўкі, мядзьведзі, рысь, мурав'еды, дзікабразы, барсукі, алень. вярблюд. арлы, крамадзіл, 20 малп і шмат іншае зьвяр'ы.
Школам і экскурсіям—ільготная плата, зьніжка 40 проц.
Адміністрацыя.

ПАТРЭБНЫ ВОПЫТНЫЯ КАРЭКТАРЫ, якія добра ведаюць беларускую мову. Зварачацца ў друкарню «Зьвязды», Савецкая, 63.

ШУКАЮ МЕСЦА галоўнага БУХГАЛЬТАРА. Маю салідны стаж вытворч. будаўн., с.-г. бухгальтэрыі з эканамічным ухілам. Прапановы накіроўваць: Менская п.-т. кантора, да запатрабаваньня, прад'яўніку чл. біл. № 9855.

ПАТРЭБНА вопытная МАШЫНІСТКА, якая добра ведае бел. мову. Зварачацца ў рэдакцыю газ. «ЗЬВЯЗДА» (Савецкая, 63, 3-ці паверх)

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакументу 50 к.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту выказвае глыбокі жаль з прычыны трагічнай сьмерці былога навуковага працаўніка ўн-ту

С. ПІКУС.

Група асьпірантаў БДУ выказвае свой глыбокі жаль з прычыны раптоўнай сьмерці лепшага і здальнейшага навуковага працаўніка, выкладчыка ун-ту і дарагога таварыша

ПІКУС С.

Уночы з 4 на 5 лістапада трагічна загінуў пры выкананьні службовых абавязкаў ст. механік Арэскай Будканторы

т. ГУРАЛЬ-ГОРСКІ І. А.,

аб чым з глыбокім жалем калектыў рабочых і служачых паведамляе сваякоў і знаёмых нябожчыка

У панядзелак, 24-га лістапада, у 7 гадз. веч. у клюбе гарсавету (пл. Волі) масавы сэктар ЦСПОБ і менская гарадзкая камісія садзейнасьці

СКЛІКАЮЦЬ

ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ КАМІСІЙ САДЗЕЙНАСЬЦІ ДЗЯРЖКРЭДЫТУ І АШЧАДСПРАВЕ гор. Менску.

У ПАРАДКУ ДНЯ:

«АБ РОЛІ І ЗАДАЧАХ КАМІСІЙ САДЗЕЙНАСЬЦІ Ў СПРАВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ У АСОБНЫМ КВАРТАЛЕ КАСТРЫЧНІК—СЬНЕЖАНЬ 1930 ГОДУ І ГРАМАДЗКІМ КАНТРОЛІ НАД ПРОДАЖАМ І ЗАЛОГАМ АБЛІГАЦЫЙ ДЗЯРЖПАЗЫК.

У сувязку з важнасьцю пытаньня, яўка ўсіх членаў камсодаў абавязкова і без спазьненьня.

ЦСПСБ, Менская гарадзкая камісія садзейнасьці.

ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ па сацспаборніцтве і ўдарніцтве

працаўнікоў каапэрацыйнай групы адчыніцца ў Менску ў памяшканьні клюбу саюзу саўгандальслужачых

25 лістапада, у 6 гадз. веч.

Дэлегатам, якія прыяжджаюць з раёнаў на гэту канфэрэнцыю 24-га лістапада ўвечары і ўночы, неабходна зьявіцца ў памяшканьне клюбу саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай).

Мандаты дэлегатам выдаюцца ў памяшканьні ЦП саюзу 24-XI з 2 да 4 гадз. дня і 25-XI з 11 да 4 гадз. дня.

На канфэрэнцыю запрашаюцца працаўнікі МЦРК, БКС, т-ва «Зямляроб», а таксама прадстаўнікі НК РСІ, НКГандлю, рэдакцый газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Акцябр» і шэфы.

У НЯДЗЕЛЮ, 23 ЛІСТАПАДА,

а 7-й гадз. веч., у Доме Камасьветы адбудзецца

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ Кастрычніцкага райсавету Асоавіяхіму г. Менску.

умесна з партыйнымі, камсамольскімі, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі.

ПРЫСЬВЕЧАНАЕ „ДЭКАДЗЕ АБАРОНЫ"

Пасьля пасяджэньня—вялікая мастацкая частка (канцэрт)

Уваход па білетах разасланых па ячэйках Асоавіяхіму.

На 26-га лістапада, у 6 гадз. веч., у памяшк. НК РСІ (Савецкая, 65) склікаецца

НАРАДА РАЦЫЯНАЛІЗАТАРАЎ

наркаматаў, цэнтральных каапэрацыйных і гаспадарчых арганізацый, а таксама і гарадзкіх устаноў гор. Менску.

Парадак дня: 1) Чарговыя задачы ў галіне рацыяналізацыі. 2) Аб уключэньні ва ўсесаюзны рацыяналізатарскі рахунак.

Яўка рацыяналізатараў абавязкова. **НК РСІ.**

Народны Камісарыят Аховы Здароўя ПРАПАНУЕ ДАКТАРОМ РАЗЬДЗЕРАВАЙ і ОРМАН, якія скончылі стаж па ахматмладу ў кастрычніку м-цы ў г. Менску і накіраваны ў раёны Вульскі і Капыльскі для загадваньня кансультацыяй, але да апошняга часу не зьявіліся на месца працы.

у 3-хдзенны тэрмін выехаць у паказаныя раёны і прыступіць да працы. Раёнам паведаміць аб іх прыезьдзе.

Завочныя бухгальтарскія курсы

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год. Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай не ніжэй 5 гр. 7-годкі

ПЛАТА ЗА КУРС 33 РУБ.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасу:

Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Згубленыя і украдзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Пашп. кн. Дзедзінай Р. Б., выд. Мен. страхкасай, кв. 2919; мэтр. вып., выд. Мен. ЗАГС'ам, чл. біл. саюзу СГЛР Касьцюкевіча Ф. А., кв. 2920-2921; мэтр. вып., выд. Астр.-Гарадз. міліц., кв. на здачу бульбы, выд. Мен. спаж. т-вам «Зямляроб» на імя Яськевіча І. І., кв. 2922-2923; парт. біл. № 1296120 Шамкуць А. С., выд. Мен. АК КП(б)Б, кв. 2924; вайск. кн., выд. Смалявіцк. ваенкам. на імя Балцэвіча Я. А., кв. 2925; вайск. біл., выд. Кіеўск. ваенкам., чл. біл. саюзу мэталістых № 223472 Пекеліс Г. Б., кв. 2926-2927; чл. біл. саюзу друкароў № 00168610 Шэйнфальд Д. Е., кв. 2928; пасьведч. аб сканч. Бабр. 8-гад. настаўн. курс. Сьвістуновай А. В., кв. 2929; вайск. біл. Папковіча Ф. А., выд. Смалявіцк. РВК, кв. 2930; асаб. пасьведч. Доўнар В. С., выд. ДПУ, кв. 2931; асаб. пасьведч. Доўнар Ю. С., выд. ДПУ, кв. 2932; чл. біл. саюзу СГС № 2515 Сабалеўскага П. В., кв. 2933; пасьведч. аб сканч. курсаў ЦПГа Грыпкевіча А. П., кв. 2934; чл. біл. саюзу швэйнікаў № 217579 Кажлан Х. І., кв. 2935; вайск. кн. Бараноўскага А. С., выд. Мен. ваенкам., кв. 2938; вайск. біл., выд. Расонск. РВК, чл. біл. саюзу СГЛР Волбека А. Я., кв. 2939-2940; чл. біл. саюзу працасьветы, вуч. карт., выд. Мен. ваенкам., пасьведч. выд. праўл. ВДУ на імя Хануціна З. М., кв. 2941-2943; пасьведч. № 106 Юзэфовіча З., выд. аб'ядн. «Упіль - зборшчык», кв. 2944; вайск. біл. Герасімчука П. А., выд. Астр.-Гарадз. РВК, кв. 2945; чл. біл. саюзу працасьветы, студ. пасьведч., выд. камвузам Бел. імя Леніна на імя Лебедзева Д. Т., кв. 2946-2947; мэтр. вып., выд. Мен. ЗАГС'ам, даведка аб працы, выд. МЦРК Чэкановіч І. А., кв. 2948-2949; даведка аб выбарч. правах Адуцкевіча А. М., выд. Мен. адмаддз., кв. 2950; пасьведч. № 2286 аб сканч. Горацк. с.-г. ін-ту Ляховіча І. М., кв. 2951; парт. біл. № 612311, выд. Бабр. АК КП(б)Б, чл. біл. саюзу СГС, вайск. біл., выд. Бабр. ваенкам., асаб. пасьведч., выд. Белмэталаб'ядн. на імя Вабіцкага І. М., кв. 2952-2955; чырвонаарм. кн., выд 6 п., камсам. біл. Юрагова С. А., кв. 2956-2957; пашп., выд. Мен. міліц., віза, выд. Заслаўск. пагран атр. Грынкрут В. М., кв. 2958-2959; чл. біл. саюзу чыгуначн. Купрэйчыка П. С., кв. 2960; мэтр. вып. Кансісторума С. А., выд. Мен. ЗАГС'ам, кв. 2961; мэтр. вып. Кансісторума С. А., выд. Мен. ЗАГС'ам, кв. 2962; каап. кн. т-ва «Зямляроб» Маркман З. І., кв. 2963; віза, выд. 16 пагран. атр., вайск. кн., выд. Мен. ваенкам., вуч.-конск. кн., выд. Заслаўск. РВК, каап. кн., выд. Засл. спаж. т-вам на імя Боўбеля К. М., кв. 2966-2968; чл. біл. саюзу працасьветы, чл. кн. касы ўзаемадапам. Ханько І. О., кв. 2969-2970; чл. біл. саюзу СГЛР № 5490 Дзелюль М. К., кв. 2971; асаб. пасьведч. Ханько І. С., выд. 17 шк., кв. 2972; вайск. біл., выд. Менск. ваенкам., асаб. пасьведч., выд. Маск. міліц. чл. біл. саюзу будаўн., Маск. міліц., чл. біл. саюзу будаўн., лек. кн., выд. Маск. страхкасай Ашкіназі П. Н., кв. 2973-2976.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Галоўлітбел 337.